WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 САКАВІКА 2010 г.
АЎТОРАК
№ 38
(26646)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

СЕЛЬГАСАРГАНІЗАЦЫЯМ БЕЛАРУСІ НА 10 ГАДОЎ ПРАДАСТАЎЛЕНА РАСТЭРМІНОЎКА ПАГАШЭННЯ ЗАПАЗЫЧАНАСЦІ

Сельгасарганізацыям Беларусі на 10 гадоў прадастаўлена растэрміноўка пагашэння запазычанасці, што склалася на 1 студзеня 2010 года. Такое рашэнне змешчана ва ўказе ад 1 сакавіка 2010 года № 92 «Аб некаторых пытаннях сельскагаспадарчых арганізацый».

Як адзначылі ў прэс-службе, дакумент прыняты ў мэтах стварэння ўмоў для развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі і прыцягнення інвестыцый і накіраваны на аздараўленне эканомікі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі.

Указам прадастаўляецца змяншэнне сумы фінансавых абавязацельстваў сельскагаспадарчых арганізацый, якія падлягаюць выкананню ў 2010 годзе, на Br1,6 трлн (з Br9,3 трлн да Br7,7 трлн). На 1 лістапада 2009 года фінансавыя абавязацельствы гэтых вытворцаў складалі Br19,6 трлн.

Растэрміноўка пагашэння запазычанасці будзе прадастаўлена па плацяжах у рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты (акрамя мытных плацяжоў, плацяжоў у інавацыйныя фонды, падатку на дабаўленую вартасць і акцызаў, што спаганяюцца пры ўвозе тавараў з тэрыторый дзяржаў, з якімі адсутнічаюць мытнае афармленне і мытны кантроль); па плацяжах у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Мінпрацы і сацабароны; а таксама за спажытыя энергарэсурсы (газ, электрычную і цеплавую энергію).

Указам вызначаюцца ўмовы прадастаўлення растэрміноўкі па гэтых плацяжах, а таксама адтэрміноўкі на 10 гадоў па сумах эканамічных санкцый, адміністрацыйных штрафаў і пеняў за парушэнні тэрмінаў і парадку ўнясення плацяжоў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Мінпрацы і сацабароны.

У выніку нагрузка на сельскагаспадарчыя арганізацыі па названых плацяжах у 2010 годзе знізіцца на Br480 млрд (з Br541 млрд да Br61 млрд). У 2011—2013 гадах яна таксама будзе зніжана ў сярэднім на Br11 млрд штогод, а ў 2014—2019 гадах узрасце ў сярэднім на Br61 млрд штогод.

Паводле ацэнкі Мінсельгасхарча, рэалізацыя ўказа дасць магчымасць гаспадаркам, знізіўшы запазычанасць, значна актыўней ажыццяўляць мерапрыемствы па арганізацыі вытворчасці, выконваць абавязацельствы па крэдытах банкаў, а таксама бюджэтных пазыках. Усё гэта дасць магчымасць аздаравіць эканоміку арганізацый АПК, стварыць дадатковыя стымулы для прыцягнення інвестыцый.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Ліст у нумар

КВЕТНІКАЎ НЯМА. І НЕ БУДЗЕ...

Па дапамогу ў рэдакцыю звяртаюцца многія. Не выключэнне і мы, жыхары дома № 81 (асабліва пад'ездаў №№ 3 і 4) па сталічнай вул. Рафіева.

Наша праблема ў тым, што пад вокнамі на адлегласці метраў у дзесяць размешчана харчовая крама. Спачатку гэта была «Насцюша», цяпер — «Рублеўскі». Назва змянілася, а парадкі да лепшага — не, бо ў краму, як і трэба таго чакаць, пастаянна падвозяцца нейкія тавары. Машыны на разгрузку едуць пад нашымі вокнамі і разварочваюцца тут жа, на тратуары. Нам у выніку нават на хвіліну нельга пакінуць дзяцей. Нельга і самім спыніцца з машынай ля сваіх жа пад'ездаў, каб разгрузіць багажнікі, прыехаўшы з вёскі, дачы або з пакупкамі з іншай крамы.

З гэтым мы змагаліся, як маглі: каб машыны не заязджалі на тратуар, саджалі, прынамсі, кветкі, але ўсе яны за тыдзень-другі гінулі пад коламі.

Кіроўцаў можна зразумець — іншага месца для развароту ў іх няма. Але ж хто зразумее нас?

Тым больш што да лепшага з цягам часу нічога не мяняецца і нават шанцаў на гэта няма, бо змянілася назва ў крамы (і трэба разумець гаспадар?), змяніўся і рэжым яе працы. Адчыняцца яна стала ў 8.00. А ў 7.30 ці не ўсе выпівохі з мікрараёна «Малінаўка» ўжо з'ехаліся, тусуюцца і чакаюць адкрыцця. Нам жа фортку адчыніць нельга, бо там «мат-перамат» і наогул відовішча не для слабанервовых...

А яшчэ з лета мінулага года прылеглая да «Рублеўскага» тэрыторыя стала «зарастаць» (вышэй за агароджу!) пустымі кардоннымі скрынямі, пластмасавай тарай. Глядзіш туды і думаеш — Божа баранi, адна запалка і тады...

Але і гэта яшчэ не ўсё.

У будынку магазіна «Рублеўскі» насупраць пад'езда № 3 адчынілі так званую «культурна-забаўляльную ўстанову»: там бар, там гульнявыя аўтаматы, рулетка «Багіра» і акно «Пары-матч» — з начным рэжымам працы. У выніку пад вокнамі пастаянныя натоўпы вечна п'яных маладых людзей, якія лаюцца матам, часам б'юцца, п'юць. Ну і натуральна, дзе п'юць, там і ljюць, «адліваюць» таксама. Ад чаго летам ну гэткі смурод — словамі не перадаць!

І гэта — ці не галоўнае — неонавыя агні ўстановы свецяць прама ў вокны дома — клічуць, зманьваюць нашу моладзь, нашых школьнікаў. А куды — гуляць, спявацца? Ці ж гэта можна? На наш погляд, падобным установам не павінна быць месца ў жылых кварталах, пад самымі вокнамі.

Карацей, сіламі жыльцоў парадак нам не навесці. Гэта не кветкі пасадзіць... Патрэбна дапамога.

Ніна ЛУШЧЫК і іншыя жыхары дома № 81 па вул. Рафіева.
г. Мінск.



Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

ЦАР-ДУБ АДРОДЗІЦЦА!

Цар-дуб у вёсцы Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна рос на працягу больш як 500 гадоў. Дрэва з'яўлялася гордасцю жыхароў усёй акругі — гасцей абавязкова прывозілі палюбавацца цар-дубам і дакрануцца да яго. Але некалькі гадоў таму ляснічыя заўважылі засыханне велікана ў сувязі са змяненнем глебавага складу, а зусім нядаўна дрэва ўвогуле павалілася. Але працягнуць яму жыццё ў якасці помніка прапанавала старшакласніца СШ № 7 г. Калінкавічы Алена Века. Два гады таму яна ў Парыжы ўбачыла помнік самаму буйному дрэву французскай сталіцы. Гэту ідэю падтрымалі ў калінкавіцкім прадпрыемстве «Камунальнік». Дуб, які паваліўся, дастаўлены ў Калінкавічы, і да свята горада, якое будзе адзначацца вясной, тут з'явіцца першы ў Беларусі помнік самаму буйному і старому дрэву.

НА ЗДЫМКУ: Алена ВЕКА са сваімі аднакласнікамі каля 500-гадовага дуба.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ПАЧЫМ ЗЯМЛЯ?

У 31-гадовага індывідуальнага прадпрымальніка з Мінска для сталічных жыхароў яна каштавала шмат: дакладней, ён «гандляваў» участкамі ў Мінскім раёне, падбухторваючы зацікаўленых у атрыманні там зямлі людзей да дачы хабару нібыта адказным асобам сельскіх Саветаў.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» **оперупаўнаважаны па асабліва важных справах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі МУС Вераніка ПАСМЕЦЦЕВА,** «бізнэсмен» прапаноўваў мінчукам за хабар паставіць іх на чаргу асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў і пазачарговае выдзяленне зямельных участкаў пад будаўніцтва ў Мінскім раёне: маўляў, для гэтага трэба толькі даць «на лапу» патрэбным асобам. Мяркуючы па тым, што ў гэтай крымінальнай справе хапае пацярпелых, «нішу» прадпрымальнік знайшоў прыбытковую. На сёння ўстаноўлена ўжо 30 пацярпелых, якія купіліся на абяцанні прайдзісвета, які, між іншым, раней быў судзімы за махлярства. Не выключана, што даверлівых людзей было больш, што павінна вызначыць далейшае расследаванне. Але ўжо на гэты час выяўленая сума незаконных грашовых узнагароджанняў уражвае — яна склала больш за 300 тысяч долараў ЗША. Прадпрымальны бізнэсмен затрыманы супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Партызанскага РУУС Мінска і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

Ігар ГРЫШЫН.

НАСТАЎНІК СКОКНУЎ З АКНА АЎДЫТОРЫІ

У Мінску з трынаццатага паверха вучэбнага корпуса Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка выкінуўся настаўнік вясковай школы з Рагачоўскага раёна.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей БАЛАШАЎ,** здарылася гэта ў мінулую пятніцу каля сямі гадзін вечара. 24-гадовы мужчына, які пайшоў на самагубства, раней вучыўся ў гэтай вышэйшай навучальнай установе, а летась быў размеркаваны настаўнікам у адну з сярэдніх школ Рагачоўскага раёна. Паводле папярэдніх звестак, у БДПУ ён прыехаў, каб вырашыць пытанне пра сваё перарасперкаванне. На жаль, крайні крок, на які пайшоў гэты настаўнік, каштаваў яму жыцця. Цяпер расследаваннем гэтай справы займаецца пракуратура Маскоўскага раёна, якая павінна высветліць усе акалічнасці трагічнага здарэння.

Ігар ГРЫШЫН.

ДАЧАКАЛАСЯ «ЎДЗЯЧНАСЦІ» АД СЫНА

Каб працягваць п'янае вяселле, 54-гадовы падазроны нанёс 80-гадовай маці, якая не аддавала маёмасць на вынас, 5 нажавых раненняў...

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» **прэс-афіцэр Фрунзенскага РУУС Ала ГАЛУБОВІЧ,** мінскімі праваахоўнікамі заведзена крымінальная справа ў дачыненні да раней чатыры разы судзімага непрацуючага мінчаніна, які жыў у кватэры са сваёй старой маці. Апошняя ў страшным сне не магла падумаць, што яе крывінка калісьці падыме руку з нажом на яе. Але крымінальніка, паміж якім і выпіўкай стала жанчына, такія акалічнасці не турбавалі. Сутнасць у тым, што перад учыненнем злачынства мужчына ўжо паспеў заліць за каўнер разам са знаёмай на вуліцы. Падалося мала і ён прыйшоў дадому, каб вынесці новы тэлевізар і тэлефон за грошы на спіртное. Маці ж ні ў якую не давала гэта зрабіць. Тады зламыснік схапіў падушку і стаў душыць маці, а праз хвіліну кінуўся на кухню і схапіў нож, якім нанёс 5 колата-рэзаных ранаў. Між іншым, затрыманы потым патлумачыў у міліцыі, што ўчыніў злачынства па п'янцы і просіць прабачэння ў маці...

Ігар ГРЫШЫН.

КАШТОЎНЫЯ МЕТАЛЫ ЗНОЎ ЗМЯНІЛІСЯ Ў ЦАНЕ

Пастановай Міністэрства фінансаў уводзяцца новыя цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе, што скупліваюцца ў фізічных асобаў (акрамя куплі-продажу банкаўскімі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі каштоўных металаў у выглядзе мерных зліткаў і манет у фізічных асобаў) і пастаўляюцца ў Дзяржфонд. У сілу яны ўваходзяць з 4 сакавіка. Нагадаем, дагэтуль цэны на каштоўныя металы змяняліся з 1 студзеня сёлета, а раней — з 17 лістапада летась.

З пазначанай вышэй даты скупачныя цэны ў рублях за грам металу будуць наступнымі. Золата ў вырабах і ломе: 375-й пробы — 32 920 рублёў (апошняя цана дагэтуль была 33 850 рублёў за грам металу); 500-й пробы — 43 900 рублёў (45 140 рублёў); 583-й і 585-й пробы — 51 360 рублёў (52 810 рублёў); 750-й пробы — 65 840 рублёў (67 710 рублёў); 900-й пробы — 79 010 рублёў (81 250 рублёў); 916-й пробы — 80 420 рублёў (82 690 рублёў); 950-й пробы — 83 400 рублёў (85 760 рублёў); 958-й пробы — 84 100 рублёў за грам металу (з 1 студзеня было 86 480 рублёў). Плаціна ў вырабах і ломе: 950-й пробы — 116 150 рублёў (было дагэтуль 107 900 рублёў за грам металу). Серабро ў вырабах і ломе: 750-й пробы — 950 рублёў за грам металу (было 1060 рублёў); 800-й пробы — 1020 рублёў (1 130 рублёў); 875-й пробы — 1110 рублёў (1240 рублёў); 916-й пробы — 1170 рублёў (1290 рублёў); 925-пробы — 1180 рублёў (1310 рублёў); 960-пробы — 1220 рублёў за грам металу (цана перад гэтым складала 1360 рублёў).

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў САКАВІКУ

3, серада, 19.30—23.00
4, чацвер, 0.00—2.00
6, субота, 3.30—6.30
8, панядзелак, 10.00—16.00
10, серада, 21.00—24.00
11, чацвер, 1.00—5.00
13, субота, 12.00—18.00
16, аўторак, 1.00—5.30
18, чацвер, 10.30—15.30
20, субота, 18.30—23.00
23, аўторак, 1.00—5.00
25, чацвер, 3.30—8.30
27, субота, 6.00—10.00
29, панядзелак, 6.00—10.30
31, серада, 11.00—13.00

Цукар падаражэў на 5 працэнтаў

З мінулай суботы ў Беларусі былі павышаныя ў сярэднім на 5 працэнтаў фіксаваныя розныя цэны на цукар-пясок для рэалізацыі насельніцтву і мінімальная адпускная цана для рэалізацыі на прамысловую апрацоўку.

Паводле звестак Мінэканомікі, адпаведнае рашэнне прынятае па прапанове канцэрна «Белдзяржхарчпрам» для кампенсацыі падаражання кошту цукру-пяску, які імпартуецца, і паляпшэння фінансавага стану арганізацый, якія перапрацоўваюць цукар. Такім чынам, цяпер рознічная цана на цукар-пясок вагавы складае 2470 рублёў за адзін кілаграм, а на расфасаваны ў поліэтыленавыя ці папяровыя пакеты па адналу кілаграму — 2700 рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

Зала калегіі

ПРЫЦЯГАЛЬНАСЦЬ ПРАФЕСІІ ПЕДАГОГА Ў ГРАМАДСТВЕ ІМКЛІВА ЗНІЖАЕЦЦА...

ШТО неабходна зрабіць для павышэння ў грамадстве статусу педагога? Як прыцягнуць у адукацыйную галіну педагогаў-мужчын? Як замацаваць маладых спецыялістаў на іх першым працоўным месцы? Дзе знайсці рэсурсы, каб захаваць высокапрафесійныя кадры ва ўстановах дашкольнай адукацыі? Гэтыя пытанні былі ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў калегіі, прысвечанай падвядзенню вынікаў выканання Пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі і Беларускім прафесійным саюзам адукацыі і навукі на 2007—2009 гады.

— Адукацыя — тая сфера, якая закранае інтарэсы практычна кожнага жыхара нашай краіны, таму фарміраванне высокапрафесійнага асяроддзя мае ключавое значэнне для стабільнага функцыянавання і паспяховага развіцця галіны, — падкрэсліў у сваім выступленні **намеснік міністра адукацыі Беларусі Казімір ФАРЫНО.** — Цяпер у агульнаадукацыйных установах нашай краіны працуюць больш як 110 тысяч педагагічных работнікаў, 91 працэнт з іх маюць вышэйшую адукацыю і 9 працэнтаў — сярэднюю спецыяльную. У школах у якасці настаўнікаў працуюць больш як 360 студэнтаў і амаль 8 тысяч работнікаў у пенсійным узросце. Вельмі шкада, што працягвае змяншацца прадстаўніцтва сярод школьных настаўнікаў педагогаў-мужчын. У агульнаадукацыйных установах працуюць 16 070 мужчын (гэта толькі 14,5 працэнта ад агульнай колькасці). У папярэднім годзе іх было 17 260 чалавек, або 15 працэнтаў ад агульнай колькасці.

Вышэйшую і першую кваліфікацыйную катэгорыю маюць амаль 74 працэнты настаўнікаў. Казімір Фарыно заўважыў, што працэдура атэстацыі педагагічных кадраў апошнім часам істотна спрасцілася. У прыватнасці, пашырыўся пералік асобаў, якія пры пераходзе з адной педагагічнай пасады на іншую маюць права прэтэндаваць на тую ж кваліфікацыйную катэгорыю, якую яны мелі раней. Педагагічным работнікам са стажам працы на пасадзе 10 і больш гадоў дадзена права прэтэндаваць на вышэйшую катэгорыю без здачы кваліфікацыйнага экзамену.

Смехатворнай выглядае сума выплат на метадычную літаратуру, якая не пераглядалася з лістапада 2001 года і складае сёння толькі 7,5 тысячы рублёў.

— Разам з тым, у шэрагу устаноў адсутнічае глыбокі аналіз дзейнасці настаўнікаў і да пытанняў атэстацыі педагогаў падыходзяць фармальна, — падзяліўся сваім меркаваннем Казімір Фарыно. — Магчыма, трэба разгледзець пытанне пацвярджэння вышэйшай катэгорыі адзін раз у пяць гадоў...

Вельмі актуальным з'яўляецца замацаванне маладых спецыялістаў па месцы іх размеркавання пасля завяршэння тэрміну абавязковай адпрацоўкі.

— Мы лічым, што трэба выкарыстоўваць самыя розныя меры сацыяльнай падтрымкі маладых спецыялістаў, — падкрэсліў Казімір Фарыно. — У шэрагу раёнаў Брэсцкай вобласці маладым спецыялістам, якія працуюць у сельскай мясцовасці, штомесяц даплачваюць адну базавую велічыню. У Веткаўскім, Нараўлянскім, Кармянскім раёнах Гомельскай вобласці маладыя спецыялісты забяспечваюцца жыллём з жыллёвага фонду райвыканкамаў і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Я ўпэўнены, што якасна працуе той педагог, які не заклапочаны жыллёвымі праблемамі і ўпэўнены ў заўтрашнім дні.

Паляпшэнню псіхалагічнага становішча ў калектывах, а таксама павышэнню адказнасці работнікаў спрыяе рост колькасці кантрактаў, заключаных з педагагічнымі работнікамі на пяцігадовы тэрмін. Разам з тым, намецілася і негатыўная тэндэнцыя — за апошні год павялічылася колькасць кантрактаў, заключаных з педагагічнымі работнікамі тэрмінам на адзін год. Калі ў 2008 годзе іх доля складала 16,7 працэнта ў агульнай колькасці, то летась — ужо 17,8 працэнта. Заўважана, што часцей за ўсё «асцярожнічаюць» з кароткатэрміновымі кантрактамі наваспечаныя кіраўнікі, аднак такая «асцярожнасць» павялічвае сацыяльнае напружанне ў калектыве. Кантракты, заключаныя тэрмінам на адзін год, фактычна пераўтвараюцца ў інструмент адміністрацыйнага ціску: педагогі не могуць адчуваць сябе ўпэўнена і справядліва хвалююцца за сваю будучыню. Дарэчы, на 1 студзеня 2010 года, па звестках прафсаюзных органаў, у Цэнтрах занятасці насельніцтва знаходзіліся на ўліку 722 былыя работнікі адукацыйнай галіны, з іх педагогаў — 531 чалавек.

Найбольш актуальнае пытанне для настаўніцтва — памеры заробкаў. У 2009 годзе сярэднямесячная заработная плата работнікаў адукацыі склала 693,9 тысячы рублёў, або 248 долараў.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МЯДЗВЕДЗЕЎ ЗАГАДАЎ АЛІМПІЙСКІМ ЧЫНОЎНІКАМ ПІСАЦЬ ЗАЯВЫ АБ СЫХОДЗЕ

Чыноўнікі, якія былі адказнымі за падрыхтоўку алімпійскай зборнай да гульняў у Ванкуверы, павінны напісаць заявы аб сыходзе. Пра гэта ў панядзелак прэзідэнт РФ Дзмітрый Мядзведзеў заявіў на сустрэчы з кіраўніцтвам партыі «Адзіная Расія».

«Той, хто нясе адказнасць за падрыхтоўку да Алімпіяды, павінен несці адказнасць і цяпер, — заявіў Мядзведзеў. — Адказныя асобы павінны будуць прыняць мужнае рашэнне і напісаць заявы». «Калі не змогуць, мы ім дапаможам», — дадаў Мядзведзеў.

У Ванкуверы Расія заняла 11-е месца ў агульнакамандным медальным заліку, заваяваўшы ўсяго тры залатыя медалі.

У КРЫМЕ ВЫМЕРЗЛІ ФРУКТОВЫЯ ДРЭВЫ І ВІНАГРАДНІКІ

Міністр аграрнай палітыкі Крыма Павел Акімаў 1 сакавіка абвясціў, што ў 2010 годзе мясцовых сялян чакаюць вялікія страты, чыннікам якіх сталі студзеньскія маразы, што пашкодзілі фруктовыя дрэвы і вінаграднікі.

Генератыўныя пупышкі загінулі ў 80 працэнтаў абрыкосавых дрэў, у больш за 60 працэнтаў персікавых дрэў і ў палове ўсіх сліў, груш і чарэшняў.

Міністэрства ацаніла шкоду, нанесеную сялянам маразамі, у 5,5 мільёна долараў.

Як паведамлялася раней, у канцы студзеня ў Крыме на некалькі дзён устаялася анамальна халоднае надвор'е. У некаторых раёнах паўвострава тэмпература паветра апускалася ніжэй за мінус 25 градусаў. У звычайныя зімы ў гэтых месцах тэмпература рэдка апускаецца ніжэй за мінус 10 градусаў.

Мацней за іншых ад халадоў пацярпелі сельгаспрадпрыемствы Бахчысарайскага, Краснагвардзейскага, Сакскага і Сімферопальскага раёнаў.

ЕЎРОПА — ПРЫЯРЫТЭТ, АЛЕ Ў НАТА КРАІНА БОЛЬШ НЕ ІМКНЕЦЦА

Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч, здзяйсняючы свой першы на гэтай пасадзе замежны візіт у Брусэль, заявіў, што інтэграцыя ў Еўропу — ключавы прыярытэт для яго краіны. Пры гэтым Кіеў будзе наладжваць адносіны з Расіяй, у чым моцна зацікаўлены Еўрасаюз, паабяцаў кіраўнік дзяржавы.

Адзначыўшы залежнасць ад гэтага шматлікіх сацыяльна-эканамічных пытанняў, Януковіч паабяцаў Еўропе бесперабойныя пастаўкі расійскага газу. А кажучы аб партнёрстве з НАТА, ён падкрэсліў, што альянс пашырацца не будзе, і статут Украіны не зменіцца.

РЭЙТЫНГ «НЕБЯСПЕЧНЫХ» І «БЯСПЕЧНЫХ» МАБІЛЬНЫХ ТЭЛЕФОНАЎ

Амерыканская незалежная даследчая група EWG (Environmental Working Group) апублікавала чарговую версію рэйтынгу самых небяспечных і самых бяспечных тэлефонаў, паведамляе The Standard.

Даследнікі прыйшлі да высновы, што папулярныя і нятанныя смартфоны Motorola Droid, Blackberry Bold 9700, LG Chocolate Touch і HTC Nexus One маюць узровень радыёчастотнага выпраменьвання, які набліжаецца да максімальна дапушчальнай нормы.

Для вызначэння ўзроўню выпраменьвання мабільных тэлефонаў выкарыстоўваецца велічыня пад назвай «удзельны каэфіцыент паглынання» (SAR), якая вымераецца ў ватах на кілаграм (Вт/кг). Па нормах, усталяваных Федэральнай камісіяй сувязі ЗША, лімітавы ўзровень SAR для ўсіх частак цела (уключаючы галаву) павінен складаць 1,6 Вт/кг, для рук, запясцяў і ног — да 4 Вт/кг. У цэлым, чым меншы ўзровень SAR, тым больш бяспечным з'яўляецца тэлефон.

Самымі бяспечнымі тэлефонамі эксперты EWG назвалі апараты Sanyo Katana II (велічыня SAR 0,55 Вт/кг), Samsung Rugby і Blackberry Storm 9530 (па (0,57 Вт/кг) і Samsung I800 Omnia II (0,62 Вт/кг).

У Bold 9700 гэты паказчык роўны 1,55 Вт/кг, у Motorola Droid — 1,5 Вт/кг, у Chocolate Touch — 1,46 Вт/кг і ў Nexus One — 1,39 Вт/кг.

Тым не менш, радыёчастотнае выпраменьванне ўсіх мадэляў, якія трапілі ў спіс «небяспечных», знаходзіцца ў межах нормаў, вызначаных Федэральнай камісіяй сувязі ЗША. EWG настойвае на ўзмацненні жорсткасці стандартаў.

САМЫЯ ДАРАГІЯ БРЭНДЫ

Брытанскае агенцтва Brand Finance апублікавала рэйтынг 500 самых дарагіх брэндаў свету.

Першае месца, як і летась, заняла сетка супермаркетаў Wall-Mart, чый брэнд быў ацэнены ў 41,4 мільярда долараў. Кампанія шырока распаўсюджваная ў ЗША і па ўсім свеце: славіцца вельмі нізкімі коштамі і шырокім асартыментам. На другое месца вырвалася кампанія Google — 36,2 мільярда, трэцяе займае Coca-Cola, якая займала ў леташнім рэйтынгу другую пазіцыю, з 34,8 мільярда. У першую дзясятку таксама ўвайшлі IBM, Microsoft, General Electric, Vodafone, HSBC, HP і Toyota.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.03.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
1 долар ЗША	2 930,00	1 чэшская крона	154,47	USD	29,9300
1 еўра	3 989,78	1 польскі злоты	1 016,58	UAH	37,3099
1 латвійскі лат	5 640,58	1 расійскі рубель	97,90	1000 BYR	10,2115
1 літоўскі літ	1 158,79	1 украінская грыўня	367,21	EUR	40,7377

Агенцтва Уладзіміра Грыцова

Стыхія

СЁННЯ «КСІНЦІЯ» «ВЫДЫХНЕ» НАД БЕЛАРУССЮ ПАХАЛАДАННЕМ І ЎЗМАЦНЕННЕМ ВЕТРУ

А ўвогуле вяртанне халоднага надвор'я ў пачатку сакавіка — звычайная для нас з'ява. Тым больш па статыстыцы першы вясновы месяц збольшага за апошнія 20 гадоў — цёплы

УРАГАН «Ксінція», нарабіў столькі бяды і які метэаролагі ўжо паспелі ахрысціць як самы моцны за апошнія дзесяць гадоў (яго параўноўваюць са штормам, які ахапіў Францыю ў снежні 1999 года, калі ў выніку разгулу стыхіі загінула 92 чалавекі), прасоўваецца ў глыбіню Еўропы. Пачаўшы свой разбуральны шлях з Канарскіх астравоў, ён абрынуўся на паўночны захад Іспаніі, праз некалькі гадзін у нядзелю праявіў свой неўтаймоўны нораў ужо ў Францыі. Затым былі Германія, Бельгія, Нідэрланды, Партугалія... Па апошніх звестках, што меліся на раніцу і поўдзень панядзелка, гаворка вялася пра некалькі дзясяткаў загінулых ад удару стыхіі, дзясятках параненых. Ёсць і прапаўшыя без вестак. Дзясяткі тысяч людзей засталіся без электрычнасці. Парывы ветру, як паведамлялася, у розных краінах і ў розны час дасягалі 150—210 кіламетраў у гадзіну.

— Тое, што мы бачым зараз за вакном (у панядзелак — **С.С.**) — і ёсць праявы магутнага цыклону, цэнтр якога зараз знаходзіцца над Балтыйскім морам, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» **начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.** — У бліжэйшыя суткі ён будзе вызначаць надвор'е ў нашай краіне. У аўторак чакаецца снег, мокры снег, мяцеліца на большай частцы тэрыторыі. Месцамі ўзмацненне ветру да 15—20 метраў за секунду. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе складаць ад мінус трох да плюс двух градусаў. Ці давядзецца нам сутыкнуцца з нечым падобным, як у краінах Заходняй Еўропы? Ураган ужо страціў сваю сілу, актыўнасць, хоць, як я заўважыў вышэй, будзе ўзмацненне ветру.

Як паведаміў далей Дзмітрый Анатольевіч, з серады нас, згодна з прагнозамі, чакае паніжэнне тэмпературы паветра. Уначы будзе ад мінус двух да мінус васьмі градусаў, удзень — ад мінус чатырох да плюс трох градусаў. Часам будзе ісці снег, месцамі чакаецца мяцеліца, на дарогах — галалёдзіца. З чацвярга чакаецца ўзмацненне маразоў. Уначы будзе ад мінус чатырох да мінус адзінаццаці (пры праясненнях да мінус пятнаццаці), удзень — ад нуля да мінус сямі градусаў. У паўднёвых раёнах — да плюс двух цяпла. У пятніцу—суботу ноччу будзе ад мінус чатырох да мінус адзінаццаці (пры праясненнях да дванаццаці—дзевятнаццаці са знакам мінус), удзень чакаецца ад мінус аднаго да мінус васьмі градусаў (па поўдні краіны — каля нуля). Месцамі пройдзе снег, чакаецца галалёдзіца. У нядзелю прагназуецца прыкладна такое ж надвор'е, як і ў папярэднія дні. Сярэднясутачная тэмпература паветра будзе на адзін—тры градусы ніжэй за кліматычную норму.

— Увогуле ў першай палове сакавіка нас чакае няўстойлівае, не веснавое надвор'е, — сказаў Дзмітрый Рабаў. — Подых сапраўднай вясны мы адчуем не раней за другую палову месяца — пры паступленні да нас больш цёплага паветра з поўдня Еўропы. Тады дзённая тэмпература паветра будзе складаць ад плюс сямі да плюс адзінаццаці градусаў. Зрэшты, мушу нагадаць чытачам, што вяртанне халадоў у першай палове сакавіка для нас — звычайная з'ява. Увогуле ж сакавік 2007 года быў самым цёплым за ўвесь перыяд кліматычных назіранняў, тады сярэднясутачная тэмпература паветра была на 6,8 градуса вышэйшай за кліматычную норму. Недзе з 1989 года практычна кожны сакавік быў цёплым.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Наступствы «Ксінціі» ў Еўропе часам былі вельмі разбуральнымі.

СУВЯЗІ ДУХОЎНЫЯ І МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ

Беларусь і Балгарыю шмат што яднае, аднак інвестары на тутэйшы рынак не ірвуцца — з-за бюракратыі і адсутнасці адзінага стаўлення на месцах

Аматарам замежнага адпачынку крызіс хоць бы што! Ва ўсякім разе ў аблюбаванай многімі беларусамі Балгарыі нашага брата не толькі не паменела, а наадварот — істотна павялічылася. 27 тысяч айчынных турыстаў абралі менавіта гэту краіну для свайго адпачынку-2009. І паводле інфармацыі Галіны БАЧВАРАВАЙ, загадчыцы консульскай службы пасольства Балгарыі ў Беларусі, гэта на 40 адсоткаў больш, чым у папярэднім годзе. Краіна застаецца папулярным кірункам моладзевага турызму. Так, 35 адсоткаў турыстаў, якія наведваюць Балгарыю, — дзеці да 18 гадоў. Дарэчы, новы візавы кодэкс ЕС, які ўваходзіць у дзеянне з красавіка 2010 года, прадугледжвае магчымасць бясплатных візаў для арганізаваных дзіцячых груп. Спадарыня Бачварава выказала спадзяванне, што Балгарыя застанецца традыцыйным месцам адпачынку і для новых пакаленняў беларусаў.

Візавыя нюансы, безумоўна, з'яўляюцца не апошнім стрымліваючым фактам для турыстаў. Перамовы аб спрашчэнні ідуць, цікавая пазіцыя балгарскага боку ў гэтым пытанні.

— Я асабіста выступаю за тое, каб максімальна палегчыць магчымасць узаемных паездак, — запэўніў журналістаў пасол Балгарыі ў Беларусі Захары Міцеў Радукаў. — Для нас гэта важна, каб з цягам часу не страчвалася тая добрая сувязь, што існуе паміж дзвюма краінамі.

І сувязь духоўная можа ў блізкай будучыні набыць цалкам рэальнае матэрыяльнае ўвасабленне. У выглядзе сувязі транспартнай.

— Цяпер крызіс, і сувязі пайшлі на спад. Трэба скарыстацца гэтым перыядам, каб стварыць прамую авіялінію, — мяркуе кіраўнік дыпмісіі. — Толькі ўлетку ёсць чартарныя рэйсы. Цяпер трэба знайсці рашэнне праблемы авіязносінаў паміж беларускай і балгарскай сталіцамі. Пасольства будзе працаваць на гэта. Спадзяёмся, што сустрэнем падтрымку кампетэнтных органаў і ў Беларусі, і ў Балгарыі.

Усходняе партнёрства дыпламат назваў важным кірункам знешнепалітычнай дзейнасці ЕС, у якім Балгарыя «ў адпаведнасці са сваім патэнцыялам спрабуе ўзяць удзел». Пасол зрабіў акцэнт на тым, што ініцыятыва не прадугледжвае вялікіх фінансавых праграм, «гэта больш шырокая сетка ўзаемазвязаных праектаў і розных формаў развіцця дыялогу». Ён нагадаў пра чатыры платформы партнёрства і выказаў спадзяванне, што па кожнай з іх «будзе магчымасць прасунуцца наперад». Разважаючы ў цэлым пра адносіны Беларусі і ЕС, пасол акцэнтаваў сутнасць балгарскага падыходу (які застаўся нязменным з уступленнем у Еўрасаюз): «дыялог — асноўны сродак вырашэння праблем, толькі дыялог можа дапамагчы знайсці правільнае і трывалае, а не кан'юнктурнае рашэнне.

Кіраўнік гандлёва-эканамічнай службы пасольства Лучазар НІКОЛАЎ абазначыў такія сферы інтарэсу балгарскіх інвестараў у Беларусі, як турызм, энергазберажэнне, транспарт, камунікацыі, фінансавыя паслугі. Аднак пры гэтым не стаў хаваць, што балгарскім бізнэсменам нялёгка прасоўвацца на тутэйшым рынку з-за бюракратыі. Адзначыў ён і рознае стаўленне да інвестараў на месцах:

— Калі ёсць рознае стаўленне да розных інвестараў, гэта становіцца знакам для ўсіх.

Ён згадаў, што Беларусь паставіла «вельмі амбіцыйную мэту трапіць у 30 краін з найлепшымі ўмовамі вядзення бізнэсу». І, на яго думку, «паводле ўмоў гэта будзе рэалізавана», але практыка вымушае чакаць лепшага ў многіх сферах.

Паводле прыведзенай ім інфармацыі, у Беларусі сёння дзейнічае каля 50 суб'ектаў балгарскага бізнэсу (22 з іх — у рэжыме замежных прадпрыемстваў, астатняе — дробныя фірмы фізічных асобаў). Так што поле яшчэ зусім не ўзаранае. А ці падрыхтаваная глеба? Вось над чым варта задумацца...

Ала МАЧАЛАВА.

ПРЫЦЯГАЛЬНАСЦЬ ПРАФЕСІІ ПЕДАГОГА Ў ГРАМАДСТВЕ ІМКЛІВА ЗНІЖАЕЦЦА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Наша галіна па-ранейшаму займае пятае месца сярод бюджэтных галін па ўзроўні заработнай платы, на якое яна перамясцілася ў красавіку 2007 года, — паведаміў **старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.** — Нягледзячы на павелічэнне з 1 студзеня 2009 года тарыфных ставак педагогам на 5 працэнтаў, устанаўленне даплат маладым спецыялістам і надбавак за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі кіраўнікам і іх намеснікам, адукацыя так і не змагла вярнуцца на сваё традыцыйнае чацвёртае месца, якое цяпер займае галіна культуры і мастацтва. На жаль, зніжаецца паказчык суадносінаў сярэднямесячнай заработнай платы ў галіне да мінімальнага спажывецкага бюджэту. **Такім чынам зніжаецца не толькі пакупніцкая здольнасць работнікаў сістэмы адукацыі, але і прыцягальнасць прафесіі на рынку працы.** І ЦК прафсаюза, і Міністэрства адукацыі пастаянна ўносяць прапановы па пытаннях удасканалення працы работнікаў галіны ў адпаведныя органы дзяржаўнага кіравання, аднак **дабівацца росту рэальнай заработнай платы становіцца ўсё больш складана.** Мы ўпэўненыя, што нельга дапусціць далейшае зніжэнне рэальнай заработнай платы. І без дзяржаўнай падтрымкі адукацыі не абысціся.

За апошні год павялічылася колькасць кантрактаў, заключаных з педагагічнымі работнікамі тэрмінам на адзін год. Калі ў 2008 годзе іх доля складала 16,7 працэнта, то летась — ужо 17,8 працэнта.

Сярэднямесячная заработная плата маладога спецыяліста, асістэнта выкладчыка ВНУ, які працуе на адну стаўку, цяпер 436,5 тысячы рублёў — 91 працэнт ад мінімальнага спажывецкага бюджэту. Лагічна напрошваецца пытанне: адкуль узяцца матывацыі ў маладых навукоўцаў?

Смехатворнай выглядае і сума выплат на метадычную літаратуру, якая не праглядалася з лістапада 2001 года і складае цяпер толькі 7,5 тысячы рублёў.

Казімір Фарыно паведаміў, што Міністэрствам адукацыі пры ўдзеле ЦК прафсаюза былі распрацаваныя прапановы па ўзмацненні дыферэнцыяцыі аплаты працы педагогаў у залежнасці ад якасці і выніковасці іх працы.

— Мы лічым, што найважнейшым складнікам прафесійнага росту педагога з'яўляецца прызнанне яго заслуг і маральнае заахвочванне дасягнутых поспехаў. Аднак, відаць па ўсім, не ўсе кіраўнікі гэта разумеюць, — дадаў Казімір Фарыно. — Так, летась не было прадстаўлена ніводнага ўзнагароднага матэрыялу з Кіраўскага, Клічаўскага, Касцюковіцкага, Слаўгарадскага, Хоцімскага, Бешанковіцкага, Пастаўскага, Ушацкага, Брагінскага, Кармянскага, Свіслацкага, Столінскага, Бярэзінскага, Любанскага, Смалявіцкага і Старадарожскага раёнаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прэміі і надбаўкі даволі часта губляюць сваю стымулюючую функцыю. Стымулюючыя выплаты задумваліся для таго, каб можна было ацаніць унёсак кожнага работніка ў агульную справу і заахвоціць самых годных. Аднак у рэчаіснасці нярэдка адбываецца дэфармацыя гэтай ідэі. Асабісты ўнёсак работніка не бярэцца пад увагу. Права размяркоўваць прэміі і надбаўкі дадзена кіраўнікам установ адукацыі, а таму гэтыя сродкі ў шматлікіх выпадках служаць крыніцай павелічэння заработнай платы асобным катэгорыям работнікаў. У шэрагу выпадкаў сродкі прэміявання не размяркоўваюцца, а налічэнні ажыццяўляюцца бухгалтарскімі службамі без адпаведных загадаў кіраўнікоў устаноў адукацыі. Нават мелі месца выпадкі, калі сродкі фонду прэміявання накіроўваліся на патрэбы саміх устаноў...

Падводзячы рысу пад выкананнем папярэдняга галіновага пагаднення, Аляксандр Бойка мусіў канстатаваць, што бакам не ўдалося дабіцца шэрагу сацыяльных гарантый для работнікаў галіны, таму яны ўключаны ў пералік прыярытэтаў на найблізэйшыя гады. Сярод пазіцый, якія ўвайшлі ў Пагадненне на 2010—2012 гады, аднаўленне працягласці працоўных водпускаў у работнікаў арганізацый сістэмы адукацыі, зніжэнне працягласці працоўнага тыдня ў выхавальнікаў дашкольных устаноў з 36 да 30 гадзін, вызваленне арганізацый сістэмы Мінадукацыі ад падаткаабкладання сродкаў, атрыманых ад пазабюджэтнай дзейнасці. Трэба патлумачыць, што ў 2008 годзе пасля ўваходжання ў сілу новага працоўнага заканадаўства працоўныя водпускі былі скарочаныя ў педагогаў дашкольных устаноў, устаноў пазашкольнага выхавання і навучання, устаноў, што забяспечваюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Асабліва хваравіта ўспрынялі скарачэнне працягласці водпускаў педагогі дашкольных устаноў. І гэта цалкам зразумела, бо іх заробкі не вытрымліваюць ніякай крытыкі. Наступствы нерацыянальнага рашэння не прымусілі сябе доўга чакаць — адбыўся значны адток спецыялістаў з дашкольных устаноў, у тым ліку педагогаў з вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй. Ёсць складанасці з укамплектаваннем педагогамі-псіхолагамі, а таксама з замацаваннем у дашкольных установах спецыялістаў з профільнай адукацыяй. Наўрад ці накіраванне на вакансіі выхавальнікаў маладых спецыялістаў, якія хоць і маюць педагагічную адукацыю, аднак не профільную (што назіраецца ўжо ў шэрагу рэгіёнаў) зможа прывесці да якаснага вырашэння кадравай праблемы. Хутчэй за ўсё, такое становішча прывядзе да зніжэння якасці дашкольнай адукацыі і дагнаць упушчанае не зможа ўжо ні пачатковая, ні сярэдняя школа. У педагагічных работнікаў дашкольных устаноў працягласць працоўнага водпуску была зменшана з 42 да 30 дзён. **У той жа час працоўныя водпускі працягласцю 42 каляндарныя дні захаваліся ў педагогаў дашкольных устаноў у Расіі, Казахстане, Літве, Малдове і ва Украіне.**

У новым пагадненні вызначаны прыкладны пералік сямейна-бытавых прычын для дазволу на адпачынак працягласцю, што пазначана ў калектыўных пагадненнях: гэта могуць быць работа над дысертацыяй, падрыхтоўка метадычных дапаможнікаў і падручнікаў, неабходнасць праходжання лячэння ў лячэбна-прафілактычных і аздараўленчых установах, неабходнасць догляду хворага члена сям'і, суправаджэнне яго на лячэнне, смерць члена сям'і, нараджэнне ўнукаў і гэтак далей.

Міністэрства адукацыі і прафсаюз маюць намер дабівацца штогадовага перагляду памеру штомесячных выплат на набыццё метадычнай літаратуры, прадметных часопісаў і іншых перыядычных выданняў і ўстанаўленне гэтых выплат на ўзроўні базавай велічыні. Яшчэ адна задача — увядзенне ў штатныя расклады ўстаноў адукацыі, якія маюць статус юрыдычнай асобы, пасады інспектара па кадрах ці юрысконсульта. Як высветлілася, статус юрыдычнай асобы ў пэўным сэнсе істотна ўскладніў існаванне і дзейнасць многіх устаноў, таму і ўзнікла патрэба ў прыцягненні ў адукацыю, так бы мовіць, «няпрофільных» спецыялістаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні ў сувязі з ахвярамі землетрасення ў Чылі

У сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі землетрасення ў Чылі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 28 лютага выказаў спачуванні кіраўніцтву гэтай краіны, а таксама родным і блізкім загінулых.

Прэзідэнт Беларусі выказаў спачуванні родным і калегам Уладзіслава Галкіна

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні ў сувязі са смерцю заслужанага артыста Расійскай Федэрацыі Уладзіслава Галкіна яго родным і калегам.

«У Беларусі высока цанілі Уладзіслава Барысавіча як незвычайнага таленавітага чалавека, дзейнасць якога садзейнічала ўмацаванню дружбы паміж нашымі брацкімі народамі. Яго роля ў фільме «У жніўні 44-га...», які стаў візітнай карткай сучаснага беларускага кінематографа, увайшла ў залаты фонд айчыннага мастацтва», — гаворыцца ў спачуванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Абзац

◢ Двое пасажыраў маршрутнага таксі пацярпелі пры ДТЗ у Брэсце. Кіроўца грузавога аўтамабіля ГАЗ пры тармажэнні не ўлічыў умоў надвор'я, не справіўся з кіраваннем і выехаў на сустрэчную паласу руху, дзе адбылося сутыкненне з маршрутным таксі. У выніку ДТЗ траўмаваныя (пераломы рознай ступені цяжкасці) двое пасажыраў маршруткі — мужчына і жанчына. Яны змешчаныя на лячэнне ў Брэсцкую абласную бальніцу. Праводзіцца праверка.

Поўны абзац

◢ **Два бразільскія акушэры пабіліся за пацыентку ў радзільнай зале. 32-гадовая жанчына звярнулася да ўрача, які назіраў яе падчас цяжарнасці, з просьбай аказаць ёй дапамогу пры родах. Акушэр згадзіўся, аднак як толькі пацыентцы ўвялі прэпарат для стымуляцыі родавай дзейнасці, прыбыў дзяжурны ўрач і заявіў, што прымаць роды будзе ён. Паміж медыкамі пачалася спрэчка, якая перарасла ў бойку. Каб разняць акушэраў, спатрэбілася дапамога бальнічнай аховы. Праз паўтары гадзіны іншы ўрач правёў жанчыне экстраннае кесарава сячэнне, у якім узнікла неабходнасць, аднак выратаваць нованароджаную дзяўчынку не ўдалося. Паводле папярэдніх заключэнняў, яна памерла ад кісларoднага галадання. Абодва акушэры звольненыя. Паліцыя і прадстаўнікі міністэрства аховы здароўя праводзяць расследаванне.**

◢ Чарговы раз японскія навукоўцы ўразілі грамадскасць. Спецыялісты з Таямскага медуніверсітэта распрацавалі для прадстаўнікоў моцнага полу акуляры, праз якія ўсе дамы — прыгажуні. Сакрэт адкрыцця хаваецца ў аптычным шкле з мікрачыпам, які ператварае знешнія параметры жанчын. Мініяцюрнае прыстасаванне змяшчае камп'ютар з графічнай праграмай. У літаральным сэнсе слова на вачах мужчыны апарат прыбірае з аблічча лішняе і дадае ўсё самае прыцягальнае і сэксуальнае. У прыстасаванне закладзена каля 50 тыс. вобразаў, якія падстройваюцца пад тое, што ёсць у сапраўднасці. Акуляры ажыццяўляюць да 3 млн аперацый у хвіліну, творча працуючы пад знешнасцю дзяўчат. Аўтары вынаходніцтва спадзяюцца, што іх акуляры дапамогуць вярнуць былую жарсць парам, якія доўга жывуць у шлюбе і страцілі інтарэс адно да аднаго.

◢ **У Львове злавілі згоншчыка «Таўрый». 22-гадовы львавянін паляваў выключна на аўтамабілі гэтай маркі. Ён катаўся на іх ноччу другую і кідаў за горадам — за два гады ён «абкатаў» такім чынам некалькі аўто. Малады чалавек дасканала ведаў канструкцыю «Таўрый», умеў хутка іх адчыняць, заводзіць амаль што з заплюшчанымі вачыма. Іншым аўтамабілям ён не давяраў — баяўся, што заглохнуць. Усе сагнаныя машыны адшукваліся і вярталіся ўладальнікам. Хлопец «пагарэў» з-за сяброў, якія папрасілі сагнаць «Таўрыю» і для іх. Калі іх злавілі, сябры лёгка здалі «спецыяліста па «Таўрыях» міліцыі. «Гэта нармальны эрудзіраваны хлопец, але з-за цягі да начных ралі на чужых аўто трапіць за краты не менш як на 5 гадоў», паведамілі міліцыянеры.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ТРАГЕДЫЯ НА РЭЙКАХ

На чыгуначнай станцыі «Пінск» пад цягнік трапіла 39-гадовая жанчына. Па папярэдняй інфармацыі, жыхарка адной з вёсак Пінскага раёна кінулася на рэйкі прама пад цягнік «Брэст-Смаленск». Зразумела, што такім чынам яна хацела звесці рахункі з жыццём, але засталася жывой. Толькі без абедзвюх ног.

Яна СВЕТАВА.

«Еўрабачанне-2010»

БЕЛАРУСКІ ГУРТ ПРАДЭМАНСТРУЕ Ў ОСЛА НУМАР У СТЫЛІ «АВАТАРА»?

Здарылася... не, не страшнае, наадварот, доўгачаканае — тэлеканалы-канкурэнты аб'ядналіся і выступілі партнёрамі, каб забяспечыць сёлета годны і яркі ўдзел Беларусі ў «Еўрабачанні». Функцыі арганізатара і вяшчальніка выконвае Белтэлерадыёкампанія, як адзіны ў нашай краіне член Еўрапейскага вяшчальнага саюза, фінансавы ж бок справы цалкам узяў на сябе тэлеканал АНТ, «гадаванец» якога, гурт «Тры плюс два», якраз і спяе сёлета ад нашай краіны на еўрапейскай сцэне песню «Far away».

Чаму менавіта яны, гэтыя мала вядомыя шырокай публіцы пяцёра маладых людзей? Гэтым рэзонным пытаннем задаліся не толькі журналісты, але і прыхільнікі самога конкурсу, выказваючы самыя розныя здагадкі і меркаванні. (Прынамсі ў «Звяздзе» некалькі дзён разрываўся рэдакцыйны тэлефон.). Намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Мартыненка ў адказ напаўжартам задаў сустрэчнае пытанне: а чаму б і не? «Давайце спрабаваць, эксперыментаваць — мы як вяшчальнікі будзем толькі рады, калі ў гурта атрымаецца выступіць лепш, чым у папярэдніх нашых удзельнікаў. А ўвогуле вырашальным фактарам было тое, што спадар Хоміч (першы намеснік старшыні праўлення АНТ) сказаў: «Мы зоймем першае месца». Мы яму паверылі». Калі ж сур'ёзна, то фокус-група проста выказвала меркаванне па ўсіх заяўленых песнях — падабаецца—не падабаецца. Выходзіць, што сумесны твор кампазітараў Леаніда Шырына, Юрыя Вашчука і аўтаркі тэксту спявачкі Геры, «Far away», спадабалася найбольш.

«У іх ёсць шчырасць, арыгінальнасць і маладосць, яны вельмі натуральныя», — так ахарактарызаваў пасля знаёмства ўдзельнікаў гурта легендарны танцор Андрыс Ліепа, з якім заключана папярэдняя дамова аб супрацоўніцтве і падрыхтоўцы артыстаў да конкурсу. Праўда, якой будзе пастаноўка нумару, арганізатары яшчэ і самі не ведаюць на 100 працэнтаў, аднак мяркуюць выкарыстаць матывы і настрой папулярных сёлета фільмаў «Аватар» і «Аліса ў краіне цудаў». «Чаго хоча публіка? Веры ў фэнтэзі, у тое, што на свеце існуе такое райскае месца, дзе кожны знаходзіць шчасце... Зыходзячы з гэтага трэнду, мы і будзем ставіць нумар», — разважае Сяргей Хоміч. Беларускі бок таксама плануе па максімуму выкарыстаць дазволеную правіламі «Еўрабачання» квоту — 6 чалавек на сцэне — і дабавіць або яшчэ аднаго вакаліста, або танцора. Пакуль жа «3+2», як і выцякае з назвы, гучыць на 5 галасоў.

Фота прэс-службы БТРК.

1 2 3 4 5

Хто ёсць who

Юлія Шышко (3) — нарадзілася ў Петрыкаве, але расла і вучылася ў Слоніме. На «выдатна» скончыла школу, потым Гродзенскі музычны каледж па спецыяльнасці «харавое дырыжыраванне». Цяпер 21-гадовая Юля — студэнтка музычнага аддзялення Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры.

Алена і Нінэль Карповіч (1,5) — сёстры-блізняты нарадзіліся ў Мінску, з самага дзяцінства вырашылі звязаць жыццё з музыкай — спачатку была школа з музычным ухілам, потым — Рэспубліканскі каледж мастацтваў імя Ахрэмчыка, цяпер жа — Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі па класе «харавое дырыжыраванне». У сямейна-творчым тандэме Алена — спакойная і развалівая, Нінэль — эмацыйная і экспрэсіўная. Дарэчы, 3 сакавіка дзяўчатам споўніцца 25 гадоў.

Егіязар Фарашан (2) — нарадзіўся ў Арменіі 21 год таму, але ў 5-гадовым узросце прыехаў з бацькамі ў Беларусь і... сям'я тут і засталася. Вакальныя здольнасці хлопца выявіла маці — педагог па вакале. Спачатку Егіязар не ставіўся да спеваў сур'ёзна — пакуль упершыню не перамог на конкурсе. Сёння ў яго за плячыма ўжо дзевяць перамог у міжнародных конкурсах, і, як мяркуюць спецыялісты, вялікія перспектывы на будучыню.

Арцём Міхаленка (4) — самы малодшы з удзельнікаў гурта (яму толькі нядаўна споўнілася 20 гадоў), але разам з тым і самы гаваркі. Нарадзіўся ў пасёлку Алекшыцы Бераставіцкага раёна. Захапіўся музыкай у 4 гады і самастойна навучыўся граць на баяне, акардэоне, гармоніку. Скончыў Гродзенскі каледж мастацтваў, цяпер — студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. Акрамя музыкі, захапляецца спортам — плаванне, бокс, лыжы.

— Ці будзе неяк мяняцца стыль удзельнікаў? — цікавімся ў Сяргея Хоміча. — Бо ўсе яны цёмнавалосыя — нейкая змрочная «фэнтэзі» атрымліваецца...

— Будзе. Можа атрымацца, што кагосьці з хлопцаў асвятлім, разглядаем варыянты і з дзяўчатамі. Пакуль што ўсім артыстам даручылі адрошчваць валасы, а некалькі беларускіх і расійскіх стылістаў распрацоўваюць вобразы для гурта. Мы будзем выбіраць лепшае. Тое ж датычыцца і нумара — пэўныя ідэі ёсць у нас, свае прапановы рыхтуе Андрыс Ліепа — мы іх спалучым і абяром найлепшыя.

— Ці няма ў запрашэнні Андрыса Ліепы да пастаноўкі пэўнай рызыкі? Усё ж гурт складзены не з танцораў, а з вакалістаў, і часу на падрыхтоўку ў іх зусім няшмат.

— Безумоўна, яны не могуць рабіць кульбіты на сцэне, гаворка ідзе пра такія рухі, якія былі б арыгінальнымі і цікавымі, і пры тым не перашкаджалі якаснаму «жывому» выкананню.

Значная частка работы — прома-выступленні ў тых краінах, што будуць выступаць разам з Беларуссю ў першым паўфінале «Еўрабачання» і змогуць галасаваць за нас, пастаноўка нумара, пашыў касцюмаў, змена вобразаў — яшчэ наперадзе. Пакуль жа — цяжкая, але не менш важная руціна: артысты штодня займаюцца з харэографам Вольгай Шабровай, з педагогамі па вакале, з вопытным выкладчыкам англійскай мовы. Дзеля гэтага ўсе яны з 1 сакавіка ўзялі ў Прэзідэнцкім аркестры Беларусі водпуск за свой кошт.

Ёсць пытанне

Што будзе з 50 000 долараў, якія тэлеканал АНТ некалі паабяцаў аўтару песні для «Еўрабачання»? Гэтыя грошы ўжо знайшлі свайго гаспадара альбо будуць чакаць пераможцу праекта «Музычны суд»?

Як запэўнілі нас прадстаўнікі тэлеканала, 50 тысяч долараў у любым выпадку былі адрасаваныя аўтарам песні, якая паедзе на «Еўрабачанне» — нават калі гэтая песня з'явілася б не ў межах адбору АНТ. Так што грошы дастануцца Леаніду Шырыну, Юрыю Вашчуку і Геры — аўтарам песні «Far away». Акрамя таго, пераможцы двух сезонаў «Музычнага суда» атрымаюць у якасці прыза гасцявую паездку на «Еўрабачанне-2010».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Мірны атам

«ПАСТКА ДЛЯ РАСПЛАВУ» БЕЛАРУСКАЙ АЭС

Сёння ў свеце працуе 436 атамных рэактараў. Першае месца па іх колькасці займаюць Злучаныя Штаты Амерыкі (104 атамныя рэактары). У тройку лідараў таксама ўваходзяць Францыя і Японія, кожная з якіх мае больш за 50 атамных станцый.

У Беларусі ў розныя часы разглядалася некалькі дзясяткаў пляцовак для будаўніцтва АЭС. Першая пляцоўка, на якой планавалася ўзвесці атамную цеплаэлектрастанцыю, размяшчалася недалёка ад горада Мінска, пад Рудзенскам. Там ужо былі пабудаваныя карпусы і заказаны рэактары, але пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС усе работы былі спыненыя, праект закрылі.

Выбар пляцоўкі — вельмі складаны працэс, адзначыў **старшыня Нацыянальнай камісіі Беларусі па радыяцыйнай абароне пры Савеце Міністраў, загадчык лабараторыі радыяцыйнай бяспекі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены Міністэрства аховы здароўя Якаў КЕНІГСБЕРГ.** Ёсць маса патрабаванняў МАГАТЭ, якія неабходна выконваць. Пасля прынятага рашэння аб будаўніцтве ў Беларусі атамнай станцыі першапачаткова было разгледжана шмат варыянтаў месцаразмяшчэння АЭС, потым вылучыліся тры лідары. У выніку спыніліся на Астравецкай, якая лічыцца прыярытэтнай. Яна мае шэраг пераваг перад астатнімі. У прыватнасці, прыдатныя грунты, якія не патрабуюць узмацнення, блізкасць крыніцы водазабеспячэння (побач рэчка), адсутнасць у навакольлі абранай пляцоўкі населеных пунктаў, жыхароў якіх давялося б перасяляць. Кенігсберг падкрэсліў, што Астравецкая пляцоўка яшчэ не зацверджана — да таго часу, пакуль не будзе адпаведнага заключэння дзяржаўнай экалагічнай экспертызы.

Бяспека станцыі забяспечваецца ў першую чаргу яе канструкцыяй і тымі высокімі патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца Міжнародным агенцтвам па атамнай энергіі і Еўрапейскім саюзам да новых праектаў атамных станцый, адзначыў выступоўца. У праекце беларускай АЭС апроч іншага прадугледжана двухслойная абарончая абалонка рэактара (якой, напрыклад, не мелі ні Ігналінская, ні Чарнобыльская АЭС). Абалонка, якая мяркуецца на беларускай АЭС, у стане вытрымаць вялікія нагрузкі, ураганы, смерчы, падзенне самалёта, навадненне, сейсмічнае ўздзеянне, ударную хвалю ад выбуху. У дадзеным праекце расійскія праекціроўшчыкі прапанавалі новаўвядзенне, якое яшчэ больш павысіць узровень бяспекі — «пастку для расплаву». «Самае страшнае, што адбываецца пры аварыі на АЭС, а мы гэта ведаем па дзвюх самых знакамітых аварыях — Чарнобыльскай і ў Тры Майл Айлендзе (ЗША, 1979 год), — гэта расплаўленне паліва ў актыўнай зоне, — патлумачыў Якаў Кенігсберг. — Вось каб паліва пры аварыі нікуды больш не трапляла, прадугледжана «пастка для расплаву» (спецыяльны бетонны рэзервуар)».

Цяпер Беларусь прыступіла да распрацоўкі двух новых нарматыўных дакументаў — нормаў радыяцыйнай бяспекі і асноўных санітарных правілаў забеспячэння ўмоў бяспекі, якія павінны быць падрыхтаваныя за тры гады.

Інга МІНДАЛЁВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества с условиями, с установлением начальной цены продажи неиспользуемого имущества, равной одной базовой величине

Аукцион состоится **16 марта 2010 г. в 11.35** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, 8(0222)311185.

Продавцы недвижимого имущества по лоту № 1 – ПТРУП «Минск Кристалл», тел. 8(017)2270825, **по лоту № 2** – РУП «Белпочта», тел. 8(017)2260173, 2261170.

Заявления на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами 12 марта 2010 г. до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона 16 марта 2010 г. с 10.00 до 10.50.

№ лота	Сведения о предметах аукциона: Информация о недвижимом имуществе: Наименование и краткая характеристика	Место нахождения	Начальная цена недвижимого имущества*, тыс. руб.	Информация о земельном участке: Площадь, га	Срок аренды, лет	Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб.	Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб.	Сумма задатка, тыс. руб.
1	Капитальные строения: насосная мазутного отделения одноэтажная кирпичная площадью 43 кв.м; мазутное отделение одноэтажное кирпичное площадью 52 кв.м	Могилевская область, Осиповичский район, дер. Дараганово, ул. Привокзальная	140,0	0,1390	30	19,406	159,406	15,0
2	Изолированное помещение отделения связи площадью 127,2 кв.м	Могилевская область, Дрибинский район, дер. Белая					35,0	3,5

** начальная цена продажи входящего в состав лотов недвижимого имущества определяется исходя из размера базовой величины, установленного законодательством на дату проведения аукциона.*

Условия продажи недвижимого имущества по лотам №№ 1 и 2: осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данных объектах и создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи.

В случае невыполнения вышеназванных условий с покупателей взыскивается штраф в размере, определяемом как разность между остаточной стоимостью недвижимого имущества и его ценой продажи.

Земельный участок, право заключения договора аренды которого входит в состав лота № 1, имеет ограничения в использовании в связи с расположением его в водоохранной зоне реки Птичь вне прибрежной полосы. С перечнем ограничений можно ознакомиться у организатора аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Полная информация о недвижимом имуществе, условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована в газете «Рэспубліка» 14 ноября 2009 г.

Аукцион проводится:

по лоту № 1 – в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462;

по лоту № 2 – в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г. № 36.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Срок подписания договора купли-продажи и договора аренды земельного участка не позднее 20 рабочих дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона и формирование земельного участка, а также средства, затраченные организацией по землеустройству на осуществление государственной регистрации изменения земельного участка, из которого изымается часть, или прекращения существования изъятого земельного участка.

ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «СПМК № 127»

ОАО «СПМК № 127» сообщает о покупке акций собственного выпуска на внебиржевом рынке на следующих условиях:

Цена — 51$ за 1 акцию (оплачивается в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты, при оплате нерезиденту — в долларах США).

Срок оплаты — в течение 60 календарных дней с даты зачисления акций на счет ОАО «СПМК № 127».

Количество — 7 905 акций.

Срок подачи предложений о продаже (дата окончания покупки акций) — 30 календарных дней с даты опубликования.

Адрес для подачи предложений о продаже — г. Минск, ул. Инженерная, 22.

УНП 100048018.

ОАО «КРАСНЫЙ ОКТЯБРЬ»

ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 30 марта 2010 года в 11.00 ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ по адресу: г. Витебск, проспект ген. Людникова, 10.

Повестка дня:

1. Утверждение годовых отчетов, бухгалтерских балансов, счетов прибыли и убытков Общества и распределение прибыли и убытков.
2. Утверждение регламента работы ОАО «Красный Октябрь» с реестром владельцев ценных бумаг.
3. О выкупе собственных акций на баланс Общества.
4. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в читальном зале библиотеки с 24 марта 2010 года в рабочие дни с 13.00 до 17.00.

Регистрация участников собрания будет производиться с 10.00 до 10.45 на основании документа, удостоверяющего личность (представитель акционера должен иметь доверенность).

Дата составления списка акционеров для регистрации участников собрания – 10 марта 2010 года.

Справки по телефону в г. Витебске (8 0212 24 73 18).

УНП 300003144. Наблюдательный совет ОАО «Красный Октябрь».

ОБЪЯВЛЕНИЕ

30 марта 2010 г. состоится очередное отчетно-выборное собрание акционеров ОАО «КАМВОЛЬ»

Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4 этаж главного корпуса

Повестка дня:

1. Отчет о финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 г. и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2009 году.
3. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков и годовому отчету Общества.
4. Утверждение годового отчета бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества за 2009

Ідэю прапануе чытач

«Трохколавы веласіпед быў бы вельмі карысным для многіх...»

ЯК памятаюць нашы прыхільнікі, у канцы мінулага года мы прапанавалі агульнай увазе новую рубрыку. Коратка нагадаем яе сутнасць. Калі нехта з чытачоў лічыць, што ў краіне трэба арганізаваць вытворчасць нейкіх тавараў або аказанне пэўных паслуг, што цяпер адсутнічаюць, але якія маглі б мець не лакальны, а масавы попыт (або аднавіць тое, што было калісьці, але потым незаслужана было забыты), ён звяртаецца з адпаведнай прапановай у «Звязду». Мы, у сваю чаргу, бяромся з дапамогай спецыялістаў пацвердзіць або абвергнуць «выццяздольнасць» прапанаванага праекта.

Сёння з чарговай ідэяй выступае даўні **наш чытач з Баранавічаў Аляксандр Уладзіміравіч АБРАМОВІЧ**. Ён лічыць, што «жыццё патрабуе, каб у нас у Беларусі быў сканструяваны для дарослых людзей трохколавы веласіпед». Для перавозкі грузаў неабходна стварыць да яго невялікі прычапны вазок. Аляксандр Уладзіміравіч упэўнены, што такі веласіпед быў бы вельмі да месца, асабліва для тых, хто працуе на зямлі.

Пра трохколавы веласіпед мы па запытах чытачоў некалі пісалі, праўда, было тое даволі даўно. А жыццё не стаіць на месцы: сёння нават пенсіянеры асвойваюць скутары, што яшчэ нядаўна былі выключна моладзевым спосабам перасоўвання. Ці будзе ў такіх умовах мець «права на жыццё» трохколавы веласіпед? Гэтыя і іншыя пытанні мы адрасавалі **дырэктару ЗАТ «МВЗ Інжынірынг» (якое займаецца канструктарска-тэхналагічнымі распрацоўкамі для ААТ «Мінскі мотавелазавод») Руслану ЗІМІНУ.**

— Мадэль трохколавага веласіпеда 113-391 была распрацавана яшчэ на пачатку 1990-х гадоў. Ззаду пад сядзеннем паміж восямі быў прадугледжаны кошык для перавозкі грузаў. Праўда, у серыйную вытворчасць (а серыйным лічыцца выпуск ад тысячы адзінак пры наладжванні вытворчасці пад кожную дэталь) яна тады так і не пайшла. Цэхам доследнай вытворчасці прадпрыемства ў тыя гады выпускаліся невялікія партыі трохколавых веласіпедаў па 50—100 штук. Мяркую, што іх рэшткі маглі застацца на складах або ў рознічным гандлі і па сёння. У больш позніх часы такія веласіпеды выпускаліся па індывідуальных замовах грамадзян. Напрыклад, памятаю адзін з апошніх выпадкаў, калі веласіпед замаўлялі для пенсіянера з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. Ён выконваўся пад канкрэтнага чалавека, — расказаў Руслан Аркадзьевіч. — Напрыклад, у веласіпеда можа быць розная колькасць перадач.

— А ці лёгка пажылому чалавеку кіраваць такім веласіпедам?

— Ёсць адзін невялікі нюанс: з-за канструктыўных асаблівасцяў яго крыху «вядзе» убок. Але да гэтага пасля трэніроўкі лёгка прызвычаіцца. А вось што датычыцца пенсіянераў... Я не сказаў бы, што такі веласіпед ствараўся выключна для пажылых людзей. Ён хоць і не складаны ў кіраванні, аднак мае на ўвазе, што кіроўца павінен валодаць пэўнай сілай. Зноў жа, калі гаварыць пра сельскую мясцовасць, дзе выдатны асфальт ёсць не паўсюдна, «лавіць» трыма коламі прасёлкавую дарогу таксама не вельмі проста. Таму тым, калі хто зацікавіўся, я параіў бы найперш знайсці ў гандлі рэшткі з тых партый і паспрабаваць на практыцы: наколькі зручна і лёгка ім кіраваць.

— Чаму ж сёння не наладзіць серыйную вытворчасць трохколавых веласіпедаў? Магчыма, яны прайграюць тым жа скутарам, якія набываюць усё большую папулярнасць?

— Я так не думаю. Упэўнены, што трохколавы веласіпед знайшоў бы свайго пакупніка і карыстаўся б у спажыўца попытам. А пра серыйную вытворчасць... Гэта пытанне, па-першае, да акцыянераў прадпрыемства. Па-другое, з часоў распрацоўкі мадэлі прайшло вельмі шмат часу, таму цяпер патрэбна істотная яе мадэрнізацыя. Фактычна гаворка ідзе пра стварэнне трохколавага веласіпеда наноў. Што, зразумела, патрабуе вялікіх капіталаўкладанняў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Грамадская думка

Ці ўшчамляюцца ў Беларусі правы палякаў?

Пасольства нашай краіны ў Польшчы змясціла на сваім інтэрнэт-сайце вынікі сацыялагічнага апытання сярод палякаў Беларусі. Праект, у рамках якога вывучалася грамадская думка нацыянальных меншасцяў у Расіі, ва Украіне, у Беларусі, у Польшчы, Славакіі, Венгрыі, Літве і Латвіі, фінансаваўся Еўрапейскай камісіяй. Каардынатар праекта — Інстытут сацыяльна-эканамічных даследаванняў (INS — Vienna).

Апытанне ў Беларусі праводзілася ў лістападзе — снежні 2009 года ў заходніх рэгіёнах краіны Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў Белдзяржуніверсітэта (кіраўнік — прафесар Давід Ротман). Выбарка складалася з 800 рэспандэнтаў — беларускіх грамадзянаў польскай нацыянальнасці, выбар якіх ажыццяўляўся выпадкова, у пэўных пунктах і метадам маршрутнага выпадковага адбору, з адпаведным кантролем якасці збору інфармацыі. Вось адказы на некаторыя пытанні.

● ***За апошнія 12 месяцаў Вы асабіста зведвалі на сабе дыскрымінацыю альбо прадузятае стаўленне ў Беларусі на базе этнічнага ці нацыянальнага паходжання?*** Так — 2,6 %. Не — 97 %. Цяжка адказаць — 0,4 %.

● ***За апошнія 12 месяцаў Вы асабіста зведвалі на сабе дыскрымінацыю альбо прадузятае стаўленне ў Беларусі на базе рэлігіі?*** Так — 2,1 %. Не — 97,8 %. Цяжка адказаць — 0,1 %.

● ***Як Вы лічыце, якая ступень напружанасці паміж палякамі, якія жывуць у Беларусі, і беларусамі?*** Няма напружанасці — 79,9 %. Некаторая напружанасць — 15,8 %. Цяжка адказаць — 1,8 %.

● ***Якая ступень напружанасці паміж рознымі рэлігійнымі групамі ў Беларусі?*** Няма напружанасці — 71,9 %. Некаторая напружанасць — 20,9 %. Моцная напружанасць — 2 %. Цяжка адказаць — 5,3 %.

На думку пасольства, вынікі апытання сведчаць аб адсутнасці напружанасці ў асяроддзі польскага насельніцтва Беларусі і беспадстаўнасці тэзісу аб ушчамленні правоў польскай меншасці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЯК У ГРОДНЕ ЗІМУ ПРАВОДЗІЛІ



ПАВОДЛЕ прагнозу сіноптыкаў, у другой палове гэтага тыдня зноў пахаладае, але, тым не менш, факт: зіма саступіла свае «каляндарныя правы» вясне. А значыць, нішто не перашкаджала культурна-спартыўнаму святу «Праводзіны зімы», якое традыцыйна прайшло ў лясным масіве Пышкі і сабрала тысячы жыхароў горада над Нёманам самага рознага ўзросту.

— Галоўны дэвіз нашага свята — набрацца здароўя ўсёй сям'ёй, каб гэта было модна, стыльна, — зазначыў старшыня Гродзенскага гарвыканкама Барыс Казялкоў.

Дажджу не ўдалося сарваць «Гродзенскую лыжню-2010» з удзелам усіх ахвотных, у тым ліку кіруючых работнікаў абласных і гарадскіх органаў улады, ні, галоўнае, сапсаваць святочную атмасферу. Паклапаціліся пра гэта, як кажуць, усёй талакой. І школьныя настаўнікі са сваімі вучнямі, якія «пабудавалі» цудоўны горад майстроў «Зімнія фантазіі» з разнастайнымі вырабамі, гульнямі і конкурсамі. І артысты Гродзенскага каледжа мастацтваў, аркестра «Гарадзенскія трубы». І вайскоўцы Заходняга аператыўнага камандавання, якія арганізавалі канцэртна-спартыўную праграму, а таксама шчодра частавалі гасцей свята салдацкай кашай. І ўдзельнікі экстрым-праграмы «Купанне гродзенскіх маржоў» разам з супрацоўнікамі МНС, якія сачылі за бяспекай. І, вядома, работнікі гандлю, якія прапанавалі шмат разнастайных прысмакаў.

Свята завяршылася карагодам каля вогнішча, спальваннем чучала зімы з абрадавымі спевамі яе праводзінаў і сустрэчай вясны.

Барыс ПРАКОПЧЫК. Фота Міхаіла ІСАЧАНКІ.

Факт

НА ПЛОШЧЫ ПЕРАМОГІ — СНАРАД

У Віцебску пры правядзенні земляных работ на плошчы Перамогі, якая знаходзіцца на рэканструкцыі, будаўнікі знайшлі снарад.

Як паведаміла «Звязда» **прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына ФАНДО**, сапёры, якія прыбылі на плошчу, устанавілі — гэта артылерыйскі снарад часоў Вялікай Айчыннай. «Рэха вайны» калібру 152 міліметры размініравалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УСЯМУ ВІНОЙ САБАКІ?

У выніку сутыкнення іншамарак у Жыткавічах пацярпела сямігадовая пасажырка.

«Опель» з летнімі шынамі, за рулём якога быў 50-гадовы мужчына, рэзка затармазіў на павароце. Занос — і аўтамабіль у лічаныя секунды апынуўся на паласе сустрэчнага руху, дзе сутыкнуўся з «Фальксвагенам». У выніку сутыкнення пацярпела 7-гадовая пасажырка «Опеля», якую тут жа даставілі ў бальніцу.

— Дзякуй Богу, усё абышлося спалохам і сінякамі, — **паведаміў начальнік Жыткавіцкага аддзела ДАІ Уладзімір ГУЛАКЕВІЧ.** — Дзяўчынку агледзелі і ў той жа дзень адпусцілі дадому. Прычыны ДТЗ высвятляюцца. Кіроўца «Опеля» сцвярджае, што ён быў вымушаны прымяніць экстраннае тармажэнне, бо на праезную частку нечакана выбеглі сабакі.

Надзея ДРЫЛА.

ПЕТЛІ «ЎРАСЛІ» Ў ДРЭВЫ...

Работнікі Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі разам з дырэктарам Уздзенскага таварыства паляўнічых і рыбаловаў ва ўгоддзях гэтага паляўніцтвакарыстальніка знайшлі 82 пятлі з дроту. Большасць з іх ад працяглага карыстання «ўрасла» ў драўніну ў месцах мацавання.

Сляды ад месца ўстаноўкі петляў прывялі ў вёску Целякова — да дома рабочага Уздзенскага лясгаса. Выкліканыя міліцыянеры пры вобыску знайшлі шкуры і мяса казулі і зайца-русака.

ПАДЧАС РУХУ ЗАЧАПІЎ ІНСПЕКТАРА

У дзве гадзіны ночы ва ўгоддзях Баранавіцкага таварыства паляўнічых і рыбаловаў дзяржінспектары спынілі для праверкі аўтамабіль «Фальксваген», у салоне якога знаходзіліся тры чалавекі.

Аднак пры аглядзе машыны вадзіцель пачаў рух заднім ходам. Пры гэтым пярэдняй адчыненай дзверцай зачапіў інспектара. Пасля спынення аўтамабіля ў ім былі знойдзены дзве зачэхленыя паляўнічыя стрэльбы, два патранташы з патронамі і пустымі гільзамі, два мокрыя маскіровачныя халаты. А на прылеглай мясцовасці — свежыя рэшткі тушы дзіка...

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАЛІ КАШАЛЁК У СУМЦЫ

На рынку па вул. Ленінградскай у Пінску ад злодзея пацярпела шэсць жанчын. Злодзей аказаўся даволі спрытным: выцягваў кашалькі з сумак.

Адна з пацярпелых засталася без 230 тысяч рублёў і 100 долараў, другая — без 50 тысяч рублёў і 50 долараў, а найменшыя страты панесла жанчына, у кашальку якой было 55 тысяч рублёў, 2 долары і 2 банкаўскія карткі.

Злодзея шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Кватэрнае пытанне

З улікам даходаў. І без...

Мы стаім у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, выхоўваем дзіця-інваліда. Чулі, што з лютага парадак забеспячэння жыллём такіх сем'яў мяняецца. У чым заключаюцца змены?

Л.Д. *Слуцкі раён.*

Згодна з дзейным заканадаўствам, грамадзяне, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, *у складзе сем'яў якіх ёсць дзеці-інваліды*, маюць права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання, калі сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышае зацверджанага бюджэтнага пражытковага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва, які падлічваецца за 12 месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу пастаноўкі на ўлік (і на дзень атрымання жылога памяшкання сацыяльнага карыстання), і якія маюць заяўленую маёмасць, агульны кошт якой не перавышае памеру кошту кватэры тыповых спажывецкіх якасцяў выходзячы з максімальнай нормы забеспячэння агульнай плошчай жылога памяшкання сацыяльнага карыстання на аднаго члена сям'і.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 студзеня 2010 г. № 127 БПМ вызначаны ў памеры 255 220 рублёў на перыяд з 1 лютага 2010 г. па 30 красавіка 2010 г.)

Указам Кіраўніка дзяржавы ад 16 лістапада 2009 г. № 543 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565» (увайшоў у сілу з 19 лютага 2010 г.) названая норма выключана і ў адпаведнасці з падпунктам 62.8-3 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, забеспячэння жылымі памяшканнямі дзяржаўнага жыллёвага фонду грамадзян, у складзе сем'яў якіх ёсць дзеці-інваліды, у вызначаным парадку атрымалі права на жылыя памяшканні сацыяльнага карыстання без уліку даходу ў іх сям'і і маёмаснага становішча.

Віктар САВІЦКІ.

РАСЛІННЫ КУЦЮР

Беларускія князёўны з Магілёва робяць акцэнт на зёлках

КАРОНЫ з кветак і прутоў, упрыгажэнні з апельсінавых корак і арэхавых шкарлупінаў, і нарэшце, спадніца з капусты і топ з буракоў. На ўсё гэта здатныя аматары раслінната адзення з Магілёўскай вобласці.

Конкурс строяў, зробленых з выкарыстаннем раслінаў, кветак і любога прыроднага матэрыялу, праходзіць у Магілёўскай вобласці дзясятак гадоў. Сёлета на «Рамонку-2010» умельцы з гарадоў і сельскіх раёнаў паказалі каля 200 строяў.

Вельмі ўразіла калекцыя «Беларускія князёўны», створаная ў студыі фітадызайну Магілёўскага цэнтра экалагічнага выхавання.

— Ідэя — у спалучэнні раслінаў з нацыянальным беларускім каларытам, — тлумачыць **кіраўнік студыі фітадызайну Валянціна НОВІК**. — Мы вырашылі вярнуцца ў сярэднявечча, да дваранскага строю, але ўпрыгожанага ў фітастылі.

Статныя дзяўчыны ў сукенках, аздобленых раслінамі, і ў арыгінальных каронах выглядаюць шыкоўна, сапраўднымі князёўнамі. Аснова — тканіна, а ўпрыгажэнні — кветкі, лісце, пруты і ўвогуле любы прыродны матэрыял ідзе ў справу.

— Паглядзіце: гэта лісце барвінку, засушаныя жамчужніца і васількі, ракавінкі, шкарлупіны грэцкіх арэхаў і фісташак, гарбузовыя семачкі, костачкі слівы і алычы, — паказвае аздабленне княскіх строяў і нагрудныя ўпрыгажэнні Валянціна.

На тэрыторыі цэнтра экалагічнага выхавання, схаванай у глыбіні прыватнага сектара амаль у цэнтры Магілёва, увесну саджаюць і ўлетку старанна вырошчваюць раслінны матэрыял, з дапамогай якога на свет і з'яўляюцца новыя калекцыі адзення ў студыі фітадызайну.

— Я прыйшла ў студыю ў пачатку навучальнага года, — расказвае 14-гадовая вучаніца школы № 31 Веранікі хлопчык Руслан. Высветлілася, што яго маці спала ў адным пакоі, дзіця пакінула ў другім, яшчэ адзін сын, шасцігадовы Мікалай, знаходзіўся ў суседзяў, а пяцігадовы Кірыл — дзесьці ў доме без догляду. Па папярэдняй версіі, менавіта яго гульні з запалкамі і сталі прычынай пажару ў двухпакаёвым доме.

Калі пачаўся пажар, цяжарная 42-гадовая жанчына прачнулася ад дыму і самастойна разам з Кірылам выбралася з дому. Потым зрабіла спробу вызваліць малодшага сына, пры гэтым атрымала апёкі 25 % цела. У шокавым стане яна пабегла да суседзяў, якія потым перадалі жанчыну медыцынскім работнікам. За 45 хвілін гарэння практычна знішчаны шыферны дах і значна пацярпела маёмасць у цагляным доме, дзе літаральна паўтара месяца таму было праведзена пажарна-тэхнічнае абследаванне — гаспадарам было прапанавана ліквідаваць парушэнні пажарнай бяспекі. Дарэчы, бацька дзяцей у момант трагедыі знаходзіўся на лячэнні ў Петрыкаўскай бальніцы.

Як стала вядома, шэсць гадоў таму, на Ражство, у гэтай жа сям'і падчас пажару загінулі тры дачкі — дзяўчаткам было ад 3 да 5 гадоў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Як сцвярджае дызайнер, ідэя стварыць строі з раслінных матэрыялаў прыйшла ёй у галаву, калі яна ўпершыню ўбачыла ў Інтэрнэце фотаздымкі падобных строяў, створаных у Японіі. Пакуль жа на аснове фітадызайну мы вучым ашчаднаму і адказнаму стаўленню да навакольнага асяроддзя. Вучым любіць разнастайнасць прыроды і захоўваць усё жывое вакол нас.

Калекцыі раслінных строяў, якія дэманструюцца публіцы на конкурсе «Рамонак», вельмі ўражваюць. Магілёўскі цэнтр пазашкольнай працы «Пунсовыя ветразі» прадэманстраваў «Золата Алімпа»: ільняныя тогі, упрыгожаныя саломкай. Эфектна выглядае калекцыя «Зорная феерыя», якую прыдумалі ў магілёўскай школе № 38: яркія саламяныя зоркі на цёмна-сініх сукенках.

— Саломка на цёмных тканінах — гэта заўсёды прыгожа, — каментуе Людміла Шапялевіч. — Якраз вечаровыя сукенкі з саламянымі аплікацыямі можна было б, у прынцыпе, ужываць у звычайным жыцці.

А ў магілёўскай школе № 37 вырашылі, што самы прыдатны матэрыял для фітастрою — гэта апельсіны, і назвалі сваю калекцыю «Апельсінавы рай». Усе ўпрыгажэнні зробленыя з сушаных апельсінавых корак, і лагічна завяршае аранжавую кампазіцыю капялюш з апельсінамі. Выхад гэтай калекцыі суправаджаўся ароматэрапіяй: пах апельсінаў даносіўся да апошніх радоў у зале.

Для стварэння раслінных строяў у трапічным стылі выкарыстоўваецца модны ва ўсім свеце сезаль. Але сенсацыяй стаў строй, дзе спадніцу зрабілі з капусных лістоў, а топ — з кружкоў бурака. Вось гэта сапраўдны куцюр!

Ілона ІВАНОВА.
Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

НА ПАМЫЛКАХ НЕ ВУЧАЦЦА...

Хлопчык Руслан, якому споўнілася толькі 2,5 года, загінуў падчас пажару ў Петрыкаўскім раёне. Цела дзіцяці было знойдзена абгарэлым на ложку пад тынкам, які абваліўся са столі.

Як паведамілі ў прэс-службе абласнога упраўлення МНС, пажар у вёсцы Радкоў пачаўся вечарам 27 лютага, калі не было яшчэ 20 гадзін. На тушэнне прыехала шмат пажарнай тэхнікі, а таксама медыкі і спецыялісты газавай і электрычнай аварыйных службаў. Гаспадароў у доме, які палаў, не было, але ж хутка ад суседзяў стала вядома, што ў памяшканні застаўся маленькі хлопчык Руслан. Высветлілася, што яго маці спала ў адным пакоі, дзіця пакінула ў другім, яшчэ адзін сын, шасцігадовы Мікалай, знаходзіўся ў суседзяў, а пяцігадовы Кірыл — дзесьці ў доме без догляду. Па папярэдняй версіі, менавіта яго гульні з запалкамі і сталі прычынай пажару ў двухпакаёвым доме.

Калі пачаўся пажар, цяжарная 42-гадовая жанчына прачнулася ад дыму і самастойна разам з Кірылам выбралася з дому. Потым зрабіла спробу вызваліць малодшага сына, пры гэтым атрымала апёкі 25 % цела. У шокавым стане яна пабегла да суседзяў, якія потым перадалі жанчыну медыцынскім работнікам. За 45 хвілін гарэння практычна знішчаны шыферны дах і значна пацярпела маёмасць у цагляным доме, дзе літаральна паўтара месяца таму было праведзена пажарна-тэхнічнае абследаванне — гаспадарам было прапанавана ліквідаваць парушэнні пажарнай бяспекі. Дарэчы, бацька дзяцей у момант трагедыі знаходзіўся на лячэнні ў Петрыкаўскай бальніцы.

Як стала вядома, шэсць гадоў таму, на Ражство, у гэтай жа сям'і падчас пажару загінулі тры дачкі — дзяўчаткам было ад 3 да 5 гадоў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

76-гадовы дзед... — народны дэтэктыў

Фота Сяргея САВЕЛЬЕВА.

Двух махлярак, якіх доўгі час шукала міліцыя, без усякай дапамогі затрымаў і «здаў» міліцыянерам 76-гадовы жыхар Гарадоцкага раёна. **Веньямін Сямёнавіч МАРОЗАЎ** за гэта атрымаў ганаровы «тытул» — народны дэтэктыў. Менавіта такую назву мае адна з намінацый акцыі «Грамадзянская мужнасць», якая па ініцыятыве міліцэйскага кіраўніцтва праводзіцца ў Прыдзвінскім краі і не мае аналагаў у краіне.

— Я ж — марскі афіцэр. Ды яшчэ і паляўнічы. Мяне не падманеш, — расказвае «Звяздзе» паважаны народны дэтэктыў Веньямін Сямёнавіч. — Газавы балончык заўсёды нашу з сабой. Вяртаюся да сваёй хаты, гляджу — дзве нейкія маладыя жанчыны ля ўвахода круцяцца. Падыходжу, а яны, маўляў — не да таго дома прыйшлі. Я ж бачу — адчынялі дзверы. Ды і па слядах вызначыў, што былі ў хаце чужыя...

Пакуль стары тэлефанаваў у міліцыю, нечаканыя госці спрабавалі збегчы. Дагнаў і дачакаўся народны дэтэктыў, пакуль міліцыянеры прыедуць. Потым высветлілася, што жанчыны вельмі лёгка адчынілі дзверы, бо знайшлі ў дварах ключ гаспадара ў «патайным месцы». У хаце ўзялі кашалёк, ды ўбачылі праз акно, што вяртаецца гаспадар. Спрабавалі яго падмануць. Падчас следства ўстанавілі, што менавіта яны такім чынам пакінулі без дабра некалькіх такіх жа пенсіянераў.

Заахвоціла міліцэйскае кіраўніцтва смелага дзядулю і DVD-плэер падарыла. Цікава, што народны дэтэктыў вырашыў напісаць аповесць — успаміны па тэме затрымання ім махлярак. Талент майстра слова ў яго ёсць — вершы піша пра каханне і не толькі.

— Толькі летась 35 жыхароў вобласці самастойна затрымалі злачынцаў, — распавядае «Звяздзе» **намеснік начальніка Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама Сяргей МІХАСЁЎ.** — А ўсяго нам дапамаглі каля ста чалавек. Каб заахвочваць такіх добрасумленных грамадзян, мы і прыдумалі акцыю «Грамадзянская мужнасць». Акрамя намінацыі «Народны дэтэктыў», ёсць яшчэ: «За смеласць», «За асабістую мужнасць»...

Хлопцы з Віцебска: вучань 11-га класа **Вадзім ДЗ'ЯЧЭНКА** і навучэнец **Сяргей ЛЫСАЎ** затрымалі зладзейку, якая ў абласным цэнтры спрабавала адабраць выручку ў гандляркі шапіка.

Жыхары Віцебскага раёна **Анатоль АЛЬШАНКА** (слесар-сантэхнік) і **Алег АЛЯКСЕЕЎ** (работнік птушкафабрыкі) перадалі міліцыянерам мужчыну, які абрабаваў сельскую краму. А індывідуальны прадпрымальнік **Артур ПАНТАЛЁЎ** у Оршы ў краме затрымаў злодзея, які з нажом у руцэ патрабаваў у касірак грошы.

Падчас правядзення акцыі «Грамадзянская мужнасць» у зале УУС сярод гледачоў былі і «цяжкія» падлеткі, а таксама вучні юрыдычных класаў і кадэты. Безумоўна, акцыя мае і добры выхаваўчы эфект. Само па сабе напрошваецца: а як я павёў бы сябе ў сітуацыі, калі б сустрэўся твар у твар са злачынцамі?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Затрымалі дачнага рэцыдывіста

З усіх злачынстваў крадзяжы сёння самыя распаўсюджаныя. Выкраданне мабільных тэлефонаў даўно стала класікай. І ўвогуле цягнуць усё, што трапляе ў рукі. Не забываюць зладзеі і пра дачы.

Ад зладзеяў, якія спецыялізуюцца па дачах, няма паратунку. Летась у мяне ўкралі вазок, ужо моцна разбіты за дваццаць гадоў, то і не шкада было. У суседзяў, праз вуліцу, паменшала торфу. Можа на маім вазку і вывозілі.

Восенню на дачу зазірнуў лейтэнант міліцыі з нататнікам у руках і спытаў, ці не бачыў я падазроных людзей у вёсцы. Маўляў, дачу абакралі.

— А што ўкралі? — пытаю.

— Гумовыя боты.

— У мяне вунь вазок з адрыны выцягнулі, і то не бядую. А мо заяву напісаць?

— Не хапае толькі вашага «глушака», — усміхнуўся аператыўнік і пачаў расказваць, што дачных зладзеяў затрымаць цяжка, бо гаспадары на тых дачах бываюць рэдка, а здараецца, толькі вясной даведваюцца, што іх абакралі. Ды іншым разам пацярпелыя заяўляюць аб украдзенай дробязі. Зніклі рыдлёўка з граблямі, але факт меў месца, заява ляжыць, то трэба шукаць.

Дачныя зладзеі баранавіцкіх міліцыянераў «дасталі». Больш за дзесяць пацярпелых заявілі, што іх дачы абакралі. І аператыўнікі пачалі ладзіць начное паляванне на зладзеяў. Некалькі тыдняў міліцыянеры рэгулярна наведвалі дачныя забудовы, і ім пашанцавала. Злодзея ўдалося затрымаць, калі той спрабаваў абакрасці дачу ў в. Кунцэвічы. Як кажуць, схапілі за руку.

А далей супрацоўнікаў міліцыі чакаў сюрпрыз. Падчас вобыску ў жытле затрыманага знайшлі некалькі мяхоў і скрынак з рэчамі, якія былі ўкрадзеныя з іншых дачаў.

Злодзей краў па адпрацаванай схеме. Напачатку абыходзіў дачы і выбіраў з іх тую, на якой гаспадары не бывалі. Прыязджаў на веласіпедзе, загружаўся і вяртаўся дамоў.

Затрыманы абчысціў не адну дачу ў раёне. Для 26-гадовага злодзея калонія даўно стала родным домам.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

РЭХА ЧАСОЎ РЭКЕТУ

У Наваполацку раскрылі забойства праз дзевяць гадоў. Напэўна, многія з нас не забыліся пра ліхія 1990-я, калі было крымінальнае «бязмежжа», квітнеў рэкет з рабаўніцтвамі і забойствамі. Шмат людзей пацярпела тады ад зладзеяў. А ў колькіх крымінальных справах так і не паставілі тады кропку? І вось адна з гісторый, якая нагадвае нам пра тыя часы. Урэшце знайшлі і пакаралі вінаватых у забойстве.

Як расказаў «Звяздзе» **старшы памочнік пракурора горада Наваполацка Аляксандр КАЗАКЕВІЧ**, справа была ў 2000 годзе. Тры зладзеі пагрозай і сілай патрабавалі ў жыхара Наваполацка на той час вельмі вялікія грошы — 600 долараў. Нейкім чынам ім стала вядома, што ў прадпрымальнага грамадзяніна ёсць доўг. І неаднаразова прыходзілі да яго дамоў, пагражалі пакараць за несвоечасовае вяртанне доўгу, і на вуліцы, калі сустракалі, нагадвалі пра гэта ж.

У надзеі, каб рэкеціры больш не турбавалі яго, прадпрымальнік паабяцаў падарыць ім аўтамабіль, які, быццам бы, у яго ёсць. Калі крымінальная тройца зразумела, што ні грошай, ні аўто не атрымаюць, зноў нанеслі візіт, пасадзілі напалоханага чалавека ў мікрааўтобус і вывезлі ў лес. Там жорстка пабілі. Потым прывезлі пабітага ў яго дом, сілай улілі гарэлку ў рот і пакінулі паміраць.

За забойства два зладзеі рашэннем гарадскога суда пазбаўлены волі тэрмінам на 8 гадоў з канфіскацыяй маёмасці, а яшчэ адзін забойца асуджаны на 8 гадоў і 6 месяцаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Услед за пісьмом

БУДЗЕМ РЭАЛІСТАМІ

У «Звязду» прыйшоў ліст з в. Ліпск Ганцавіцкага раёна. Праблема, якую ўзняў Фёдар Будчанін, хоць і балючая, але добра вядомая і ў нашай газеце ўжо асвятлялася. Вяртацца да яе не хацелася, але калі чытач заяўляе, што ліст напісаў па просьбе аднавяскоўцаў, то нічога не заставалася, як узяцца за пяро, бо «Звязда» ў Ліпску — самая папулярная газета.

Людзі ўсё яшчэ не могуць уціхамірыцца са стратай савецкіх рублёў, якія абясцэніліся на ўкладах перад распадам Саюза. Вось і Фёдар Аляксандравіч піша: «Я, напрыклад, усё жыццё збіраў на машыну «Жыгулі», жывучы за 45 км ад райцэнтра і быў ужо першым на чарзе ў райвыканкаме перад развалам СССР». Тыповая сітуацыя, бо вельмі многія грамадзяне Савецкага Саюза апынуліся ў становішчы нашага чытача — засталіся без грошай.

І самае сумнае тут, што прэтэнзій няма каму прад'явіць. СССР знік разам з тагачасным кіраўніцтвам і КПСС. І вось што я думаю. Свае ўклады можна было выратаваць (хоць часткова) — выратаваўшы Саюз. Але ў той час гэта асабліва нікога і не турбавала — народ назіраў за працэсам распаду даволі спакойна.

І тут трэба сказаць прама: «Няма Саюза — няма савецкіх укладаў». Праз дваццаць гадоў мы ўсё яшчэ пытаем: «А дзе нашы савецкія рублі?» А там, дзе і Савецкі Саюз. З гэтым цяжка прымірыцца, але... Праўда, Ф. Будчанін напамінае, што нам калісьці абяцалі вярнуць паўнацэнныя ўклады.

А хіба нам не абяцалі, што мы будзем жыць пры камунізме?

Аднойчы, падчас сустрэчы з былым першым сакратаром райкама, чалавекам вядомым на Брэстчыне, я спытаў: «А вы верылі ў камунізм?»

— Ды не верыў я ні ў які камунізм.

Размова вялася за чаркай, а назаўтра, раніцой, мой учарашні суразмоўца звоніць і кажа: «Слухай, ты хоць не напішы пра камунізм у газеце, а то людзі скажуць, што я ім галаву дурыў».

Знікла звышдзяржава, а хіба яе дужа ў нас аплаквалі? А вось свае грошы ўсё яшчэ шкадуем. А хіба СССР не быў нам Радзімай, сваёй краінай? Можа і шкадуем, але ў прывязцы да абясцэненых грошай.

Гэтыя разважанні для таго, каб падкрэсліць, што ўсё ўзаемазвязана. Фінансы не могуць існаваць асобна ад дзяржавы. Гэта павінна быць нам навукай. Усе свае радасці, надзеі і смутак мы павінны звязваць са сваёй краінай, каб потым не шукаць учарашні дзень.

Калі я працытаў у лісце: «Мне цяпер ужо 70 гадоў. Грошы прапалі, машыны няма. За пенсію толькі пражываю. Двое дзяцей сваіх я цяпер сустракаю і вязу да цягніка за 10 км на калгасным кані нягледзячы на любое надвор'е...», то вырашыў патэлефанаваць у Ліпск і паразмаўляць з аўтарам допісу.

Фёдар Будчанін аказаўся гаваркім чалавекам. У мінулым ён адпрацаваў дырэктарам школы і быццам бы на лёс наракаць яму не выпадае. Дачка замужам за расійскім афіцэрам, а сын адслужыў ва ўкраінскім войску і сёння ваенны пенсіянер — дзеці ў парадку. А хіба для бацькоў гэта мала? Ды і Фёдар Аляксандравіч з жонкай яшчэ карову трымаюць, хоць у вёсцы многія ад рагуль адмовіліся.

На мой погляд, у нашага чытача жыццё склалася не горш, але ж Ф. Будчанін перажывае і за вёску, і за сельгаскааператыў, бо піша: «Быў калгас на тры вёскі — сярэдні ў раёне па даходах і вытворчасці. Цяпер жа ў брыгадзе в. Ліпск і в. Задуб'е толькі па два кані засталося... Ніводная арганізацыя гэты калгас не бярэ...» А падчас размовы мой суразмоўца адзначыў: «У нас касі дзе хочаш і колькі можаш — ніхто не забараняе. Але і жыві, як хочаш».

Я зразумеў, што для чалавека, які не гультай, у Ліпску раздолле, бо даводзілася бываць ў вёсках, дзе людзям не тое што кароў няма дзе пасвіць, але і цяля няма дзе навязаць — усё заарана.

А ў пенсіянера жыццё вельмі хуткацечнае і трэба жыць сёння — лавіць кожнае імгненне. Адзін мой знаёмы, якому ў той час было 80 гадоў, сказаў: «Трэба думаць не каб яшчэ добра пажыць, а каб лёгка памерці». Вельмі мудра, хоць і цынічна.

Але калі на дзве вёскі толькі двое коней, то можа сапраўды людзям цяжка. Як тыя соткі зааграць?

А вось што сказаў **кіраўнік раёна Уладзімір СТОЛЯР:**

— *У мясцовым СВК сітуацыя складаная і там ёсць аб'ектыўныя прычыны, якія перашкаджаюць станаўленню гаспадаркі, ды і прырода летась не спрыяла. Дажджы для нашага рэгіёна — бяда. Але сказаць, што людзі там забытыя, не атрымліваецца. Ліпск — вёска невялікая, большасць жыхароў — пенсіянеры, але трэба быць аб'ектыўным. У Ліпску ёсць крама, працуе сельскі клуб, пошта, бібліятэка, ФАП. Маршрутны аўтобус ходзіць да райцэнтра. Шчыра кажучы — не ў кожнай вёсцы ёсць набор такіх паслуг насельніцтву. Асабліва калі ўлічваць, што Ліпск — вёска аддаленая. А наконт коней, то іх не два. Толькі ў Ліпску людзі трымаюць 41 каня. Ніхто не адмаўляе, што ёсць праблемы, але людзі ў нас не забытыя.*

Будуць багатыя і бедныя, дзелавыя і млявыя — неабходна ўспрымаць жыццё такім, якім яно ёсць.

Спецыяльны карэспандэнт перадае з Ванкувера

ГУД БАЙ, КАНАДА!

XXI Алімпійскія гульні ў канадскім Ванкуверы ўжо сталі здабыткам гісторыі. Цяпер гадзіннік адлічвае дні да наступных зімовых стартаў чатырохгоддзя, якія адбудуцца ў расійскім Сочы ў 2014 годзе. Урачыстая перадача сцяга ад Ванкувера Сочы адбылася ў апошні дзень спаборніцтваў, падчас закрыцця Гульняў. Гуд бай, Канада, вэлкам, Сочы...

Апошнія дні Алімпійскіх гульняў у Ванкуверы для беларускай журналісцкай дэлегацыі не былі такія напружаныя, як папярэднія. Упершыню за два тыдні знаходжання ў алімпійскай сталіцы ўдалося нармальна паспаць і не ўставаць у 5 гадзін раніцы, каб ехаць за трыдзевяць зямель, потым адтуль вярнуцца і яшчэ паспець падрыхтаваць рэпартаж у нумар.

Трыумф фрыстайліста Аляксея Грышына, які насуперак усім прагнозам змог-такі пакарыць сэрцы балельшчыкаў і суддзяў, змяніўся шэрымі буднямі. Мужчынская эстафета 4х7,5 км на біятлонным стадыёне «Алімпік Парк» паказала, што сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў у індывідуальнай гонцы на 20 км Сяргей Новікаў пакуль застаецца, як і належыць, самым надзейным гульцом у мужчынскай камандзе. Праблемы айчыннага лыжнага спорту былі вынесены на парадак дня па выніках апошніх гонак на 30 км у жанчын і 50 км — у мужчын. Гарналыжны спорт, які ў Ванкуверы прадстаўлялі дзве дзяўчыны, толькі пачынае сваё станаўленне...

Зрэшты, нават тры апошнія «халастыя» дні беларусы ў Ванкуверы хадзілі з высока паднятымі галовамі. Яшчэ б — тры медалі розных вартасцяў на адной Алімпіядзе! Пазайздросцілі нават расійскія журналісты, назваўшы ўзровень развіцця расійскага спорту на дадзены момант «ніжэй плінтуса». Такія ацэнкі зразумелыя пасля няўдалага выступлення хакеістаў і біятланістаў. Цікава, што на мужчынскай эстафеце ў Вістлеры прэзідэнт Расійскага саюза біятланістаў прадпрымальнік Міхаіл Прохараў сарваў голас, перажываючы за квартэт расійскіх біятланістаў, якому дасталіся толькі бронзавыя ўзнагароды. Нічога страшнага не адбылося, сказаў ён, Расія сябе яшчэ пакажа.

У разгубленасці ад невыразнага выступлення ўкраінскіх біятланістаў знаходзіўся на стрэльбішчы і пасол Украіны ў Канадзе Ігар Осташ. «Каторы раз прыязджаю ў Вістлер, — сказаў Ігар Іванавіч, — але ж ніяк да медалёў не дацягнемся. Голас ужо даўно сарваў. Асабліва ў першыя дні спаборніцтваў, калі наша Валя Семярэнка літаральна наступала на пяткі вашай Дашы Домрачавай. Не пашанцавала нам...»

Фота БЕЛТА

Канадцы сталі трыумфатарамі не толькі ў родным хакеі, але і ва ўсёй Алімпіядзе.

НЕАФІЦЫЙНЫ МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК

	Краіна	Золата	Серабро	Бронза	Усяго
1.	Канада	14	7	5	26
2.	Германія	10	13	7	30
3.	ЗША	9	15	13	37
4.	Нарвегія	9	8	6	23
5.	Паўднёвая Карэя	6	6	2	14
6.	Швейцарыя	6	0	3	9
7.	Кітай	5	2	4	11
8.	Швецыя	5	2	4	11
9.	Аўстрыя	4	6	6	16
10.	Нідэрланды	4	1	3	8
11.	Расія	3	5	7	15
12.	Францыя	2	3	6	11
13.	Аўстралія	2	1	0	3
14.	Чэхія	2	0	4	6
15.	Польшча	1	3	2	6
16.	Італія	1	1	3	5
17.	**БЕЛАРУСЬ**	1	1	1	3
18.	Славакія	1	1	1	3
19.	Вялікабрытанія	1	0	0	1
20.	Японія	0	2	3	5
21.	Славенія	0	2	1	3
22.	Харватыя	0	2	1	3
23.	Латвія	0	2	0	2
24.	Фінляндыя	0	1	4	5
25.	Казахстан	0	1	0	1
26.	Эстонія	0	1	0	1

Кампліменты на адрас беларускіх спартсменаў Ігар Осташ казаў спецыяльнаму карэспандэнту «Звязды» падчас падвядзення вынікаў ва Украінскім алімпійскім Доме, размешчаным недалёка ад станцыі «Брадвей». Па-добраму ўразіла ўрачыстасць і размах гэтага мерапрыемства — украінскія артысты, дзясяткі запрошаных украінцаў-эмігрантаў, шчодра накрытыя сталы. Добры настрой быў створаны прысутным, хоць Украіна не заваявала ніводнага медаля ў Ванкуверы! У нас жа, беларусаў, было шмат падстаў, каб сустрэцца ў нефармальнай абстаноўцы (нават залаты медаль!). Праўда, усе «святы» прыходзілася ладзіць самастойна ў вузкім журналісцкім коле, жадаць поспехаў спартсменам ад свайго імя строга на прафесійнай мове. Верагодна, менталітэт у беларусаў і ўкраінцаў розны.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

БЕЗ МАБІЛЬНІКА

Выпрабавана на сабе

Карэспандэнт Настасся Занько зведала асаблівасці безмабільнага жыцця

МАБІЛЬНЫ тэлефон настолькі стаў часткай існавання, што часам нават і не ўяўляюцца тыя часы, калі яго не было. І сучаснаму чалавеку з мабільнікам каля вуха складана ацаніць, наколькі ён стаў залежным ад гэтага апарата. Зрабіць гэта можна толькі застаўшыся без любімага сябра...

Аўторак 00.00. Я адключыла два свае мабільныя тэлефоны. Экраны на развітанне паміргалі мне кнопкамі і згаслі. Эксперымент пачаўся.

Дзень першы. ЛОМКА

Серада. Салодка пацягваюся на ложку, гляджу ў акно і... разумею, што не ведаю, колькі часу. Рука пацягнулася да мабільніка, але экран быў мёртвы. Я паглядзела на гадзіннік суседкі і, о жах, ужо 10.00. Час, калі я даўно павінна быць на працы. Да гэтага мяне звычайна прыемнай мелодыяй будзіў мой мабільны сябра.

У аўтобусе мяне ахапіў страх таго, што я прапушчу нешта важнае. А магчыма, вось зараз, у гэтую хвіліну мне тэлефануюць з прапановай, якая кардынальна зменіць усё жыццё. А раптам мне прапануюць кантракт за мяжой ці яшчэ што-небудзь. Карацей, яшчэ хвілін пяць, і мае ногі ўжо былі гатовыя крочыць назад, па тэлефон. Аднак розум стрымаў.

У рэдакцыі я з імпэтам расказала пра свой эксперымент. Куратарка не праявіла асаблівай радасці. Было зразумела, што цяпер адправіць на заданне мяне станавілася досыць складана. (Шчыра прызнацца, у душы мне гэтая сітуацыя нават і спадабалася: вось яна, свабода.)

Першымі мяне вылічылі сябры. За дзень да гэтага мы дамовіліся, што сустрэнемся ў піцэрыі. І яны, не дазваніўшыся, вылічылі мяне праз адну з сацыяльных сетак.

— Ты з глузду з'ехала?! — даведаўшыся, што я жыву без мабільнага тэлефона, пісалі сябры. — Як мы знойдземся? Дзе цябе шукаць?!

Вось вам і дажыліся, без мабільнага тэлефона ўжо ў невялікай піцэрыі не знойдземся. «Знойдземся», — была ўпэўнена я. Што тут такога. Важна толькі ведаць дакладны час і месца. Астатняе — справа тэхнікі.

Пасля працы я скіравалася да месца сустрэчы. І ўжо праз пятнаццаць хвілін чакання мне проста невыносна стала ад невядомасці. Цікава, а як сустракаліся людзі гадоў дваццаць таму? А маладыя людзі на спатканні, колькі часу чакалі каля гадзінніка? Напэўна, былі больш цярплівымі.

У чарговы раз агледзеўшы піцэрыю, я апранулася і выйшла. І на вуліцы заўважыла свайго сябра Дзімку.

— Насця, ну нарэшце, — узрадаваўся ён. — А сустрэча адмяняецца. Ніхто не змог, я вось таксама з трэніроўкі еду і ўспомніў, што ты без тэлефона. Думаю, папярэдзіць трэба.

«А быў бы мабільнік...», — шкадуючы аб згубленым часе, думала я па дарозе дамоў.

Дзень другі. ЗМАНЛІВАЯ СВАБОДА

Такое адчуванне, што ў мяне дэжа вю. Я не магу ўстаць у час ужо трэці дзень, мой біялагічны гадзіннік яўна адключыўся. З іншага боку, навошта яму працаваць, калі ёсць мабільнік.

Пятнаццаць хвілінаў на зборы, ліфт, аўтобусны прыпынак. І нейкае такое дзіўнае пачуццё, нібыта штосьці важнае засталося ў пакоі. Дыктафон! Машынальна шукаю ў сумцы тэлефон, каб набраць суседку і папрасіць узяць дыктафон з сабой у горад. Тут падыходзіць аўтобус. «Ай, ну яго, як-небудзь і так спраўлюся», — махаю рукой на дыктафон і ўскокваю ў салон.

Вось стомленая бабуля насупраць ціхенька стала побач са мной. «Сядайце», — саступаю ёй месца. Самае цікавае, што раней у гэты час бабулі звычайна не ездзілі. Ці я проста іх не заўважала?

Побач з бабуляй сядзіць малады чалавек і чытае кнігу на экране тэлефона, каля яго слухае рэп дзяўчына ў зялёным паліто. Я агледзелася: ва ўсіх пасажыраў салона ў вушах бачныя навушнікі. У аўтобусе размаўлялі толькі дзве пажылыя пары, астатнія засяроджана маўчалі. Яны слухалі музыку ў плэеры ці па мабільным тэлефоне.

На працы адсутнасць мабільнага тэлефона, якую я першапачаткова вызначыла для сябе як свабоду, сталася для мяне новым галаўным болем. Звязацца з фатографам было досыць складана, ды і заданняў давалі менеж. Мяне проста не знаходзілі. А так хутка як у той дзень, я не пісала ніколі. Дзякуй Богу, хоць ручка і блакнот былі на месцы. Памяці і пальцам давялося патрэніравацца.

Дзень трэці. НАРУЧНЫ ГАДЗІННІК І ВОЛЬНЫ ЧАС

У пятніцу я пазычыла наручны гадзіннік у сваёй сяброўкі. Цяпер час я магла даведацца ў любы момант, а не толькі ў метро ці ў выпадковых мінакоў.

Лісты на электронную пошту прыходзіць перасталі. Мяне не запрашалі ў кіно, тэатр, кавярню і на іншыя мерапрыемствы. Сумна...

Аднак іншы плюс — мабільнік вызваліў шмат вольнага часу. Лічыце самі. Дарога на працу і назад (1 гадзіна 20 хвілін), размовы падчас абеду (1 гадзіна), вечаровыя размовы з сябрамі і бацькамі (ад 15 хвілін).Так што кожны дзень у мяне вызвалілася ад дзвюх з паловай гадзін.

Увечары я ўспомніла, што патрэбна патэлефанаваць бацькам (іх я папярэдзіла зараней: у іншым выпадку яны паднялі б на вушы ўвесь Мінск). І тут дапамог звычайны таксафон. Дзякуй, што іх пакуль не прыбралі з-за непапулярнасці.

Адсутнасць тэлефона прымусіла рухацца. Для высвятлення некалькіх важных пытанняў мне давялося спусціцца па лесвіцы на чатыры паверхі ўніз, пасля падняцца на тры ўверх. І так некалькі разоў. Пад вечар я валілася з ног. Але што за аэробіка атрымалася! Паратройка такіх дзён і можна экстэрнам залік па фізкультуры ва ўніверсітэце здаваць.

ШТО Ў ВЫНІКУ?

Згодна з умовамі эксперыменту, я павінна была пратрымацца без тэлефона як мінімум пяць дзён. Аднак насамрэч я пражыла без мабільніка толькі чатыры. На пяты дзень у мяне быў дзень народзінаў. Застацца без віншаванняў я не магла. Няхай прабачаць мяне чытачы.

Нягледзячы нават на, здавалася б, такі невялікі тэрмін, вымаляваліся ўсё ж свае плюсы і мінусы жыцця без мабільніка.

ПЛЮСЫ

Эканомія. У сярэднім мае выдаткі на ўтрыманне двух тэлефонаў складаюць каля 2200-2500 у дзень. За чатыры дні я зэканоміла каля 10 тыс.

Здароўе. Па звестках РНПЦ гігіены, мабільны тэлефон — гэта выпраменьвальнік электрамагнітных палёў. Пры размове гэтыя палі ўздзейнічаюць на мозг, сятчатку вачэй і інш. Так што на час эксперыменту мой арганізм пазбавіўся выпраменьвання хоць бы ад тэлефонаў.

Вольны час. З'явілася шмат часу для думак, чытання кніжак і самаадукацыі.

Жывыя стасункі. З некаторымі людзьмі, нават з суседзямі па інтэрнаце, я вырашала пытанні праз мабільны тэлефон. А тут давялося заходзіць у госці. І звычайна акрамя працоўных момантаў заходзілі размовы «за жыццё». Менавіта іх мне, як высветлілася, па-сапраўднаму не хапала.

МІНУСЫ

Страта часу. Бадай, асноўны мінус жыцця без тэлефона. Даводзіцца траціць час на пошукі таксафоната ці пошты. А так можна ў аўтобусе вырашыць неабходныя пытанні. І тое, на што раней сыходзілі гадзіны, займае пяць-дзесяць хвілін.

Адсутнасць мабільнасці. Вас складана знайсці. Для атрымання інфармацыі патрэбна асабістая сустрэча. Што не заўжды магчыма.

Праблемы з працай. Для многіх спецыяльнасцяў, такіх, як гандлёвы агент, журналіст, менеджар, мабільны тэлефон неабходны як паветра. Ад сабранасці і мабільнасці залежыць заробак.

Выпадзенне з грамадства. Насамрэч губляюцца многія карысныя сувязі і людзі. Тэлефон дапамагае пастаянна трымаць сувязь адзін з адным. Асабліва з родзічамі і іншымі блізкімі людзьмі ў замежжы.

Па вялікім рахунку, мабільны тэлефон — здабытак прагрэсу, задача якога палепшыць жыццё людзей. Аднак ці сапраўднае гэта паляпшэнне, калі яно адпавядае толькі крытэрыям зручнасці, што раўназначна слову «спрашчэнне»? Да якой ступені патрэбна чалавеку спрашчаць сваё жыццё? І ці не прывядзе спрашчэнне ў тэхнічным плане да спрашчэння стасункаў, эмоцый і ўнутранага свету?

ЯНЫ ТАКСАМА ЖЫЛІ БЕЗ ТЭЛЕФОНА:

Таццяна, менеджар, пражыла два тыдні без мабільніка:

— Самае цікавае, што мяне ўсё адно знаходзілі. Аднак праз два тыдні, калі тэлефон усё ж з'явіўся, званкоў не было. Бывалі дні, што ні адзін чалавек не патэлефанаваў.

Уладзімір, выкладчык БДУ, займеў тэлефон толькі мінулай вясной:

— Да гэтага я абыходзіўся без мабільніка. І нармальна сябе адчуваў, у мяне была тэлефонная картка, я прасіў, каб вечарам мне тэлефанавалі. Аднак я ўсё ж вымушаны быў набыць тэлефон, таму што бывалі выпадкі, калі людзі мяне проста не знаходзілі. І я зразумеў, што нікуды ад яго не дзецца.

Наталля, бухгалтар, жыве без тэлефона па сёння:

— Мне абсалютна не перашкаджае адсутнасць мабільнага тэлефона. Я абыходжуся і без яго. Проста калі ў мяне будзе мабільны, то па працы мяне «дастануць» у любой, прабачце, дзірцы. А так у мяне ёсць магчымасць мець пэўную свабоду.

ЛІЧБЫ:

На 31 снежня 2009 года колькасць абанентаў сеткі velcom склала 4,1 млн, у МТС — 4,563 млн, у life:) — 1 млн, а ў Diallog — 132 тыс.

Агульная колькасць абанентаў у Беларусі — 9,795 млн.

Факт

КАЛІ ЖАНЧЫНЕ 95...

Урачыстая цырымонія падвядзення вынікаў II Рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2009» запланавана на сёння. Цэнтральны офіс Беларускага саюза жанчын вызначыў 52 фіналісткі ў 9 намінацыях: «За лідэрства і паспяховае кіраўніцтва», «За актыўную грамадскую дзейнасць», «За дасягненні ў выхаванні дзяцей», «За дабрачыннасць і міласэрнасць», «За ўклад у духоўна-маральнае адраджэнне грамадства», «За высокі прафесіяналізм», «За вернасць і адданасць прафесіі», «За ўклад у адраджэнне вёскі», «За жаночую мужнасць».

«Жанчынай-легендай» стала, па меркаванні кампетэнтнага журы, 95-гадовая Вольга Аксенцьеўна Андрасюк з вёскі Сакалова Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Вольга Аксенцьеўна — кавалер ордэнаў «Чырвонага Сцягу» і «Чырвонай Зоркі». У гады Вялікай Айчыннай была вадзіцелем. Працавала ў калгасах амаль да 80 гадоў. Мае дзвюх дачок.

Святлана БАРЫСЕНКА.

«БЕЛКАМУНМАШ» ВЫЙГРАЎ ТЭНДАР НА ПАСТАЎКУ 83 ТРАЛЕЙБУСАЎ У БЯЛГРАД

«Белкамунмаш» абышоў па шэрагу паказчыкаў, а самае галоўнае, суадносінамі цаны і якасці, украінскіх і кітайскіх вытворцаў. Многія еўрапейскія вытворцы (Mercedes, Solaris) так і не рашыліся падаць заяўкі на ўдзел у тэндары з-за першапачаткова высокай цаны на сваю прадукцыю.

Андрэй ПЯТРОЎ,
«Мінск—Навіны».

103 МІНЫ

У Бабруйску знайшлі мінамётныя міны часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Адбылося гэта на праспекце Будаўнікоў пры рамонце ліўневай каналізацыі. Сапёры выцягнулі з зямлі 103 міны і знішчылі на палігоне.

Ілона ІВАНОВА.
Фота Магілёўскага УМНС.

СТРАХАВАЛЬНІКІ — ЛЮДЗІ ПІЛЬНЫЯ

Работнік ветэрынарнай лячэбніцы ў Ляхавічах выдаў пратакол анатаміравання каровы, якая належала беспрацоўнай з в. Нача.

Пратакол, які неабходна было прадставіць у «Белкаапстрах», аказаўся падробленым.

З ветработніка ўзялі падпіску аб нявыездзе.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и на право заключения договоров аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Аукцион состоится **6 апреля 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222) 229022, 311185, 311216, 223375.

Продавцы недвижимого имущества: по лоту № 1 – Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, тел. 8(0222) 226357; **по лоту № 2** – РДУП по обеспечению нефтепродуктами «Белорусьнефть – Могилевоблнефтепродукт», тел. 8(0220) 457240; **лоту № 3** – РУП «Могилевэнерго», тел. 8(0222)293143; **по лоту № 4** – ГУ «Могилевская областная государственная инспекция по семеноводству, карантину и защите растений», тел. 8(0222) 257561.

Заявления на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – 2 апреля 2009 г. до 16.00. Заключительная регистрация участников аукциона – 6 апреля 2010 г. с 10.00 до 10.50. С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни до установленного последнего дня подачи заявлений на участие в аукционе.

№ лота	Сведения о предметах аукциона: Информация о недвижимом имуществе: Наименование и краткая характеристика	Место нахождения	Начальная цена продажи имущества, тыс. руб.	Информация о земельном участке: Площадь, га	Срок аренды, лет	Начальная цена продажи права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб.	Начальная цена продажи предмета аукциона, тыс. руб.	Сумма задатка, тыс. руб.
1	**Капитальные строения: административное здание** одноэтажное шлакобетонное площадью 139,7 кв.м; гараж панельный площадью 67,5 кв.м	Могилевская область, Краснопольский район, г.п. Краснополье, ул. Зевина, д. 39	26 381,570	0,1591	50	9 838,698	36 220,268	3 600,0
2	**Капитальное строение** (дом отдыха № 1 «Уют») с ограждением общей площадью 201 кв.м, фундамент бетонный, стены – облицованные кирпичем щиты; **капитальное строение** (дом отдыха «Уют» № 2) общей площадью 31 кв. м, фундамент бетонный, стены – облицованные кирпичем щиты	Могилевская область, Кировский район, Стайковский с/с., д. Подлужье	53 116,082	0,1197	50	6,796	53 122,878	5 300,0
3	**Здание общежития № 1** двухэтажное кирпичное площадью 410,21 кв.м; **здание общежития № 2** двухэтажное кирпичное площадью 409,25 кв.м; **здание летнего спального корпуса № 3** одноэтажное кирпичное площадью 181,27 кв.м; **здание столовой** одноэтажное кирпичное площадью 355,84 кв.м; **здание котельной** одноэтажное кирпичное площадью 108,24 кв.м	Могилевская область, Быховский район, дер. Проточное	171 343,232	0,6797 и 0,4918	30	44,198 и 31,972	171 419,402	17 000,0
4	**Капитальные строения: административное здание** одноэтажное сборно-щитовое облицовано кирпичом площадью 60,47 кв.м; **дорожка** бетонная площадью 6 кв.м; **ограждения** площадью 29 кв.м	Могилевская область, Чериковский район, г. Чериков, ул. Карла Маркса, д. 32	10 314,440	0,0262	25	1 909,339	12 223,779	1 200,0

Начальная цена продажи недвижимого имущества, входящего в состав: лотов №№ 1, 4 понижена на 20 процентов; лота № 3 понижена на 50 процентов.

Условия для победителей аукциона в отношении земельных участков, право заключения договора аренды которых входит в состав лотов:

- № 3 – в двухмесячный срок со дня государственной регистрации договора аренды земельного участка получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства (в случае изменения назначения приобретенных на аукционе зданий и сооружений);

- № 4 – в случае изменения назначения недвижимого имущества получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Земельные участки, входящие в состав лотов №№ 2 и 3, имеют ограничения в использовании в связи с расположением в водоохранной зоне Чигиринского водохранилища.

Задатки перечисляются на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в настоящем извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в настоящем извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в настоящем извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Срок заключения (государственной регистрации) договора купли-продажи и договора аренды земельного участка – не позднее 20 рабочих дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету без предоставления рассрочки.

Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона и формирование земельного участка, а также средства, затраченные организацией по землеустройству на осуществление государственной регистрации изменения земельного участка, из которого изымается часть, или прекращения существования изъятого земельного участка.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 31 марта 2010 г. в 10.00 состоится закрытый аукцион по продаже права на заключение договоров аренды торговых объектов, расположенных в г. Бобруйске по ул. Социалистической, 65/46 в торговом доме «Березина», принадлежащих на праве собственности ИП Касевичу В.Ф., в составе:

№ лота	№ торгового объекта	Площадь торгового объекта, кв.м	Начальная цена продажи, на 11 месяцев, бел. руб. (без НДС)	Начальная цена продажи, на 3 года, бел. руб. (без НДС)	Задаток, % от начальной цены продажи
1	23	20	13 200 000	45 360 000	10 %
2	27	22,85	15 081 000	51 823 800	10 %
3	27а	12,75	8 415 000	28 917 000	10 %
4	2	17,5	11 550 000	39 690 000	10 %
5	7	16,2	10 692 000	36 741 600	10 %
6	8	10	6 600 000	22 680 000	10 %
7	8а	4,5	2 970 000	10 206 000	10 %
8	8б	3	1 980 000	6 804 000	10 %
9	21	19,5	12 870 000	44 226 000	10 %
10	22	16,7	11 022 000	37 875 600	10 %

Ставка арендной платы: 0,6 базовой величины за 1 кв/м торговой площади.

Условия продажи: в аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, а также индивидуальные предприниматели, согласно списку, утвержденному собственником торговых объектов.

Торговые объекты сдаются в аренду сроком на 11 месяцев либо на 3 года по выбору арендатора, начиная с 01.04.2010 г.

Срок заключения договора аренды: до 01.04.2010 г.

Условия оплаты	Договор аренды на 3 года – стоимость права на заключение договора аренды вносится разовым платежом в течение 3 месяцев с даты заключения договора аренды; договор аренды на 11 месяцев – стоимость права на заключение договора аренды вносится равными частями в течение всего срока аренды
Место проведения торгов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация»
Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54
Номер расчетного счета для внесения задатка	**Получатель платежа ИП Касевич В.Ф. – р/с 3013067300017 в ЗАО «БТА Банк» г. Минск, код 704, УНП 790354670**
Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка	**до 30 марта 2010 г. включительно**

Для участия в аукционе в адрес Организатора торгов необходимо предоставить: заявление на участие в аукционе; заверенную банком копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: индивидуальным предпринимателям:** свидетельство о гос. регистрации индивидуального предпринимателя (оригинал и копия), представителю индивидуального предпринимателя – нотариально заверенную доверенность, **юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации (руководителю – копию приказа (протокола) о назначении на должность); **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность. **Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.** Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости права на заключение договора аренды торгового объекта, сформированной на аукционе, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **Организатор торгов или Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 01.04.2010 г. на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов до проведения аукциона.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 31 марта 2010 г. в 12.00 состоится закрытый аукцион по продаже права на заключение договоров аренды торговых объектов, расположенных в г. Бобруйске по ул. Социалистической, 65/46 в торговом доме «Березина», принадлежащих на праве собственности ИП Савельеву С.К., в составе:

№ лота	№ торгового объекта	Площадь торгового объекта, кв.м	Начальная цена продажи, на 11 месяцев, бел. руб. (без НДС)	Начальная цена продажи, на 3 года, бел. руб. (без НДС)	Задаток, % от начальной цены продажи
1	3	14,8	9 768 000	31 968 000	10 %
2	4	16,9	11 154 000	36 504 000	10 %
3	10	17,2	11 352 000	37 152 000	10 %
4	13	16,2	10 692 000	34 992 000	10 %
5	17	40,1	26 466 000	86 616 000	10 %
6	28	13,7	9 042 000	29 592 000	10 %
7	32а	10,55	4 642 000	15 192 000	10 %
8	32б	10,55	4 642 000	15 192 000	10 %

Ставка арендной платы: 0,6 базовой величины за 1 кв/м торговой площади.

Условия продажи: в аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, а также индивидуальные предприниматели, согласно списку, утвержденному собственником торговых объектов.

Торговые объекты сдаются в аренду сроком на 11 месяцев либо на 3 года по выбору арендатора, начиная с 01.04.2010 г. Срок заключения договора аренды: до 01.04.2010 г.

Условия оплаты	Договор аренды на 3 года – стоимость права на заключение договора аренды вносится разовым платежом в течение 3 месяцев с даты заключения договора аренды; договор аренды на 11 месяцев – стоимость права на заключение договора аренды вносится равными частями в течение всего срока аренды
Место проведения торгов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация»
Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54
Номер расчетного счета для внесения задатка	**Получатель платежа ИП Савельев С.К. – р/с 3013107370008 в ОАО «Технобанк» г. Минск, код 182, УНП 790351324**
Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка	**до 30 марта 2010 г. включительно**

Для участия в аукционе в адрес Организатора торгов необходимо предоставить: заявление на участие в аукционе; заверенную банком копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: индивидуальным предпринимателям:** свидетельство о гос. регистрации индивидуального предпринимателя (оригинал и копия), представителю индивидуального предпринимателя – нотариально заверенную доверенность, **юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации (руководителю – копию приказа (протокола) о назначении на должность); **представителям физ. лиц** – нотариально заверенную доверенность. **Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.** Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости права на заключение договора аренды торгового объекта, сформированной на аукционе, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **Организатор торгов или Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 01.04.2010 г. на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов до проведения аукциона.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

Краіна здароўя

Выпуск № 9 (178)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Першая вясна Агнэшкі

Шасцімесячная жыхарка г.п. Шаркоўшчына Агнэшка ПЕТУХОВА з матуляй Аленай.

Пра нас

Для людзей з высокім узроўнем тэстастэрону сям'я — не самае галоўнае

Узровень увагі, якую надае мужчына сям'і, залежыць ад выпрацоўкі палавога гармону тэстастэрону ў яго арганізме, паказала міжнароднае даследаванне. Чым больш гармону выпрацоўваецца, тым менш увагі жонцы і дзецям надае мужчына.

Як вядома, высокі ўзровень тэстастэрону спрыяе павышанай сэксуальнай актыўнасці і схільнасці да здрады. Аднак пасля таго, як мужчына становіцца бацькам, выпрацоўка гэтага гармону ў большасці выпадкаў зніжаецца.

Навукоўцы з Францыі і Вялікабрытаніі даследавалі сувязь паміж выпрацоўкай тэстастэрону ў арганізме і адносінах у сям'і ў жыхароў вёсак Сенегала, дзе распаўсюджаная палігамія. Аказалася, што незалежна ад колькасці жонак узроўні тэстастэрону ў мужчын з дзецьмі былі ў сярэднім ніжэйшыя, чым у адзінокіх. Сярод жанатых больш гармону выпрацоўвалася ў мужчын з некалькімі жонкамі. Прычым сенегальцы з высокім узроўнем тэстастэрону надавалі менш увагі жонкам і дзецям.

Як паказала нядаўняе даследаванне амерыканскіх вучоных, жанчыны з павышанай выпрацоўкай тэстастэрону больш схільныя да фінансавай і кар'ернай рызыкі.

ФУТБОЛ Б'Е ГІПЕРТАНІЮ

Вучоныя выявілі, што футбольныя трэніроўкі здольны зніжаць павышаны артэрыяльны ціск.

Даследаванне, праведзенае Універсітэтам Капенгагена, паказала, што ўсяго тры месяцы заняткаў футболам два разы на тыдзень нармалізуюць крывяны ціск і вагу ў людзей, якія вядуць неактыўны лад жыцця. Адзначаецца таксама, што дыета і лячэбна-прафілактычная гімнастыка, якія прапісваюцца звычайна ўрачамі пры гіпертаніі, не аказваюць настолькі пазітыўнага эфекту за такі кароткі тэрмін.

Акрамя таго, футбольныя трэніроўкі станоўча ўплываюць на іншыя фактары рызыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў, такія як максімальнае спажыванне кісларода, сардэчная скарачальнасць, эластычнасць сасудаў і ўзровень халестэрыну. Прычым гэты ўплыў аказваецца больш выразным, чым пры сілавых трэніроўках, і не меншым, чым пры бегу.

Такі эфект, на думку вучоных, дасягаецца за кошт комплексу рухаў, характэрных для гульні ў футбол: бег, скачкі, павароты корпуса, якія даюць магчымасць спалучаць кардыя- і фізіянагрузкі. Таму даследчыкі рэкамендуюць уключаць футбольныя трэніроўкі ў працэс лячэння гіпертаніі і праграмы па зніжэнні шырокага спектра сардэчна-сасудзістых рызык.

Гэтыя даследаванні праводзіліся ў рамках буйнамаштабнага навуковага праекта, прысвечанага ўплыву футбола на здароўе.

Зала калегіі

Васіль ЖАРКО:

«Патрэба ў лячэнні беларусаў за мяжой змяншаецца...»

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 27 лютага.)

Высокія тэхналогіі — на экспарт

У 2009 годзе былі дасягнуты значныя поспехі ў развіцці медыцыны высокіх тэхналогій. За 2009 год было праведзена больш як 6 тысяч кардыяхірургічных аператыўных умяшанняў, у тым ліку 894 — у Цэнтры дзіцячай кардыяхірургіі. Вырасла колькасць аперацый аортакаранарнага шунціравання ў спалучэнні з пластыкай і (ці) пратэзаваннем клапанаў сэрца, колькасць аперацый у дзяцей да года з ускладненымі прыроджанымі парокамі сэрца.

У РНПЦ анкалогіі праведзена больш як 4 тысячы высокатэхналагічных і складаных хірургічных умяшанняў: там, у прыватнасці, практыкуюцца такія метады лячэння, як тэрмахіміятэрапія пры распаўсюджаным раку лёгкага, фотадынамічная тэрапія ў хворых з дысплазіяй шыйкі маткі.

Нейрахірургічная служба актыўна выкарыстоўвае эндаваскулярныя метады ўмяшання: усяго было здзейснена 85 эндаваскулярных нейрахірургічных умяшанняў пры анеўрызмах галаўнога мозга, 24 стэрэатаксічныя ўмяшанні пры хваробе Паркінсона і пухлінах галаўнога мозга, 16 рызатамій пры лячэнні неўралгіі трайнічнага нерва.

Удасканальвалася і афтальмалагічная дапамога: на 80 працэнтаў павялічылася колькасць хірургічных умяшанняў у хворых з катарактай з выкарыстаннем метаду факаэмульсіфікацыі, амаль у два разы больш было праведзена трансплантацый рагавіцы. У РНПЦ «Маці і немаўля» праведзена 56 лазерных аперацый пры рэтынапатыі неданошаных.

У дзіцячай службе отарыналарынгалогіі сталі ажыццяўляцца аперацыі па аднаўленні прасвету гартані і трахеі ў дзяцей ва ўзросце да года, мікрахірургічныя аперацыі па карэкцыі насавой перагародкі, засвоена методыка кахлеарнай імплантацыі, якая дазваляе захаваць астаткавы слых у дзетак.

У службе траўматалогіі і артапедыі колькасць эндапратэзаванняў тазасцегнавых суставаў вырасла на 17 працэнтаў у параўнанні з папярэднім годам, а каленных суставаў — на 23,8 працэнта. Цяпер такія аперацыі выконваюцца ва ўсіх рэгіёнах і пры рознай паталогіі, у тым ліку пры рэўматычных захворваннях, дабраякасных пухлінных працэсах, у пацыентаў з гемафіліяй.

Упершыню ў РНПЦ траўматалогіі і артапедыі было здзейснена эндапратэзаванне галёнкаступнёвага сустава. Плануецца рабіць да 50 такіх аперацый у год.

Якасны і колькасны прарыў быў зроблены ў сферы транспланталогіі. За 2009 год было праведзена 11 трансплантацый сэрца, 25 трансплантацый печані, 100 трансплантацый нырак (з іх 8 — дзецям), першая перасадка комплексу «нырка—падстраўнікавая залоза», 127 трансплантацый коснага мозгу і гемапаэтычных клетак.

У выніку праведзеных мерапрыемстваў колькасць накіраваных у замежныя клінікі беларусаў зменшылася ў 2,4 раза. Больш за тое, беларускія клінікі з гатоўнасцю прымаюць замежных грамадзян для аказання ім рэабілітацыйнай і аздараўленчай дапамогі, аказваюць высокатэхналагічныя медыцынскія паслугі. За 2009 год каля 70 тысяч замежных грамадзян атрымалі медыцынскую дапамогу на платнай аснове, што на 18,2 тысячы больш, чым у папярэднім годзе.

У 2009 годзе арганізацыямі аховы здароўя рэспубліканскага падпарадкавання было аказана экспартуемых паслуг у аб'ёме 14 млн долараў — рост склаў 121,6 працэнта. Пры гэтым імпарт паслуг зменшыўся ў 5,6 раза.

Тэмп росту платных медыцынскіх паслуг, аказаных насельніцтву Беларусі праз усе каналы рэалізацыі, склаў 122 працэнты.

— Палітыка, што праводзіцца ў галіне развіцця платнай медыцыны, улічвае як неабходнасць прыцягнення дадатковых сродкаў для развіцця аховы здароўя, так і недапушчэнне бескантрольнага замяшчэння бясплатных паслуг платнымі і росту на гэтай падставе сацыяльнай напружанасці сярод насельніцтва, — падкрэсліў у сваім выступленні міністр.

Медыцынскія сёстры — у дэфіцыце

Закранаючы ў сваім справаздачным дакладзе кадравую палітыку, Васіль Жарко канстатаваў, што забяспечанасць кадрамі не палепшылася. Так, укамплектаванасць урачамі склала 95,7 працэнта пры каэфіцыенце сумяшчальніцтва 1,41, сярэднім медыцынскім персаналам — 97,8 працэнта пры каэфіцыенце сумяшчальніцтва 1,19. У распараджэнне ўпраўленняў аховы здароўя аблвыканкамаў былі накіраваныя 76 працэнтаў выпускнікоў, найбольшая колькасць выпускнікоў былі размеркаваныя ва ўстановы аховы здароўя Мінскай вобласці (18 працэнтаў), дзе была самая высокая патрэба ў кадрах.

— Нягледзячы на пастаяннае прыярытэтнае размеркаванне выпускнікоў медыцынскіх універсітэтаў у сельскую мясцовасць, колькасць неўкамплектаваных урачамі амбулаторый і ўчастковых бальніц засталася на ўзроўні папярэдняга года — гэта 24 участковыя амбулаторыі і 2 участковыя бальніцы. 9 амбулаторый размешчаны ў Мінскай вобласці і 8 — у Магілёўскай. Абедзве ўчастковыя бальніцы, дзе на канец года ні адна штатная пасада не была закрыта ўрачом, размешчаны ў Магілёўскай вобласці.

Вельмі востра стаіць для медустаноў і дэфіцыт сярэдняга медыцынскага персаналу. Выпуск спецыялістаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй дазволіў задаволіць попыт толькі на 50 працэнтаў. Пры гэтым, як гэта ні парадаксальна, найбольшая патрэба ў медыцынскіх сёстрах адзначаецца ў Мінску і рэспубліканскіх установах аховы здароўя. «Мяркую, што гэта сітуацыя патрабуе падрабязнага аналізу і маніторынгу за перамяшчэннямі спецыялістаў», — дадаў міністр.

У 2010 годзе, як паведаміў Васіль Жарко, плануецца захаваць прыём у медыцынскія ВНУ на ўзроўні 2009 года, а ў сярэднія спецыяльныя медыцынскія ўстановы адукацыі набор будзе павялічаны на 20 працэнтаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРАВЫ ПАЦЫЕНТА — ЗАПАВЕДНАЯ ТЭРЫТОРЫЯ?

У 2008 годзе ў Міністэрства аховы здароўя паступілі 5600 пісьмовых скаргаў ад пацыентаў. Яшчэ 5 тысяч беларусаў звярнуліся на тэлефонную «гарачую» лінію міністэрства. У абласцях і пры Камітэце па ахове здароўя Мінгарвыканкама таксама дзейнічаюць «гарачыя лініі», куды можна патэлефанаваць, каб паскардзіцца на ўрача ці на медыцынскую ўстанову. Праўда, многія лічаць больш эфектыўным і надзейным звяртацца ўсё ж непасрэдна ў міністэрства. Кіраўнікі медустаноў часцей за ўсё пасуюць перад эмацыянальнай агрэсіяй скаржнікаў. Адзін званок на «гарачую лінію» — і адміністрацыя ўстановы ўжо «на вушах». Медыкі не задаволеныя тым, што меддапамога пераўтварылася апошнім часам у медабслугоўванне. А пацыенты, у сваю чаргу, не хочуць мірыцца з абыякавасцю і нядбайнасцю ўрачоў, адсутнасцю ў паліклініках сучаснага абсталявання і шматгадзіннымі чэргамі, немагчымасцю выбраць урача ці атрымаць накіраванне ў медустанову абласнога або рэспубліканскага ўзроўню. Павялічылася ў апошнія гады таксама і колькасць судовых медэкспертыз па справах аб неналежным аказанні медыцынскай дапамогі. Адным словам, канфрантацыя паміж медыкамі і пацыентамі толькі расце, і невядома, як вырнуць іх узаемаадносіны ў канструктыўнае рэчышча...

На думку **ўрача-судмедэксперта Андрэя ФАМЕНКІ** патэрналісцкі падыход, які прыжыўся ў айчыннай медыцыне, сфарміраваў заганную сістэму, калі існуе відавочны перакос у сістэме адносінаў «урач—хворы» ў бок дамінавання інтарэсаў спецыялістаў. Вельмі многія медыцынскія работнікі лічаць сябе крыніцай дабротаў для пацыентаў і цалкам выключаюць апошніх з працэсу лячэння. Самая распаўсюджаная пазіцыя — урач заўсёды мае рацыю, а пацыент проста павінен быць удзячны яму за працу. І варта толькі згадаць пры медыках аб правах пацыентаў, як тыя тут жа становяцца ў позу, маўляў, а хто будзе абараняць нашы правы? Сапраўды, няма сэнсу адмаўляць той факт, што на сёння ўрачы і пацыенты пастаянна парушаюць інтарэсы адзін аднаго, а няведанне сваіх правоў зусім не спрыяе наладжванню дыялогу паміж канфліктуючымі бакамі. Характэрна, што аб правах пацыента ў медыцынскіх ВНУ амаль што не згадваюць і не вучаць будучых урачоў мастацтву стасункаў з пацыентамі. Ліквідаваць гэты прабел вырашыла грамадскае аб'яднанне «Цэнтр сацыяльных інавацый», пад крылом якога быў створаны **першы ў нашай краіне вучэбна-метадычны комплекс «Абарона і гарантыі правоў пацыентаў у Беларусі»**. Курс па правах пацыентаў разлічаны на ўкараненне яго ў медыцынскіх ВНУ, а таксама ў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

— Сістэма медыцынскай адукацыі працягвае рухацца ў нашай краіне па старых рэйках, калі асноўны акцэнт пры падрыхтоўцы будучых урачоў робіцца пераважна на лячэнні: галоўная задача — навучыць студэнтаў, як лячыць і чым лячыць. А этыка-прававыя пытанні закранаюцца мімаходзь, не заўсёды кампетэнтна, у рамках тых ці іншых прадметаў, — дзеліцца сваімі думкамі адзін з аўтараў вучэбна-метадычнага комплексу Андрэй Фаменка. — Прычым назіраецца ярка выражаны ўхіл у бок маральна-этычных аспектаў. Пры больш дэталёвым аналізе нам удалося высветліць, што напрыклад, у БДМУ правы пацыента згадваюцца ў рамках вучэбнай дысцыпліны «Медыцынская этыка» на кафедры філасофіі і паліталогіі. У Гомельскім медыцынскім універсітэце гэта пытанне знаходзіцца ў кампетэнцыі выкладчыкаў кафедры грамадазнаўчых і гуманітарных навук, у Віцебскім медуніверсітэце — у кампетэнцыі выкладчыкаў кафедры псіхалогіі і педагогікі. А ў БелМАПА правы пацыента надзвычай павярхоўна закранаюцца на курсах павышэння кваліфікацыі работнікамі кафедры псіхалогіі, педагогікі і замежных моў. Адным словам, ніякай аднастайнасці не назіраецца. Адзінага адукацыйнага стандарту ў медыцынскіх навучальных установах няма. У адной ВНУ правы пацыента выкладаюцца лінгвістам, у іншай — філосафам ці псіхолагам. У кожнага свой суб'ектыўны погляд на гэтыя рэчы. На мой погляд, абапірацца толькі на маральна-этычныя аспекты ва ўзаемаадносінах «пацыент — урач» памылкова, абавязкова трэба ўлічваць і прававы бок такіх узаемаадносінаў. Жыццё падказвае, што такія пытанні будуць узнікаць усё часцей, прычым яны вельмі хваравітыя для абодвух бакоў.

Стварэнне вучэбна-метадычнага комплексу, да работы над якім былі прыцягнуты юрысты, педагогі і медыкі, — гэта першая спроба запоўніць існуючы прабел, стварыць адзіны падыход да выкладання правоў пацыентаў у медыцынскіх ВНУ і, у рэшце рэшт, змяніць менталітэт медыцынскіх работнікаў, прымусіць іх перайсці на новыя этычна-прававыя нормы ўзаемадзеяння з пацыентамі. А калі ж фарміраваць прававую свядомасць будучых медыкаў, як не ў студэнцкія гады...

Вучэбна-метадычны комплекс уключае тры дапаможнікі: непасрэдна курс лекцый па правах пацыентаў у Беларусі, які дублюецца кампакт-дыскам, дапаможнік «Абарона і гарантыі правоў пацыентаў у Беларусі: тэхналогіі і методыкі выкладання» і рабочы сшытак, у якім асноўныя думкі і палажэнні сканцэнтраваныя ў табліцах і схемах. Гэта своеасаблівы канспект да лекцый. Разам з тым, у сшытку студэнт можа рабіць і неабходныя пазначэнні...

— Курс лекцый разлічаны на 36 гадзін і падзелены на 6 блокаў



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ці модуляў, — расказаў на прэзентацыі вучэбна-метадычнага дапаможніка **філосаф і метадолаг Уладзімір МАЦКЕВІЧ**, які ўваходзіць у аўтарскую групу. — Першы модуль прысвечаны аналізу сітуацыі і праблем у галіне абароны правоў пацыентаў у Беларусі. Тры наступныя носяць больш прадметны характар і раскрываюць асобныя аспекты праблематыкі абароны правоў пацыента: юрыдычны, кіраўніцкі і медыцынскі. У курс уключаны таксама модуль «Абарона правоў пацыентаў: замежны вопыт і прэцэдэнты». І заключны, шосты модуль, вызначае «зону магчымых дзеянняў» і практычнага прымянення атрыманых ведаў, навыкаў і кампетэнцый. Модулі могуць перастаўляцца, можа брацца нейкі асобны модуль і ўстаўляцца ў курсы пры падрыхтоўцы розных спецыялістаў. Мы ўпэўненыя, што кампетэнтнымі ў пытанні рэалізацыі пацыентамі правоў павінны быць і медыкі-практыкі, і кіраўнікі медустаноў, і юрысты, якім усё часцей даводзіцца сутыкацца з такой спецыфічнай праблематыкай.

Мы добра разумеем, што можна загадам аб'явіць аб увядзенні ва ўсіх медустановах курса «Асновы правоў пацыента», аднак хто будзе яго выкладаць? Калі не падрыхтаваць выкладчыкаў, то можна будзе адразу пахаваць нашу ідэю. Таму мы і падмацоўваем наш курс лекцый метадычным дапаможнікам для выкладчыкаў. Хачу таксама заўважыць, што гэта — не канчатковы варыянт дапаможніка. Мы гатовыя абмеркаваць яго з выкладчыкамі ВНУ, БелМАПА і прадстаўнікамі сістэмы аховы здароўя і адаптаваць пад канкрэтныя патрэбы, у тым ліку і да выкладання ў медыцынскіх каледжах.

У Расіі супрацоўнікамі кафедры біямедыцынскай этыкі Расійскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта М. Пірагова праводзілася сацыялагічнае даследаванне, вынікі якога заслугоўваюць увагі. На пытанне, адрасаванае студэнтам расійскіх медыцынскіх ВНУ, а ці павінен урач быць маральна дасканалым, на працягу шэрагу гадоў гучыць адзін і той жа адказ: «Урач не павінен маральна вылучацца сярод іншых людзей». Апытанні студэнцкай моладзі ў Расіі сведчаць пра тое, што менавіта асноўны прынцып прафесійнай этыкі «чыста і бездакорна буду весці я сваё жыццё» выклікае максімальную нязгоду з Гіпакратам і нават пратэст з боку студэнтаў-медыкаў. Апытанні сведчаць, што студэнты, як правіла, не хочуць ставіць перад сабой задачы па самаўдасканаленні, не хочуць, каб грамадства прад'яўляла да іх павышаныя патрабаванні. Аднак такая пазіцыя — не проста асабісты выбар урача, а яго «прафесійная памылка», хоць бы таму, што пацыент давярае ўрачу сваё жыццё і здароўе. Наяўнасць у клятве Гіпакрата абавязку імкнуцца да маральнага ўдасканалення невыпадковае: маральнае ўдасканаленне — асноўная ўмова набыцця павагі, і адпаведна даверу да ўрача.

Заслугоўваюць увагі таксама і вынікі сацыялагічнага апытання, праведзенага ў 2009 годзе па заказе Цэнтра сацыяльных інавацый, падчас якога высветлілася, што большасць беларускіх медыкаў элементарна не зацікаўленыя ў атрыманні ведаў аб правах пацыентаў. Пры гэтым рэспандэнты з кола медыцынскіх работнікаў указвалі на не зусім адэкватнае разуменне пацыентамі сваіх правоў, якое прыводзіць да парушэння правоў саміх медыцынскіх работнікаў. Такім чынам, ні пацыенты, ні ўрачы не ведаюць, дзе пачынаецца «чужая тэрыторыя». Не ведаюць ці не хочуць ведаць?

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАЦЫЕНТЫ, ЯДНАЙЦЕСЯ...

Напрыканцы мінулага года адзінаццаць арганізацый, якія прадстаўляюць інтарэсы пацыентаў, аб'ядналіся для стварэння Усерасійскага саюза арганізацый пацыентаў. У новую структуру ўвайшлі арганізацыі хворых на гемафілію, рассеяны склероз, мукавісцыдоз, анкагематалагічныя і іншыя захворванні. Прэзідэнт Усерасійскага таварыства хворых на гемафілію, сустаршыня новай арганізацыі Юрый Жулеў заявіў, што Саюз пацыентаў будзе займацца стварэннем адкрытых механізмаў умяшання ў палітыку аховы здароўя, узаемадзейнічаць з прадстаўнікамі фармацэўтычных і страхавых кампаній, будаваць сістэму абароны правоў пацыентаў, а таксама распрацоўваць заканадаўчыя ініцыятывы. Прадстаўнікі Усерасійскага саюза арганізацый пацыентаў упэўненыя ў тым, што праграмы дзяржаўных гарантый павінны саступіць месца нормам права, на падставе якіх пацыенты змогуць патрабаваць належную якасць аказання ім медыцынскай дапамогі і лекавага забеспячэння. Ініцыятары стварэння новага саюза маюць намер распрацаваць этычны кодэкс арганізацыі. У перспектыве яны спадзяюцца атрымаць у грамадстве статус, аналагічны таму, што маюць арганізацыі па абароне правоў спажыўцоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

САБАКІ ЛЕЧАЦЬ

Выхаванцы аддзялення для дзённага знаходжання маладых інвалідаў Кастрычніцкага раёна Магілёва наведалі кіналагічны цэнтр вайсковай часці ўнутраных спраў 6713 з лячэбнымі мэтамі.

Пазітыўнае ўздзеянне на здароўе чалавека ад зносінаў з сабакамі заўважана даўно, і цяпер яно выкарыстоўваецца для лячэння і рэабілітацыі. Аздараўляльны эфект можа быць значным: паляпшаецца самаадчуванне, нармалізуюцца ціск і абменныя працэсы, знікае стрэсавая трывожнасць і мышачная напружанасць, здымаецца дэпрэсія і гэтак далей.

На першым занятку ў Магілёве службовыя аўчаркі і маладыя інваліды знаёміліся. Моцна ўразілі наведвальнікаў паказальныя выступленні сабак, але найбольшае задавальненне прынёс непасрэдны кантакт. Гладзіць і лашчыць чатырохногіх «дактароў» можна было бясконца. Сабакі кіналагічнага цэнтра — вытрыманыя, цярплівыя, паслухмяныя і цалкам неагрэсіўныя жывёлы. Адна дзяўчына так захапілася, што вырашыла ўвесну абавязкова прыдбаць шчаня.

Цяпер у аддзялення для інвалідаў разам з кіналагічным цэнтрам ёсць сумесны план: штомесячныя сустрэчы з сабакамі дапамогуць маладым інвалідам адчуваць сябе лепей.

Ілона ІВАНОВА.

ЗАЛІШНЯЯ ВАГА ДЗЯЦЕЙ — НА СУМЛЕННІ БАБУЛЬ

Як паведамляе BBC, брытанскія дашкольнікі, якіх выхоўваюць бабулі і дзядулі, маюць залішнюю вагу часцей, чым іх аднагодкі. Да такой высновы прыйшла група навукоўцаў з Універсітэцкага каледжа Лондана (University College London). Даследчыкі прааналізавалі звесткі аб 12 тысячах брытанцаў ва ўзросце ад дзевяці месяцаў да трох гадоў. У ходзе даследавання было вызначана, што дзеці, якіх выхоўваюць толькі бабулі і дзядулі, маюць залішнюю вагу на 34 працэнты часцей, чым іх аднагодкі, якія наведваюць дашкольныя ўстановы ці якіх выхоўвае нянька. Для дзяцей, якіх бацькі аддаюць на выхаванне бабулям і дзядулям толькі час ад часу, гэты паказчык склаў 15 працэнтаў.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

ЦЫГАРЭТЫ-НЕВІДЗІМКІ

Улады Фінляндыі вырашылі ўзмацніць меры, скіраваныя на барацьбу з курэннем: у прыватнасці, забаранілі выстаўляць тытунёвую прадукцыю на вітрынах магазіна. Згодна з новым законам, уладальнікаў магазінаў прымусяць да вясны прыбраць усе вітрыны з тытунёвымі вырабамі. А курцам пры набыцці цыгарэт давядзецца пытацца пра іх у прадаўцоў, і тыя будуць даставаць цыгарэты з-пад прылаўка.

Новы закон таксама забараняе курыць у машыне, калі ў салоне знаходзіцца няпоўнагадовы. Акрамя таго, на працягу бліжэйшых трох гадоў у Фінляндыі плануецца дэмантаваць усе аўтаматы па продажу цыгарэт. Улады разлічваюць канчаткова выкараніць курэнне ў бліжэйшыя 30 гадоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Інфарм-укол

Новыя фактары рызыкі сардэчна-сасудзістых хвароб аў

Па меры таго як вучоныя даведваюцца аб прыродзе сардэчна-сасудзістых захворванняў, выяўляюцца новыя фактары рызыкі. Безумоўна, яны патрабуюць дадатковых даследаванняў, як патрабуюць удасканалення і метады, якія выкарыстоўваюцца для вызначэння ўтрымання наступных рэчываў у крыві.

Гомацыстэін. Натуральны прадукт абмену бялку. Даследаванні паказваюць, што ёсць залежнасць паміж высокім утрыманнем гомацыстэіну ў крыві і павышанай рызыкай ішэмічнай хваробы сэрца. Знізіць узровень гомацыстэіну можна з дапамогай фоліевай кіслаты, вітамінаў B_6 і B_{12}, хоць пакуль і не даказана, што гэта лячэнне таксама зніжае рызыку развіцця ішэміі.

Ліпапратэінліпаза. Фермент, які рэгулюе абмен ліпідаў і ліпапратэінаў. Механізм дзеяння ферменту вывучаны недастаткова. Па некаторых звестках, павышаны ўзровень ліпапратэінліпазы ў крыві звязаны з павышанай рызыкай ранняга па ўзросце інфаркту міякарда.

С-рэактыўны бялок. Яго ўзровень у крыві павышаецца пры запаленчых працэсах. Некаторыя даследаванні паказваюць на тое, што працэс запалення — рэакцыя арганізма на пашкоджанне — адыгрывае важную ролю ва ўтварэнні тлушчавых адкладанняў у сценках артэрый, а значыць, у фарміраванні атэрасклерозу. Калі так, то павышаны ўзровень утрымання ў крыві С-рэактыўнага бялку можа быць індыкатарам атэрасклерозу.

Фібрынаген. Бялок, які сінтэзуецца ў печані і адыгрывае важную ролю ў згусальнасці крыві. Паводле некаторых даследаванняў, павышаны ўзровень фібрынагену ў крыві спалучаецца з павышанай рызыкай развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў. Іншыя фактары рызыкі ішэмічнай хваробы сэрца, такія, як курэнне, пажылы і старэчы ўзрост, атлусценне, малярухомы лад жыцця і высокая канцэнтрацыя халестэрыну ў крыві, прыводзяць да павышэння канцэнтрацыі ў ёй фібрынагену. Гэтыя звесткі паказваюць на тое, што кантроль пералічаных фактараў рызыкі можа знізіць утрыманне згаданага бялку ў крыві.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Жаночыя сакрэты

ПЕРХАЦЬ: НЕ ЗМЫЦЬ, А ВЫЛЕЧЫЦЬ

Перхаць — адно з найбольш распаўсюджаных захворванняў скуры галавы. Праяўляецца яна вялікай колькасцю рыхлых лускавінак на валасістай частцы галавы. У большасці выпадкаў перхаць — спадарожніца себарэі (парушэнне функцыі сальных залозаў). З'яўленне перхаці таксама можа быць звязана з парушэннем абменных працэсаў у арганізме, кроваазабеспячэння скуры галавы, няправільным доглядам валасоў. Акрамя таго, прычынамі ўзнікнення перхаці могуць быць недахоп вітамінаў А і групы В, стрэс, хваробы страўнікава-кішачнага тракта, а таксама грыбковыя захворванні. Як ні дзіўна, перхаць можа з'явіцца і ад... шампуню ад перхаці — калі ён няправільна падабраны.

Клеткі чалавечага арганізма пастаянна абнаўляюцца. Скура галавы не выключэнне. У норме ў здаровага чалавека клеткі скуры абнаўляюцца кожныя 25—30 дзён. І, дзякуючы прыродзе, гэта адбываецца з імі (клеткамі) не ўмомант, а паступова, так, што чалавек гэтага не заўважае. Іншая рэч, калі ў арганізме адбываецца збой, і тады, на жаль, гэты працэс становіцца прыкметным нават для навакольных. Перхаць — гэта адмерлыя клеткі. Калі ў вас перхаць — гэта сведчыць аб тым, што па нейкай прычыне тэрмін абнаўлення клетак скуры галавы скарачыўся да 6—7 дзён.

Спецыялісты сцвярджаюць, што на паскораны працэс абнаўлення клетак прамы ўплыў аказвае асобы дражджавы грыбок, які і ў "мірныя часы" суіснуе з намі, але пры любым збоі ў арганізме адразу ж актывізуецца, пачынае ўзмоцнена размнажацца і нават можа выклікаць запаленне.

Перхаць бывае тлустага і сухога тыпу.

Тлустая перхаць узнікае пры павышанай тлустасці скуры. Лускавінкі перхаці жаўтаватага адцення, буйныя, прамочаныя сакрэтам сальных залозаў, склейваюцца адна з адной, больш трывала ўтрымліваюцца на скуры, чым пры сухой перхаці, і могуць утвараць наслаенні. Валасы становяцца тлустымі, непрыемна ільсняцца, магчымы сверб. Апошні тлумачыцца тым, што тлушч закупорвае вывадныя пратокі сальных і потавых залозаў і раздражняе нервовыя канчаткі.

Сухая перхаць узнікае пры сухой скуры і часта суправаджаецца свербам. Часцінкі перхаці невялікія. Яны размяшчаюцца па ўсёй паверхні галавы або пераважна ў лобнай і цемянной абласцях, радзей — у выглядзе асобных ачагоў. Сухая перхаць узнікае пры паніжаным салаадзяленні, скура лёгка лушчыцца, валасы выглядаюць напудранымі, ломкія і могуць расшчапляцца на канцах. Перхаць сыплецца з галавы і бачная на адзенні.

Як правіла, перхаць — праява нейкіх парушэнняў у арганізме, трывожны сімптом. Таму, перш чым пачынаць барацьбу з ёю, пажадана пракансультавацца ў спецыяліста.

Лячэнне перхаці комплекснае. Важнае месца тут займаюць агульнаўмацавальныя мерапрыемствы: дастатковы сон, прагулкі на свежым паветры, заняткі спортам. Калі перхаць выклікана павышанай тлустасцю скуры, варта абмежаваць у рацыёне колькасць жывёльных тлушчаў, вугляводаў, кухоннай солі, салодкіх, вострых і вэнджаных страў, спіртнога. Ваша меню павінна быць багатым на агародніну, садавіну, кісламалочныя прадукты. Пры сухой перхаці, калі прычына яе — недахоп вільгаці ў эпідэрмісе (паверхневым слоі скуры), часам дастаткова аднавіць водны баланс у арганізме — а прасцей піць больш звычайнай вады, каб скура галавы зноў набыла здароўе.

З праблемай перхаці найбольш эфектыўна і зручна змагацца пры дапамозе лекавых шампуняў, якія прадаюцца ў аптэках. Іх асноўнымі актыўнымі кампанентамі з'яўляюцца супрацьгрыбковыя і антыбактэрыяльныя прэпараты. Акрамя таго, некаторыя лекавыя шампуні ўтрымліваюць экстракты траў, якія рэгулююць функцыі сальных залозаў, знімаюць раздражненне і сверб. Мыць галаву такім шампунем рэкамендуецца 2 разы на тыдзень на працягу месяца. Для прафілактыкі ж дастаткова прымяняць яго раз у два тыдні. Вельмі частае або працяглае выкарыстанне падобных сродкаў можа негатыўна адбіцца на здароўі скуры галавы.

Існуюць і іншыя лекавыя формы прэпаратаў, якія можна выкарыстоўваць у якасці вонкавых сродкаў пры лячэнні перхаці, напрыклад, аэразолі, ласьёны, што перашкаджаюць размнажэнню мікраарганізмаў на скуры, устараняюць смыленне, сверб і залішняе лушчэнне. Паміж лекавымі працэдурамі валасы варта мыць звычайным, лепш мяккім шампунем.

З фізіятэрапеўтычных метадаў пры лячэнні перхаці шырока прымяняюцца крыамасаж вадкім азотам і дарсанвалізацыя скуры валасістай часткі галавы. Крыамасаж выклікае звужэнне крывяносных сасудаў з наступным расшырэннем капіляраў, што значна ўзмацняе прыток крыві да месца ўздзеяння, у выніку чаго паляпшаецца сілкаванне валасяных цыбулін. Дарсанвалізацыю ажыццяўляюць пры дапамозе грабеньчатага вакуумнага электрода, якім расчэсваюць валасы плаўнымі рухамі. Гэта дабратворна ўплывае на кровазварот, абмен рэчываў і тонус сасудаў.

Пры любым відзе перхаці вельмі карысна рабіць масаж галавы. Апошні ўзмацняе прыток крыві да каранёў валасоў, што паляпшае сілкаванне валасянога покрыва, ачышчае скуру ад перхаці. Рабіць такі масаж зусім не цяжка: кожны вечар 10—15 хвілін масіруйце валасістую частку галавы падушачкамі пальцаў у розных кірунках. Масаж лепш пачынаць з расчэсвання валасоў масажнай шчоткай на працягу 2—3 хвілін.

Дастаткова эфектыўнымі ў барацьбе са "снегам" на валасах аказваюцца і натуральныя раслінныя сродкі. Напрыклад, пры сухой перхаці паспрабуйце ўціраць у скуру галавы сумесь абляпіхі з аліўкавым алеем (узяць у суадносінах 1:3, награваць на вадзяной лазні паўгадзіны). Рэкамендуюцца таксама маскі для валасоў з лапуховага, аліўкавага, кунжутнага алеяў: дастаткова проста ўцерці алей у скуру галавы, ухутаць ручніком, праз гадзіну валасы старанна прамыць.

Калі ж у вас тлустая перхаць, паспрабуйце мыць валасы цёплым настоем піжмы. Каб прыгатаваць яго, заліце 100 г кветак 3 л вады, трымайце на вадзяной лазні на працягу 10 хвілін, працадзіце. Альбо паспрабуйце змазваць скуру галавы 2—3 разы на тыдзень спіртавой настойкай календулы. Галаву ўхутваюць ручнікам і вытрымліваюць 30 хвілін. Затым змываюць цёплай вадой.

Добра ўмацоўвае карані валасоў і аднаўляе кровазварот лісце крапівы двухдомнай. Сумесь з 50 г здробненага лісця і 50 г карэнішча крапівы заліваюць 0,5 л сталовага воцату і 0,5 л вады, кіпяцяць на вадзяной лазні на працягу 30 хвілін. Працэджаным адварам масіруюць скуру галавы 1—2 разы на тыдзень.

Пазбавіцца ад перхаці могуць дапамагчы і натуральныя фарбавальнікі для валасоў: хна, басма, шалупінне цыбулі, рамонак аптэчны, шалупайка грэцкага арэха.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Дзякуй!

ЦЯПЕР З МАЙГО СЭРЦА ЗВАЛІЎСЯ КАМЕНЬ»

Я, Шаўлоўская Данута Вікенцьеўна, з «...Вогненнай вёскі» Янушкавічы, дзе 9 жніўня 1943 года было спалена 76 чалавек, у тым ліку 25 дзяцей — маіх сяброў, маіх аднагодкаў. Жыцці іх абарваліся, лічы, не пачаўшыся, страшна, трагічна...

А вось годна ўвекавечыць памяць аніяк не ўдавалася, пакуль раённая газета «Працоўная слава» не надрукавала мой артыкул «Забытая вёска», пакуль матэрыялы аб іх, спаленых, не стала збіраць «Звязда». Напісала тады і я. Мой матэрыял быў змешчаны 30 красавіка 2008 года, а ў канцы 2009-га выйшла кніга журналісткі Таццяны Падаляк «Нашчадкі вогненных вёсак». Кніга цікавая, патрэбная, бо сёння ў свеце ідзе фальсіфікацыя подзвігу народаў у Другой сусветнай вайне, а ў гэтай кнізе сведкі яе гавораць толькі праўду.

Пашчасціла мне быць і на прэзентацыі «Нашчадкаў...» у велічным будынку — Нацыянальным выставачным цэнтры «Белэкспа», нават выступаць. І добра, што мне далі слова першай, бо далей я, відаць, расчулілася б і не сказала б нічога.

Наступных выступоўцаў нельга было слухаць без слёз. І гэта добра, што там было шмат тэлекамер, шмат мікрафонаў, фотаапаратаў. Прадстаўнікі радыё, газет запісвалі нашы расказы, каб іх пачулі іншыя людзі, каб ведалі і помнілі.

Кожнаму ўдзельніку прэзентацыі аўтарка Таццяна Уладзіміраўна Падаляк падарыла кнігу з аўтографам.

Трэба сказаць, што афармленне яе адпавядае зместу: чорныя вокладкі, чырвоным напісана «Нашчадкі вогненных вёсак», а ўнізе бушуе полымя — так, як было ў жыцці.

Публікацыя гэтай кнігі ўвекавечыла памяць. У тым ліку — аб загінулых аднавяскоўцах, аб маіх сябрах-аднагодках. Чытаю яе і здаецца, што з майго сэрца зваліўся камень, які я насіла больш за 60 гадоў. Я ўдзячная Таццяне Уладзіміраўне, удзячная газеце, якая «выслухала» і захавала для наступных пакаленняў нашы споведзі...

Што да маёй, то калі б аб трагедыі вёскі я пісала цяпер, то канцоўка была б ужо іншай, лепшай! Бо цяпер у парку, які размешчаны паміж Пяршаямі і Янушкавічамі, пастаўлены помнікі кожнай вёсцы, спаленай разам з людзьмі, на тэрыторыі нашага сельсавета. А дапамог іх стварыць гаспадар нашай зямлі, старшыня СВК «Пяршаі 2003» Яўген Яўгенавіч Скрундзь.

Гэты парк мы называем нашай малой Хатынню. І гэта шчасце, што туды могуць прыйсці нашчадкі.

Д.В. ШАЎЛОЎСКАЯ,
в. Янушкавічы, Валожынскі раён.

РАСІЙСКІХ БІЗНЭСМЕНАЎ ЗАЦІКАВІЎ БЕЛАРУСКІ ПАЛАЦ

Чым рэгіёны Віцебскай вобласці могуць зацікавіць інвестараў? І наогул, наколькі выгадна рызыкаваць інвестарам, укладаючы свае грошы ў эканоміку Прыдзвінскага краю? Гэтыя пытанні карэспандэнт «Звязды» задаваў удзельнікам віцебскага міжнароднага інвестыцыйнага форуму.

— Сярод інвестыцыйных прапаноў нашага раёна — рэстаўрацыя сядзібнага дома ў гарадскім пасёлку Лынтупы. Палац Бішэўскага — гісторыка-культурная каштоўнасць XIX стагоддзя, — расказвае «Звяздзе» **старшыня Пастаўскага райвыканкама Віктар ГУТАРАЎ**. — Тут плануецца стварыць унікальны аб'ект турызму. Прыкладны памер інвестыцый — 3 мільярды рублёў. Таксама шукаем інвестара, каб у Паставах пабудаваць 3-зоркавы гатэль. Ёсць у нас і вельмі прывабныя прапановы па будаўніцтве аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу.

Інвестары не толькі прыглядваюцца, але і праяўляюць канкрэтны інтарэс да ўкладвання сваіх капіталаў. Напрыклад, расіян вельмі зацікавілі турыстычныя магчымасці нашага раёна. Зімой шмат турыстаў прыцягвае сядзіба Зюзі Паазерска-га, штогод усё больш прыезджых у старажытныя Паставы, іншыя населеныя пункты з багатай гісторыяй і традыцыямі.

Наконт інвестыцый у вытворчасць. На базе льнозавода плануецца арганізаваць вытворчасць шпагату і прадзіва з кароткага льновалакна. Прыватнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Завод Беліт» — рэзідэнт СЭЗ «Віцебск» шукае інвестара, зацікаўленага ў вырабе бытавых электрычных прыбораў.

— На тэрыторыі нашага раёна два заказнікі. Ёсць унікальнае возера — Белае Юхоўскае, у вадзе якога іоны срэбра. Многія спецыяльна прыязджаюць на возера, каб пакупацца ў ягоных «чароўных» водах. Расказваюць, што вада спрыяе лячэнню скурных захворванняў, — расказвае «Звяздзе» **намеснік старшыні Расонскага райвыканкама Аляксандр КАПШУЛЬ**. — 70 працэнтаў тэрыторыі займаюць лясы. Мы ў лідарах па колькасці так званых аграрных сядзібаў. Іх у нас дваццаць. Калі падлічыць, што ў кожнай летась спыніліся ў сярэднім па 550 чалавек, можна зрабіць выснову аб добрых перспектывах гэтага сектара турызму. Ёсць цікавая прапанова па адкрыцці санаторыя на базе закансерваванага санаторыя «Лясное».

У вёсцы Гарбачова інвестар мог бы стварыць «Дом рыбака» — сучасны комплекс для аматараў рыбалкі. Побач Расія. Цяпер шмат расіян прыязджаюць на адпачынак, і многія — «дзікунамі». А чаму б не ўкласці грошы ў вельмі прывабную турыстычную сферу? Ёсць прапановы па арганізацыі вытворчасці піламатэрыялаў і іншыя.

— Эканамічны крызіс прымусіў шукаць новыя падыходы ў вядзенні бізнэсу, новыя рынкі збыту, — расказвае «Звяздзе» **намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег МАЦКЕВІЧ**. — Форум дае магчымасць наладзіць кантакты, вывучыць на месцы інвестыцыйную прывабнасць вобласці.

— Таваразварот паміж нашымі краінамі пакуль што не на тым узроўні, якім ён можа быць, — расказвае **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Балгарыі ў Беларусі Захары РАДУКАЎ**. — Я ўпэўнены ў тым, што балгарскім бізнэсменам будзе цікава азнаёміцца з інвестыцыйным патэнцыялам Віцебскай вобласці. У краіне ў цэлым гарантуюцца самыя прывабныя ўмовы для інвестыцый.

— Польскія прадпрымальнікі ўжо не першы год укладваюць свае капіталы ў арганізацыю вытворчасці ў Беларусі, — расказвае **пасол Польшчы ў Беларусі Генрык ЛІТВІН**. — Спадзяюся, што па выніках работы форуму з'явіцца яшчэ больш сумесных прадпрыемстваў.

Дзелавыя людзі маглі выехаць у раёны Прыдзвінскага краю, каб на свае вочы ўбачыць тыя аб'екты, якія можна пераўтварыць у будучыя вытворчасці, больш пільна вывучыць нюансы інвеставання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фота БЕЛТА

Іудзеі Беларусі і ўсяго свету адзначылі 28 лютага самае вясёлае свята іудаізму — Пурым.
На здымку: **святкаванне Пурыму ў гродзенскай яўрэйскай суполцы.**

Супергалоўны бухгалтар працуе ў 25-й

Лепшых бухгалтараў па выніках 2009 года выбралі на мінулым тыдні ў рамках конкурсу «Лепшы галоўны бухгалтар года». З 500 удзельнікаў першага туру да фіналу дайшлі толькі 45 прэтэндэнтаў на званне самага-самага. Ужо з іх, пасля рашэння прыкладных бухгалтарскіх задачак за 25 хвілін, і вызначыліся 8 пераможцаў. А званне «Супергалоўны бухгалтар 2009 года» атрымала Вольга КАЗАРЭЗ, якая працуе галоўным бухгалтарам у 25-й цэнтральнай раённай паліклініцы Маскоўскага раёна горада Мінска. Ёй удалося з вялізным адрывам перайграць калегаў у нешта падобнае да «Сваёй гульні», але на бухгалтарскую тэматыку.

Як адзначаюць арганізатары конкурсу, сярэдні працоўны стаж фіналістаў — 10 гадоў, але ў фінале ўдзельнічалі і два маладыя спецыялісты, якія працуюць менш за 2 гады. Амаль усе ўдзельнікі (97,8%) маюць вышэйшую адукацыю, і самае цікавае, што пры назве конкурсу «Лепшы галоўны бухгалтар» з 45 фіналістаў толькі 32 працуюць непасрэдна галоўнымі бухгалтарамі, а астатнія займаюць пасады намеснікаў, эканамістаў, аўдытараў і простых бухгалтараў.

Наша газета пацікавілася ў **Ніны Гетман, старшыні журы конкурсу, галоўнага рэдактара часопіса «Галоўны бухгалтар»** чым адрозніваецца сёлетні конкурс ад мінулых.

— Сёлета трохі больш удзельнікаў, і вельмі прыемна, што маладзее аўдыторыя — прычым у маладых таксама высокі ўзровень ведаў. Нас гэта цешыць, бо мы разумеем, што расце дастойная змена.

— Мінулы конкурс праходзіў у нашай краіне, калі можна так сказаць, пад сцягам лібералізацыі. Што змянілася ў пункту гледжання бухгалтара?

— Так, сапраўды, гэта быў год лібералізацыі, з-за чаго вельмі змянілася заканадаўства. Таму для бухгалтара год быў вельмі цяжкі. Напрыклад, пачала дзейнічаць Асаблівая частка Падатковага кодэкса — гэта добра, што з'явіўся такі дакумент, але гэта новыя правілы, новы парадак. І ўсё гэта кладзецца на плечы бухгалтара. Я мяркую, што па меры вывучэння новага заканадаўства бухгалтары адчуюць, лягчэй стала працаваць ці не.

— Наколькі праца бухгалтара адказная і складаная?

«Супергалоўны бухгалтар 2009 года» Вольга Казарэз. Яна працуе бухгалтарам з 1996 года — спачатку ў раённым аддзеле аховы здароўя, а цяпер — у 25-й цэнтральнай раённай паліклініцы Маскоўскага раёна Мінска. Перамагчы дапамагло тое, што два гады таму яна скончыла БДЭУ, а нядаўна дапамагала сястры пісаць дыплом.

— Што наконт складанасці, то як і шмат якія іншыя, а вось адказная — сапраўды. Гэта адказнасць, якая не праходзіць з заканчэннем працоўнага дня — яна ідзе за табой шмат гадоў. Недарма кажуць, што галоўны бухгалтар — не прафесія, а лад жыцця. Гэта чытанне спецыяльнай літаратуры ў вольны час, бясконцыя размовы пра працу ў кампаніі калегаў і гэтак далей...

— Нядаўна агучвалася прапанова ўстанавіць прафесійнае свята для бухгалтара афіцыйна ў нашай краіне. Наколькі рэальна патрэбна такое свята?

— Мы лічым, што такое свята павінна быць. Нас, бухгалтараў, вельмі шмат, у нас даволі складаная праца, і такое свята аб'яднае людзей, пакажа, што гэтую прафесію паважаюць, што яна вельмі важная для дзяржавы. Так што свята абавязкова павінна быць!

Павел БЕРАСНЕЎ.

Пераможцы конкурсу «Лепшы галоўны бухгалтар 2009 года»:

Намінацыя	Пераможца	Арганізацыя
Супергалоўны бухгалтар	**Вольга Казарэз**	25-я цэнтральная раённая паліклініка Маскоўскага раёна Мінска
Лепшы галоўны бухгалтар у гандлі	**Віталь Ігнатовіч**	ГЗАА «Святлатэхніка» (Гродна)
Лепшы галоўны бухгалтар банка	**Алена Асіпенка**	Белзнешэканамбанк (Гродна)
Лепшы галоўны бухгалтар у прамысловасці	**Сяргей Спіраеў**	ГЗАА «Святлатэхніка» (Гродна)
Лепшы галоўны бухгалтар у будаўніцтве	**Аляксей Грынюк**	ПУП «Цэнтр распрацоўкі і будаўніцтва» (Мінск)
Лепшы рэвізор	**Валянцін Ягельніцкі**	індывідуальны прадпрымальнік (Ваўкавыск)
Лепшы галоўны бухгалтар у сельскай гаспадарцы	**Надзея Крыцкая**	сялянская фермерская гаспадарка «ВалБіК» (Лепель)
Лепшы галоўны бухгалтар у бюджэтнай арганізацыі	**Вольга Казарэз**	25-я цэнтральная раённая паліклініка Маскоўскага раёна Мінска
Лепшы галоўны бухгалтар у транспартнай галіне	**Іна Лобус**	«ТМ архітэктара Ільінова» (Віцебск)

ЗЕМЛЯТРУС З ЧЫЛІ «ДАКАЦІЎСЯ» І ДА НАС

Уноч на суботу ўзбярэжжа Чылі здрыганулася ад серыі падземных штуршкоў. У эпіцэнтры іх сіла дасягала 8,8 бала па шкале Рыхтэра. Згодна з першымі звесткамі, у выніку загінула больш за трыста чалавек, а падземныя штуршкі адчуваліся не толькі ў суседняй Аргенціне, але і за многія тысячы кіламетраў, у тым ліку і ў Беларусі.

— Гэта сапраўды так, — пацвердзіў «Звяздзе» дырэктар Цэнтра геафізічнага маніторынгу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аркадзь АРОНАЎ. — Аднак людзі іх не адчулі, адгалоскі землятрусу былі зафіксаваныя апаратурна або інструментальна. Нашы станцыі, а ў Беларусі іх усяго шэсць, могуць такім чынам фіксаваць найбольш моцныя землятрусы ў тым ліку па ўсім зямным шары. Гэтыя звесткі потым перадаюцца ў міжнародныя цэнтры звестак для складання поўнага «малюнка» таго ці іншага землятрусу. Наша краіна, напрыклад, супрацоўнічае з трыма такімі міжнароднымі цэнтрамі, што размешчаны ў Расіі, Францыі і Англіі.

Тыя землятрусы, якія людзі могуць адчуць праз зрухі зямной паверхні або хістанні будынкаў, так і называюцца — адчувальнымі. Беларусы былі сведкамі такіх зямных узрушэнняў у апошні час неаднойчы. Можна, напрыклад, прыгадаць, землятрус 21 верасня 2004 года ў Калінінградскай вобласці. «Паколькі ад эпіцэнтра была невялікая адлегласць — каля 310 кіламетраў, у Гродзенскай вобласці ён адчуўся сілай каля чатырох балаў, у Мінску ўжо пачаў затухаць — да трох балаў», — прыгадаў Аркадзь Аронаў. Добра можам мы адчуваць і землятрусы, што адбываюцца ў Румыніі, у Карпатах. Так было, напрыклад, у 1940, 1977, 1986 гадах. На тэрыторыі сучаснай Беларусі першыя дакументальныя згадкі пра землятрус датуюцца 1602 годам. Больш моцныя падземныя штуршкі адчуваліся і пазней — у раёне Магілёва ў 1893-м і 1896 гадах. Праз некалькі гадоў быў буйны землятрус пад Барысавам, а ў 1908 годзе жыхары адчулі адгалоскі Гудагайскага землятрусу. Канешне, усе яны не мелі вялікай разбуральнай сілы, тым не менш факт застаецца фактам: падземныя штуршкі могуць быць і ў нас. Таму фіксацыя і вывучэнне землятрусаў, міжнародны абмен інфармацыяй мае самае практычнае значэнне. Такія звесткі абавязкова кладуцца ў аснову пры праектаванні плацінаў, АЭС, вышынных шматпавярховікаў, папярэджанні надзвычайных сітуацый і іншага.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Сіньхуа-БЕЛТА

Землятрус У Чылі стаў буйнейшым за апошнія 60 гадоў.

Фелікс ШКІРМАНКОЎ

«ШУРУЙ, ДОКТАР!»

Фелікс Шкірманкоў, былы партызан, салдат, інжынер-геолаг, пісьменнік. Увогуле свет і жыццё да донца зведаў і сябе паказаў. Перш за ўсё як чалавека, барацьбіта, змагара, вартага свайго мужнага, гераічнага пакалення. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, інвалід вайны II групы. Чатыры разы паранены. Узнагароджаны ордэнамі «Чырвонага Сцяга», двума ордэнамі «Айчыннай вайны» I ступені, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» I ступені, «За перамогу над Германіяй». Жыве ў былым мястэчку Прапойск — цяпер горад Слаўгарад. 27 мая будзе адзначаць 83-ю гадавіну, як упершыню ўбачыў гэты свет і абвясціў яму, што нарадзіўся. Свой допіс нам ён назваў апавяданнем. Хай так яно і будзе, бо што такое апавяданне, як не аповед пра сваё ці чужое жыццё. А яно ў Фелікса Уладзіміравіча вялікае і светлае, як і ў кожнага, з кім ён пачынаў таптаць сваю жыццёвую сцяжынку.

Віктар КАЗЬКО

Пра гэту гісторыю я даведаўся ад былога намесніка камандзіра партызанскай брыгады імя Даватара па разведцы Паўла Паўленкі.

Адбылося гэта на сустрэчы былых партызан з нагоды 30-годдзя з дня ўтварэння брыгады, у лесе, дзе ў тыя гады знаходзілася наша партызанская база. А на наступны дзень я пазнаёміўся і з чалавекам, пра якога напярэдадні расказаў мне Паўленка.

Яшчэ не ўпэўнены, што гэта менавіта ён, я звярнуў увагу на сярэдняга росту хударлявага мужчыну на самаробным драўляным пратэзе: ён ішоў, перавальваючыся як качка.

Падышоў да нас, павіншаваў са святам і на пытанне Паўленкі «Чаму спазніўся?» весела адказаў:

— Ці ведаеш, каханенькі, што прыехаў цудам, лічы — пашанцавала! Сабачка, трасца яму ў бок, украў мой «масол» — пастукаў ён па дзеравяшчы, — дык амаль гадзіну жонка з унукамі шукалі! А ён зацягнуў у лапухі за хлеў, уладкаваўся там і грызе! Вось паглядзі — амаль што паўнагі адгрыз! — паказаў ён на сляды сабачых зубоў на дзеравяшчы.

Ён мне адразу спадабаўся. Ад яго зыходзіў здаровы народны гумар, дабрыня. Прашу яго расказаць, як яму партызанскі доктар рабіў аперацыю, і чую ў адказ:

— Ат, нічога цікавага! Адрэзаў паўнагі — і ўсё! — весела смяецца і дадае: — Вось ужо трыццаць гадоў прайшло, а новая ніяк не расце, хоць кожным ранкам аглядаю: ці не пусціла парасткі?

Агульнымі намаганнямі прымусілі ўсё ж яго расказаць. У той жа вечар у гатэлі я ўсё дакладна занатаваў, бо сапраўды выпадак быў далёка не радавы.

...22 сакавіка 1944 года атрымаў Пётр Норка, кіраўнік моладзевай антыфашысцкай падпольнай групы ў вёсцы Талуць, баявое заданне ад камандавання брыгады — узарваць лесапілку ў мястэчку Куранец. У апошні час акупанты на гэтай лесапілцы пачалі вырабляць чыгуначныя шпалы. Зацікавіліся гэтым партызанскія разведчыкі і даведаліся, што гэтыя шпалы патрэбныя для будаўніцтва новай чыгуначнай лініі.

Атрымаўшы заданне, Норка абмеркаваў яго з удзельнікамі аперацыі. Згадзіліся, што трэба прабірацца ў Куранец у нядзелю, калі з навакольных вёсак сяляне едуць туды на базар.

Так і зрабілі. Схавалі пад сенам у санях тол, а зверху паклалі кошык з яйкамі, некалькі кавалкаў сала і глечык з мёдам, каб было бачна, што вязуць тое-сёе на продаж. Зброю таксама схавалі пад сенам, але так, каб у выпадку небяспекі яе можна было б лёгка дастаць. Селі ўтрох і паехалі.

Не даехаўшы да Куранца, у вёсцы Кузьмічы трапілі ў засаду. Хлопцы ўмомант выхапілі аўтаматы і, адстрэльваючыся, павярнулі каня. Калі ўжо паверылі, што пранесла, кулямётная чарга дагнала іх. Пераскуліўся праз галаву конь, на яго звалiліся сані. Нема крыкнуў Пятрок ад страшэннага, які пранізаў яго пяткі да калена, болю ў левай назе. Хлопцы падхапілі на рукі параненага.

Ім яшчэ раз пашанцавала: побач апынуліся сані, што ехалі насустрач. Ездавы, пачуўшы стральніну, пачаў крута разварочвацца, і сані таксама перакуліліся.

Не было часу штосьці тлумачыць гаспадару, паставілі сані на палазы, паклалі ў іх параненага, самі скокнулі і пагналі прэч, крыкнуўшы: «Забярэш каня па дарозе ў лесе!».

Калі агледзелі параненага, убачылі, што куля ўвайшла ў пятку, а выйшла каля калена, ушчэнт раструшчыўшы косці. Патрэбна была неадкладная аперацыя. Партызанскі хірург знаходзіўся ў лагеры брыгады імя Варашылава.

Агледзеўшы Петрака, хірург Волах адкрыта сказаў:

— Патрэбна ампутацыя і без прамарудження... — ён змоўк, падбіраючы словы. — Але прыйдзецца табе крыху пацярпець, будзе балюча, але тут ужо нічога не зробіш...

Пятрок аблізнуў засмяглыя вусны, паспрабаваў усміхнуцца.

— Калі інакш нельга, дык што ж — пацярплю, нічога...

Не сказаў толькі доктар, што крыецца за словам «трэба крыху пацярпець, будзе балюча». Не было ў доктара ніякіх абязбольвальных сродкаў. Увесь хірургічны інструмент складаўся са скальпеля і... слясарнай пілы.

Пятрок вінавата ўсміхаўся, калі яго ўкладвалі на стол у зямлянцы, а чатыры «асістэнты» сталі па баках.

Волах падышоў да Петрака, злёгку паляпаў яго па плячы, падбадзёрваючы, і ціха сказаў:

— Ну, браток, дапамажы мне — пацярпі, а я паспрабую ўсё зрабіць як мага хутчэй!

Пятрок згодна кіўнуў галавой і раптам папрасіў:

— Доктар, дайце шкляначку першачку, а то, можа, болей і не давядзецца...

Волах моўчкі падышоў да невялікай шафы, што вісела на сцяне, дастаў бутэльку і наліў з яе поўную шклянку моцнага, двайной перагонкі самагону, што выкарыстоўваў замест медыцынскага спірту. Падаў шклянку Петраку. Той прыўзняўся, зрабіў глыбокі ўдых, выдыхнуў і, не адрываючыся, выпіў да дна. Працягнуў парожнюю шклянку доктару, абцёр зваротным бокам далоні вусны, паклаў галаву на стол, парухаўся, укладваючыся ямчэй, і рашуча сказаў:

— Парадак! А цяпер шуруй, доктар!

Першым не вытрымаў адзін з «асістэнтаў». Як толькі пачуўся скрыгат пілы, якая перапілоўвала костку, ён збялеў і споўз на падлогу.

Пятрок ляжаў з заплюшчанымі вачыма, сцяўшы сківіцы. І толькі па кроплях поту, што гарохам высыпалі на лбе, можна было ўявіць яго нечалавечы боль. Далечваўся ён у партызанскім шпіталі. Неўзабаве Чырвоная Армія вызваліла гэтыя мясціны, і запрасіўся партызан на хутар да бацькі. Надышла восень. Выйшаў першы раз на драўлянай назе з хаты, уздыхнуў на поўныя грудзі, агледзеўся, і так яму зрабілася самотна, што ніякай моцы няма!

Мужыкоў на вёсцы адзін-два — і лічыць няма каго. Ды і тыя, што былі — вайной мечаныя, а гаспадарку зруйнаваную ўздымаць трэба.

Накіравалі партызана на пярэдні край мірнага фронту — старшынёй Талуцкага сельскага савета. Цяжкі быў час. З чаго пачынаць? З кім? Забеспячэнне, лічы, ніякага, зрэдку ў каго газавая лямпа з цэлым шклом захавалася, усё больш «кацюшы» — капцілкі са снарадных гільзаў. Неўзабаве ўтварылі калгас. І цяпер ужо не Петрака, а Пятра Антонавіча абралі старшынёй. Нялёгка яму было кіраваць гаспадаркай. Тэхнікі ў той час, вядома, ніякай. Былі б ногі ў парадку, дык у сядло — і ўперад! Ды і ведаў спецыяльных, лічы, ніякіх.

І папрасіў праз тры гады — гэта значыць, у 1948, калі ў вёску вярнуўся з арміі хто-ніхто з рукамі і нагамі, пасаду ніжэйшую. Уважылі, пайшлі насустрач і даручылі жывёлагадоўчую ферму.

Васямнаццаць гадоў адпрацаваў Пётр Антонавіч на гэтай пасадзе. Але час не стаіць на месцы. Выйшаў на пенсію, а ў хаце не сядзіцца — усё жыццё сярод людзей. Пайшоў працаваць вартаўніком. Так і працуе ў сябе на радзіме ў вёсцы Талуць вартаўніком у калгасе.

Здараецца, шкадуючы яго, хтонебудзь пачне спачуваць: «І што ты здзекуешся з сябе? Няўжо ж ты не заслужыў, каб спакойна адпачыць? Няхай цяпер маладзейшыя папрацуюць...».

Ён не згаджаецца і адказвае: «Ніяк не магу! Кіну працаваць — і канец мне, доўга не працягну. Пакуль ад мяне якая-ніякая карысць людзям ёсць — буду працаваць».

У гэтым ён увесь, як на далоні — інвалід Вялікай Айчыннай.

...Мы сядзелі на беразе ласкавай Вузлянкі, успаміналі мінулыя гады свайго партызанскага юнацтва, сваіх сяброў, што загінулі ў баях. Над лугам белым абрусам лажыўся туман. Ганна Андрэева ціха заспявала:

Ой, туманы мае, растуманы.
Ой, радныя палі і лясы...

І над прыціхлай рэчкай, над лесам, дзе быццам казачная птушка Фенікс, узняліся нашы зямлянкі, лунала партызанская песня, вяртаючы нас у тыя трывожныя гераічныя дні. І мы зноў не з сівымі скронямі ветэраны, а бадзёрыя, поўныя моцы юныя народныя мсціўцы...

Сіла слова

«НА ЎСЁ ДОБРАЕ І ЗДАРОВАЕ...»

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 5, 11, 29 і 30 снежня 2009 г.)

Спрадвеку сцвярджалі і тое, што роды для любой жанчыны, нават самай здаровай і выносліва й, не праходзілі бясследна. Яна ўсё адно вымушана была потым пакутаваць ад усялякіх хваробаў. Каб такога не здарылася, старалiся загадзя чытаць разнастайныя папераджальныя замовы, дзе хваробы і запалохваліся, і спальваліся, і адсылаліся ў балоты ды цяжкадаступныя мясціны. «Залатнік, залатнічок, залаценечкі ражок! Сядзь на сваім месцы, як пан у крэсле!» («Ад жаночых захворванняў», в. Дабраслаўка); «У лазні вадзіць рукой па голым жываце, амываць цёплай вадой і пры гэтым абавязкова прамаўляць: «Арына, Марына, у каліну хадзіла. Каліну ламала, у рабы божай (імя) хваробу выбівала. Усё здымі, вадой спалашчы: бабкіны, дзедкіны, цёткіны, дзядзькіны, бацькіны, маткіны злобныя шэпоткі, злыя размовы, ведзьміны загаворы. Амінь. Амінь. Амінь» («Ад жаночай хворні», в. Ласіцк).

Продкі, навучаныя суровым жыццём, рознымі здарэннямі, рыхтаваліся заўсёды сустракаць любую бяду, каб быць напагатове, каб яна не заспела іх знянацку. Наіўнае меркаванне, але, тым не менеі, яны стараліся абавязкова прытрымлівацца такога пункту гледжання на ўсялякія праблемы. Кожнаму думалася, што раз я папярэдзваю хваробу ці нейкае непажаданае здарэнне, то яно ўжо толькі ад гэтага страціць найбольш страшныя свае ўласцівасці, не будзе так даймаць у будзённым жыцці. Не паважалі, баяліся ворагаў, то і іх закліналі страшнымі магічнымі словамі. «Андрэй-хрэсціцель, краста насіцель. Крастом красціўся, крастом наградзіўся. Каб у майго ворага зубы анямелі, вочы асталбянелі, усе жылы спыніліся. Бацюшка-ваявода, бяры ключ, замкні лютага врага на замок» («Замова ад усялякіх врагоў», в. Пінкавічы); «Гэта гаворыцца перад тым, як выходзіш з хаты ў дарогу, няхай сабе і самую блізкую. Прагаворваецца тры разы. Прасвятая Багародзіца з варот выйшла, у прыполе сваім пясок жоўты нясла. Яна тым жоўтым пяском мне сцежачку ўсыпала, злыя сілы, злых людзей, ворагаў маіх ад мяне адганяла. Мне затое здароўе і добрую славу прынала. Амінь» («На добрае ўсё і на шчаслівую дарогу», в. Чухава); «На моры, лукаморы, стаіць дуб зялёны. На том дубе сядзіць чоран воран, дзюбкай выбірае, кіпцямі выдзірае, на сіняе мора хваробы пускае. Рабу божаму (імя) ад галавы, ад рук, ад спіны помашчы давае. Амінь» («На ўсё самае вязучае і добрае», в. Ботава); «Ішоў сам Бог гарою, Маць Прачыста — другою. Сышліся на сінюю гару, кнігі там чыталі, рабы Божай (імя) ад галавы, ад ног, ад рук, ад спіны помашчы давалі. Амінь» («Ад розных хваробаў і напасцяў», в. Камень); «На моры, на лукаморы ляжыць камень. На тым камні ляжыць мядзведзь. Ляжыць-паляжае, нарадку Божую выбірае, чорным языком убірае, чорным хвастом умятае, на мхі, на гнілыя дзярэўя высылае. Там вам быць, гнілыя дзярэўя палажыць, у раба Божага (імя) не быць, па касці не хадзіць, крыві не піць, сэрца не таміць, пакуль бабка прыступала і помачы давала, і нарадку ўгаварывала: калючую, балючую, надзіўную прыгаворную. Тут табе не быць. Амінь! (чытаць тры разы ад усяго) («Замова ад усяго, калі нават сум на душы і сэрцы», в. Дабраслаўка); «Як звёзды ад буйнага ветру памеркнуць, так бы ў майго супастата сэрца і вусны б у яго памерклі; і як мёртвы анямеў і не змог бы процію мяне глаголяці, і як мёртвы на свет не глядзіць, так бы й той супастат не змог на мяне глядзець раба Божага (імя). Амінь» («Загавор на кожны дзень», в. Пучыны); «Загаварываю, загаварываю, раба Божага (імя). З пупочка, з жываточка, з касцей, з машчэй, выйдзі на гнілыя балоты-калоды ды на цёмныя лясы. Ідзі на моры, там табе сталы засланыя, там кубкі наліваныя, там табе жыць і гуляць, і балезні не відаць. Амінь» («Ад усяго і ад хваробаў», в. Бярозавічы).

Некаторыя з замоў нават немагчыма канкрэтна класіфікаваць, бо самі інфарматары называлі такую хваробу, якой у рэальным жыцці нам сустракаць (нават чуць пра яе!) не даводзілася. Тым не меней, такія творы таксама маюць права на паўнавартаснае існаванне. «Ляцеў чоран-воран. У таго чорана-ворана тры дзевяць дзюбак, тры дзевяць крылляў, тры дзевяць кіпцяў (рабы Божай) здымаць урокі. Несудзімыя прыстрэкі, браты ўрочныя, прыстрэшныя, прысмешныя, прыгаворныя, прыдуманыя, прыгаданыя, дзявоцкія, хлапецкія, парабоцкія, жаноцкія. Дзюбкамі раздзяўбаць, крыльцамі размахаць, кіпцямі разграбаць, а крыллям ляцець на мхі, на балоты, на ціхія лозы. Амінь. Амінь. Амінь» («Замова ад прыстрэка», в. Дубнавічы); «Ішоў Ісус Хрыстос цераз калінавы мост. Трасціна паламалася, угаль і ятрань перастала на гарэ гарэць. Сёння нядзеля, ні пятніца. Няхай скула не ятрыцца! (Замову паўтарыць тры разы і абавязкова хрысціцца пасля кожнага разу)». («Замова ад ятрані», в. Лышча); «Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Мацеры пакланюся, усяму свяшчонаму, усяму хрышчонаму, каб ліхачышчэ гаварыці. Ішоў чалавек чорнаю дарогаю, з чорным целам, з чорнай шкураю, з чорнымі косамі, з чорнымі вачыма, з чорнымі вейкамі, з чорнымі бровамі, з чорным ілбом, з чорным носам, з чорнымі ноздрамі, з чорным ротам, з чорнаю барадою, з чорнымі губамі, з чорнымі зубамі, з чорнымі дзяснамі, з чорным языком, з чорнымі шчокамі, з чорнымі нагамі, з чорнымі пальцамі, з чорным жыватом, з чорным пупам, з чорнымі грудзямі, з чорнаю шапкаю, з чорнаю світкаю, з чорнаю сарочкаю, з чорнымі штанамі, з чорнымі пугавіцамі. Ішоў чорнага дуба рубаці. Чорны дуб рубаў, чорныя трэскі адляталі ад свяшчонага, крышчонага (імя) ліхачышчэ адганялі. Амінь» («Шэпт супраць ліхачышчы, чорнай балезні», в. Дабраслаўка); «Гаварыць тры разы да заходу сонца і дзьмуць пры гэтым на хворага: «Госпаду. Первым разам! Госпаду, познім часам! Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся, усім святым апосталам — таксама. Стань, Госпадзі, на помач, Прачыстая — на паратунак. Шла Мацер Прачыстая па полю чыстаму. Несла Ісуса Хрыста ў прыполе, благавешчанскай шоўкавай рызай пакрывала. З благавешчанскай шоўкавай рызы каплінка ўпала, з раба Божага (імя) чорную балезнь сцірала, змывала, у сіняе мора сплаўляла. Ляг жа ты, чорная балезнь, у мора на дно, а ў раба Божага (імя) не бываць, крыві не гадзіць, касцей не ламіць. Сходам меняйся мой дух на Гасподні. Амінь» («Замова ад балезней», в. Чухава); «Стаіць дуб, на тым дубе — сук. На суку сядзіць чоран-воран, залатым клювам дзяўбець у буйную галаву, у шчырае сэрца, у рукі, у ногі. Ідзі, бес праклятый, на мхі, на балоты! Там табе гнілую калоду паядаць, у рабе Божай (імя) не бываць. Амінь» («Замова ад усяго», в. Пагост-Загародскі); «Первым разам, добрым часам, Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай пакланюся. Вячэрняй зары папрашу: Зоры-заранічкі, Божыя памашчнічкі, прыдзіце, памажыце, рабе Божай Вользе прыстрэк гаварыце. На моры, на лукаморы стаіць дуб. На 12 какатоў, на 12 варатоў, на іх сядзіць 12 ангелаў. Станьце вы да помачы, прыступіце, рабе Божай прыстрэк гаварыце: прыстрэчны, прыгаворны, ветраны, калючы, балючы. Тут табе не хадзіць, касцей не ламіць. Галоўкі не крышыць. Я з словам, Госпадзь з помаччу. Палюбі мой дух (тры разы). Амінь» («Замова ад прыстрэку», в. Ліпнікі); «Цёмная ночка начніц нарадзіла, малому дзіцяці моц нарабіла. Яснае сонейка дзень пачынаець, начніц праганяець, дзянніц насылаець, боль сунімаець. Шух у печ! Шух у печ! Шух у печ!» («Замова ад усіх дзіцячых хваробаў», в. Клятная); «Ехаў Ягорый на буланым кані, асвабадзіў царыцу ад уроку, асвабадзі раба Божага ад усякай болі» («Ад болі», в. Мокрая Дуброва); «Свацечка, галубачка, прашу ж вас, каб не было майму дзіцяці журбы ў вас. Каб не стаялі цёмны ночкі пад акном, каб не ўціралa дробныя слёзачкі рукаўком. Ой, каб не была ды паветачка хатачкай. Ой, каб не была ды суседачка матачкай. Дай добры лёс, пазбаў ад хваробаў. Амінь. Амінь. Амінь» («Замова, каб не балелі дзеці і дарослыя, каб усё добра было», в. Сташаны).

Намі запісаны і традыцыйныя замовы. Мы маем на ўвазе — замовы ад агульнавядомых хваробаў, якія нам даводзілася найбольш часта фіксаваць і ў іншых рэгіёнах рэспублікі. Напрыклад, ад

МАБІЛЬНЫ ТЭЛЕФОН СУПРАЦЬ РАБАЎНІКОЎ

Злачынцы, якія напалі на адзінокага старога і скралі яго зберажэнні, затрыманыя ў Магілёве міліцыяй.

Два мужчыны, якія нідзе не працавалі, але ўжо мелі крымінальны вопыт, 17 лютага ўварваліся ў дом 73-гадовага магілёўскага пенсіянера. Спачатку яны пагрукалі ў дзверы, але асцярожны гаспадар не адчыніў незнаёмцам. Тады нянрошаныя візіцёры выламалі дзверы і сталі патрабаваць у старога грошы. Мужчыны збілі яго, звязалі і забралі 560 тысяч рублёў. У хаце не было тэлефона, і пакуль выклікалі на дапамогу міліцыю, злачынцы даўно збеглі.

Аднак праз некалькі дзён вярнуліся, каб зноў пажывіцца. Але напужаны нападам гаспадар паспеў падрыхтавацца і набыў сабе мабільны тэлефон. Пакуль рабаўнікі ламалі дзверы, прыехаў нарад міліцыі. Затрыманы 42-гадовы магілёвец і 41-гадовы жыхар Клімавіцкага раёна. А 22 лютага супраць іх распачата крымінальная справа.

Алена КАЗЛОВА.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ
«ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 2 сакавіка па 30 чэрвеня 2010 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2010 года.

2. Арганізатар Гульні — Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» (далей — Арганізатар), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — установы «Рэдакцыя газеты «Звязда» і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ (руб.)	Усяго з ПДВ (руб.)
1.	Электрачайнік FA-5481	7	53 544	374 808
2.	DVD-прайгравальнік “Віцязь” 689, г. Віцебск	7	142 700	998 900
3.	Тэлевізар “Віцязь” 54 CTV 760-7, г. Віцебск	7	337 300	2 361 100
4.	Мікрахвалевая печ Daewoo KOR -6335 A	1	219 384	219 384
5.	Кухонны камбайн Braun K 600	1	349 874	349 874

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 4 304 066 (Чатыры мільёны трыста чатыры тысячы шэсцьдзесят шэсць) беларускіх рублёў.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2010 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2010 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з’яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Рэдакцыі ў перыяд падпіснай кампаніі на другі квартал або першае паўгоддзе 2010 года выразаная з газеты запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая друкуецца ў газеце «Звязда» да двух разоў на тыдзень у перыяд з 2 сакавіка па 7 красавіка 2010 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, або адксеракапіраваныя, а таксама карткі, якія паступілі ў рэдакцыю пасля 9 красавіка 2010 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Здановіч Уладзімір Аляксандравіч — намеснік галоўнага рэдактара ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда» — старшыня Камісіі;

члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — намеснік начальніка ўпраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — загадчык аддзела пісьмаў установы «Рэдакцыя газеты «Звязда»;

Прус Таццяна Віктараўна — вядучы рэдактар тэхнічны ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда»;

Дзевойна Алена Уладзіміраўна — рэдактар юрыдычнага аддзела ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда».

10. Камісія кіруецца ў сваёй дзейнасці рэгламентам (раздзел V гэтых Правілаў).

11. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. РЭГЛАМЕНТ РАБОТЫ КАМІСІІ

12. Камісія ажыццяўляе кантроль за захаваннем вызначаных правілаў правядзення рэкламнай гульні, вызначае пераможцаў Гульні, якія выйгралі прыз, разглядае скаргі і спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе правядзення Гульні.

13. Пасяджэнні Камісіі вядзе старшыня. Пасяджэнні Камісіі з’яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці членаў з яе зарэгістраванага складу.

14. Члены Камісіі абавязаны: прымаць удзел у пасяджэннях Камісіі, забяспечваць у ходзе Гульні адпаведнасць парадку яе правядзення гэтым Правілам, вызначаць пераможцаў Гульні, якія выйгралі прызы, прымаць удзел у разглядзе скаргаў удзельнікаў пры іх наяўнасці, падпісваць пратаколы пасяджэнняў Камісіі.

15. На пасяджэнне Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца ўдзельнікі Гульні, прадстаўнікі незалежных арганізацый.

16. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з’яўляецца вырашальным.

17. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

VI. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

18. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 13 красавіка 2010 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

19. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

20. Спачатку разыгрываюцца асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска па адным электрачайніку, DVD-прайгравальніку і тэлевізару.

У сувязі з тым, што Мінская вобласць стабільна забяспечвае найвялікшую колькасць падпісчыкаў, для гэтага рэгіёна дадаткова разыгрываецца адна мікрахвалевая печ.

21. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

22. Для розыгрышу кухоннага камбайна ўсе астатнія карткі ўдзельнікаў, па якіх не былі выйграны прызы, змяшчаюцца ў адну скрыню і старанна перамешваюцца.

Вызначэнне пераможцы адбываецца ў парадку, устаноўленым пунктам 21 гэтых Правілаў.

23. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 21 красавіка 2010 года ўключна ў газеце «Звязда».

Арганізатар у тэрмін да 23 красавіка 2010 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VII. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

24. Умовай выдачы прызоў з’яўляецца прад’яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2010 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад’явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2010 года з’яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад’яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

26. Дастаўка і ўручэнне прызоў ажыццяўляецца Арганізатарам Гульні ў тэрмін да 30 чэрвеня 2010 года ўключна з папярэднім паведамленнем аб канкрэтнай даце дастаўкі праз публікацыі ў газеце «Звязда».

Пераможцы ў тэрмін да 30 чэрвеня 2010 года могуць самастойна прыехаць па прызы, якія будуць ім выдадзены ў памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён.

Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў за атрыманнем прыза, Арганізатар не аплачвае.

27. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

28. Пасля 30 чэрвеня 2010 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VIII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

29. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

30. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, лісты і інтэрв’ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв’ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

31. Правілы правядзення рэкламнай гульні “Падпішыся на «Звязду» да пачатку рэкламнай гульні апублікоўваюцца сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

32. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 19 68.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 1639 ад 26.02.2010 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

ГАРАСКОП СТРЫЖАК
НА САКАВІК 2010 ГОДА

2 сакавіка. Калі верыць усходнім мудрацам, стрыжка, зробленая сёння, прынясе толькі няўдачу і пагаршэнне здароўя.

3 сакавіка. Неспрыяльны дзень для стрыжкі і іншых маніпуляцый з валасамі.

4 сакавіка. Падыходзячы час для наведвання цырульніка: стрыжка ўмацуе ахоўныя сілы арганізма і палепшыць здароўе.

5 сакавіка. Стрыжка ў гэты дзень можа прывесці да глабальных зменаў у жыцці: ад змены прычоскі да змены месца работы і месца жыхарства.

6 сакавіка. Выдатны дзень для стрыжкі: прычоска атрымаецца адметнай, будзе доўга трымацца і радаваць вас сваім выглядам.

7 сакавіка. Што б вы ні рабілі са сваімі валасамі сёння, усё будзе выглядаць выдатна: стрыжка, завіўка, афарбоўванне і ўкладка.

8 сакавіка. Нейтральны дзень, калі можна накіравацца да цырульніка, аднак стрыжка будзе проста добрай, а не выдатнай.

9 сакавіка. Валасы, пастрыжаныя ў гэты дзень, стануць больш густымі.

10 сакавіка. Падыходзячы дзень для лячэння і ўмацавання валасоў.

11 сакавіка. Можна зрабіць новую стрыжку: дзень садзейнічае ўдалым рашэнням і ваша прычоска будзе вышэй за ўсялякую пахвалу.

12 сакавіка. Прычоска, зробленая ў гэты дзень, прыцягне ўвагу навакольных і іх высокую ацэнку.

13 сакавіка. Будзьце асцярожнымі: стрыжка можа пагоршыць стан валасоў. Тое ж датычыць хімічнай завіўкі і афарбоўвання.

14 сакавіка. Лепш перанесці наведванне салону прыгажосці на іншы дзень. Сёння нельга ні стрыгчы валасы, ні фарбаваць іх.

15 сакавіка. Дрэнны дзень для стрыжкі, таксама няўдалым можа аказацца фарбаванне і хімічная завіўка.

16 сакавіка. Стрыжка зробіць валасы больш тонкімі, замарудзіць іх рост, затое форма будзе доўга трымацца.

17 сакавіка. Няўдалы дзень для стрыжкі, лепш перанесці візіт да цырульніка на іншы час.

18 сакавіка. Стрыжка і ўкладка будуць выглядаць недарэчна і хутка згубяць форму.

19 сакавіка. Стрыжка ў гэты дзень прыкметна палепшыць стан валасоў: яны будуць расці хутчэй і перастануць секчыся.

20 сакавіка. Валасы сёння выслоўі і здароўя: можна стрыгчы іх ці ўздзейнічаць хімічнымі рэчывамі (афарбоўванне, перманентная завіўка, складаная ўкладка).

21 сакавіка. Лепш за ўсё ў гэты дзень атрымліваюцца пышныя прычоскі і градуяваныя стрыжкі.

22 сакавіка. Любыя прычоскі, выкананыя сёння, будуць доўга трымаць форму.

23 сакавіка. Можна рабіць стрыжку ці фарбаваць валасы, а вось складаная ўкладка хутка згубіць форму і аб’ём.

24 сакавіка. Не трэба накіроўвацца ў цырульню — стрыжка будзе няўдалай.

25 сакавіка. Падрэзаўшы валасы ў гэты дзень, вы абвострыце інтуіцыю і зможаце больш правільна ацэньваць сітуацыю.

26 сакавіка. Пасля стрыжкі ў гэты дзень валасы пачынаюць расці хутчэй, становяцца больш густымі і тоўстымі.

27 сакавіка. Стрыжка і афарбоўванне валасоў можа прынесці непрыемнасці і праблемы на працы.

28 сакавіка. Найлепшы дзень для хімічнага ўздзеяння на валасы: рэкамендуецца зрабіць «хімію», афарбоўванне ці меліраванне.

29 сакавіка. Сёння стрыжка прынясе поспех і прыцягне ўдачу.

30 сакавіка. У гэты дзень удаецца абсалютна ўсё: неардынарныя стрыжкі, паветраныя ўкладкі і крэатыўнае афарбоўванне валасоў.

31 сакавіка. Са стрыжкай трэба быць больш асцярожнымі: нават найлепшы цырульнік можа дапусціць памылку ці стварыць не той вобраз, які вам патрэбны.

Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

❖ Оценка оборудования и транспортных средств
❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ 1 апреля 2010 г.

№ лота	Наименование объекта	Адрес объекта	Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Здание склада заполнительного	г. Хойники, переулок Мира, д. 1а	Площадь здания – 1166,9 м² Материал стен – ж/бетонные панели, кирпич. Площадь земельного участка – 0,2107 га	116 494 000	11 649 400
Продавец имущества: КПСУП «Полесьестрой»					
Срок подачи заявления			До 17.00 31 марта 2010 г. по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а		
Дата, время, место проведения аукциона			1 апреля 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» НПРУП «Жилкоммунтехника»		
Номер р/с для перечисления залога			Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509		
Условие продажи			Без условий. Цены указаны без НДС. Шаг аукционных торгов – 5 %		
Условие пользования			Объекты продаются в собственность		

Дополнительная информация по тел. (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ПАРИТЕТБАНК»!

26 марта 2010 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 111 в здании спортивного сооружения «Велодром» ГУ «МКСА «Минск-арена» (конференц-зал) состоится очередное Общее собрание акционеров банка.

Повестка дня

1. О процедурных вопросах проведения годового Общего собрания акционеров.
2. Об отчете о работе Правления ОАО «Паритетбанк» в 2009 году и задачах на 2010 год.
3. Об отчете о работе Ревизионной комиссии ОАО «Паритетбанк».
4. Об отчете Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк» о работе в 2009 году.
5. Об утверждении Изменений и дополнений № 2 в Положение о порядке использования прибыли ОАО «Паритетбанк» от 21.02.2008 № 01-03/935.
6. Об утверждении годового баланса, отчета о прибыли и убытках и порядка распределения прибыли за 2009 год.
7. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Паритетбанк».
8. Об утверждении Регламента работы ОАО «Паритетбанк» с реестром владельцев ценных бумаг.
9. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
10. Об избрании Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк».
11. Об избрании Ревизионной комиссии ОАО «Паритетбанк».

Регистрация участников будет осуществляться с 9.20 до 9.50.

При регистрации акционерам необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность; представителям акционеров – документ, удостоверяющий личность, и доверенность; руководителям юридических лиц (акционеров) – документ, подтверждающий полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

С материалами собрания участники могут ознакомиться по месту проведения собрания одновременно с прохождением регистрации.

Телефон для справок: 288 49 43.

УНП 100233809.

ОАО «СЛАВЯНСКИЙ СОЮЗ» ИЗВЕЩАЕТ

о проведении очередного общего собрания акционеров, которое состоится 31.03.2010 г. по адресу: г. Орша, ул. Замковая, д. 11, к. 1. Начало регистрации в 10.00, начало собрания в 11.00

Повестка дня:

1. Отчет дирекции об итогах деятельности Общества за 2009 г.
2. О годовом балансе и отчете о прибылях и убытках Общества за 2009 г.
3. О распределении чистой прибыли Общества за 2009 г.
4. Избрание совета директоров и ревизора Общества.

При себе необходимо иметь:

■ акционеру – документ, удостоверяющий личность;

■ представителю акционера – доверенность, оформленную в соответствии с законодательством.

С материалами повестки дня можно ознакомиться по адресу: г. Орша, ул. Замковая, 11 с 9.00 до 17.00.

УНП 300257402. **Совет директоров.**

Управляющий ООО «РОББИНС»

ОБЪЯВЛЯЕТ ТОРГИ по продаже сверлильной установки SHIBUYA TS.

Начальная цена — 772000 рублей. Торги проводятся в форме открытого аукциона **6 апреля 2010 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Илимская, 29—212. Для участия участники подают заявку и перечисляют на р/с ООО «РОББИНС» № 3012127140014 в ОАО БНБ-Банк, код 765, УНП 190937813 сумму задатка — 77000 рублей. Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену покупки. Заявки принимаются в течение 15 календарных дней с момента опубликования настоящего объявления по адресу: г. Минск, ул. Илимская, 29—212.

Подробные сведения по тел. 8 0296 71 71 73.

УНП 190937813

Занатоўкі мастака

ЛЕРА І ЦЮТЧАЎ

Загаварыў з Лераю пра паэзію. З натуршчыцаю вельмі добра паразмаўляць пра лірыку. Такія размовы настройваюць на творчы лад. Я сказаў, што перакладаю рускага паэта Мізгуліна, а ў Міці Мізгуліна любімы паэт — Фёдар Цютчаў. «Няўжо сягоння ў некага можа быць любімым паэтам Цютчаў? Неверагодна!» — «Чаму ты так дзівішся?» — «Ну праходзілі мы ў ліцэі Цютчава. Зрэшты, каго мы толькі не праходзілі ў школе і ліцэі... Мы ўсіх іх прайшлі! Мы прайшлі Цютчава! Прайшлі...» Для Леры ўсё дзевятнаццатае стагоддзе, як для мяне і Міці Мізгуліна васямнаццатае, якое і мы прайшлі... Няўжо прайшлі? Чаго дзівіцца... Але дзіўлюся і перакладаю чатырохрадкоўе:

Не дадзена нам адгадаць, *І спачуванне нам даецца,*
Як слова наша адгукнецца, — *Як дадзена раскашаваць...*

ВАЛЯНЦІНА І ЧЭХАЎ

Мая маці любіла чытаць Чэхава. Маці працавала ў бібліятэцы, дзе было безліч кніжак Антона Чэхава, якога выдавалі і перавыдавалі, якога ніхто ніколі не забараняў, бо мала хто бачыў, як грэбліва Чэхаў ставіўся да людзей з іх мізэрнымі справамі і спраўкамі. Чэхава чыталі, перачытвалі, экранізавалі і ставілі ў тэатрах. Чэхаў быў паўсюль. У нашай суседкі Валянціны было ажно дваццаць тамоў з прозай і лістамі доктара Чэхава. Мая мама любіла гэты цёмна-вішнёвы дваццацітомнік. Мы, я і мама, прыходзілі да суседзяў. Цётка Валя часцявала нас гарбатаю з вішнёвым варэннем, маці вяртала прачытаны том і брала наступны. Амаль год Чэхаў быў самым любімым літаратарам маёй маці. Мне падабалася хадзіць у госці да суседзяў на гарбату.

Вішнёвы дваццацітомнік Антона Чэхава я згадаў, калі ўбачыў вішнёвапарага бамжа, які, стоячы над кантэйнерам са смеццем, нешта жаваў. Бомж падмацоўваўся адкідамі з такім выглядам, нібыта ён п'е каву за барнай стойкаю ў шыкоўнай рэстарацыі. Які высокі бомж, заўважыў я. Зазвычай бамжы невысокія, а гэты — высачэзны. Былі моманты ў маім жыцці, калі мне не хапала сантыметраў пяць росту. Мне падавалася, што калі б у мяне рост быў не метар восемдзясят, а метар восемдзясят пяць, дык шмат якія бойкі проста і не пачаліся б. Мае супраціўнікі пабачылі б відавочную перавагу і адступіліся б. А так жа давялося... А каб мне ды такі рост... А ён, маючы выдатны рост, есць адкіды, выцягнутыя з кантэйнера. Чаго яму не хапае ў жыцці? Чаму нам усім нечага не хапае? Чаму маёй маме трэба было хадзіць да суседзяў і чытаць менавіта вішнёвы збор твораў Чэхава? Чаму Валя Матукоўская, маючы столькі дабротаў у гэтым жыцці, раптам вырашыла з яго сысці? Яна выпіла каньяку, яна выпіла сонных таблетак і не прачнулася. Чаму? Чаму мы не цэнім таго, што маем? Чаму мы такія падобныя да нікчэмных персанажаў, якіх доктар Чэхаў апісваў саркастычным пяром? Пэўна таму, што мы моцна любім салодкае.

ПЕТРАШЭЎСКІ І ПЛЯМКІ

Андрэй Петрашэўскі запрасіў мяне ў госці. Ён з гонарам паказаў сваю мэблю і свой посуд. Паказваючы посуд, ён пачаў распавядаць пра мыццё крышталь ных чарак... Іх трэба мыць раз на месяц, нават калі ты імі не карыстаешся, бо на донцах утвараюцца плямкі. Там збіраецца вільгаць, а на вільгаць асядае пыл. Чарка з плямкаю на донцы — рэч недапушчальная ў гаспадарцы... Я выслухаў Андрэйку, пахваліў ягоную адпаліраваную мэблю і цудоўна павымываныя чаркі. Потым мы выпілі гарэлкі і павячэралі. Больш Андрэй Петрашэўскі не запрашаў мяне ў госці, і я пра гэта зусім не шкадую.

АЛЕСЬ І ЛЮСТЭРКА Ў ШЫРОКАЙ РАМЕ

Ён ведаў, што ў лазенцы над чарупінаю вісіць люстэрка ў шырокай раме. Алесь зайшоў у лазенку, зачыніўся і абмацаў люстэрка. Ягонае ўяўленне намалявала яго — Алеся, які абмацвае люстэрка. Сляпы Алесь асцярожна абмацваў люстэрка з таемным спадзевам намацаць у ім свой адбітак.

ТАТА І БАЛЬНІЦА

Учора ішоў па вуліцы Акадэмічнай і разглядаў ледзяніста-белыя карпусы бальніцы. У адным з іх я некалі ляжаў. Схапіла жывот, ды так схапіла, што слёзы з вачэй пырснулі. Бацька выклікаў «хуткую», і мяне — пяцікласніка — завезлі ў халодную бальнічную палату. Тыдзень я прамёрз у бальніцы з падазрэннямі на апендыцыт. Боль мяне адпусціў яшчэ ў бальнічнай машыне, але дактары чакалі паўторны прыступ. Яго ўсё не было і не было. Я ляжаў на жалезным ложку і чытаў раман «Філасофскі камень» Сартакова. Чытаў нудныя старонкі пра сібірскіх чырвонаармейцаў і грамадзянскую вайну ў галоднай Расіі. Чытаў і спадзяваўся знайсці нешта разумнае пра таямнічы філасофскі камень. Наіўнасць школьніка праяляла мяне праз увесь тоўсты раман. З бальніцы я выйшаў з кнігаю ў руцэ. «Ты што, чытаў гэтую дрэнь?» — спытаўся здзіўлены бацька. Ён ніколі не дазваляў сабе чытання бяздарных кніжак. Тады я прамаўчаў. А цяпер? Цяпер, стоячы на вуліцы Акадэмічнай, я мог бы зноў прачытаць «Філасофскі камень», каб за гэта мне далі на адну хвілінку пабачыць тату. Я нават пагадзіўся б патрываць люты боль у жываце, каб на адно імгненне зноў на тату зірнуць. Толькі таты даўно няма сярод жывых, і мае развагі і ўспаміны нічога не мяняюць для іншых, але яны мяняюць свет, які бачу я. Карпусы бальніцы на вуліцы Акадэмічнай выглядаюць цяперака не такімі безнадзейна-белымі, як хвіліну назад.

Адам ГЛОБУС.

МАХЛЯРКІ АБКРАДАЮЦЬ СТАРЫХ

Да пенсіянераў з вёскі Чамяры-1 Камянецкага раёна зайшлі тры смуглявыя кабеты і прапанавалі купіць сякі-такі тавар. А калі «гандляркі» сышлі, пажылыя людзі выявілі прапажу — даволі вялікую суму грошай. У той жа дзень таксама тры жанчыны заходзілі да пенсіянераў у суседнюю вёску Чамяры-2. Старыя і не заўважылі, калі махляркі паспелі перавярнуць усю шафу, але, на шчасце, гаспадары ў шафе грошай не трымалі.

Яна СВЕТАВА.

ЗАГІНУЛІ МАЦІ І СЫН

Маці і сын загінулі пры пажары ў аднапакаёвай кватэры жылога дома ў Оршы. Пажар адбыўся вечарам на 7-м паверсе 9-павярховага дома. Суседзяў з верхніх паверхаў, 16 чалавек, пажарныя эвакуявалі.

Як паведаміла «Звяздзе» прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына Фандо, загінулі 66-гадовая гаспадыня кватэры і яе 46-гадовы сын. Магчымая прычына пажару — неасцярожнасць мужчыны пры курэнні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УКРАЛІ СВАЕ

Дырэктар ААТ заявіў у Бярозаўскае РАУС, што ўночы невядомыя выкралі з басейнаў у Белаазёрску 120 кг рыбы. Падчас вышуку аператыўнікі выйшлі на двух жыхароў Белаазёрска і жыхара в. Пяскі. Усе аказаліся рабочымі ААТ. У зладзеяў канфіскавана 725 тысяч рублёў, якія яны атрымалі ад рэалізацыі рыбы, хоць страты, нанесеныя прадпрыемству, дасягаюць 2 740 000 рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Крыштыдневы рэкламны выпуск № 4 (629)

аддзел рэкламы 287 17 79 Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❐ Дом з г/пабудовамі ў Мядзельскім раёне, побач Блакітныя азёры.
Тэл. 8 029 573 79 12.

❐ Дом у в. Фалькі Вілейскага раёна Мінскай вобл.
Тэл. 8 01595 38 771.

❐ Зямельны ўчастак у Баранавічах, ёсць усе камунікацыі.
Тэл. 8 029 726 50 32.

❐ Дом пад знос у в. Ракевічы Навагрудскага раёна.
Тэл. 8 0333 25 54 54.

❐ Гараж у г. Мінску, скрыжаванне вуліц Някрасава—Карастаянавай, цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 029 178 56 17.

❐ Дом, 200 кв. м, г. Крычаў.
Тэл. 8 029 606 08 78.

❐ Зруб 6х6 новы, вышыня 2,4 м, сасна паўбрус, у камплекце ўся кроквенная сістэма. Цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 029 550 39 28.

❐ Рабочая кабыла «савецкі цяжкавоз» — узрост 5 гадоў, жарабок — 8 месяцаў.
Тэл.: 8 (01795) 95 808, 8 029 962 30 35.

❐ Каляска інвалідная, г. Барысаў.
Тэл. 8 (01777) 45 923.

❐ Аудзі-80, 1983 г.в., 1,8 карбюратар, не патрабуе асаблівых укладанняў, $1300.
Тэл.: 8 02154 33 786, 8 029 810 27 93.

❐ Воз на гумавым хаду, новы, камплект зброі (Капыльскі раён).
Тэл. 8 029 774 87 49.

❐ Конныя сані (вазок).
Тэл. 8 01714 36 138.

❐ Ягняты тэксіль, прэкас.
Тэл.: 8 02155 57 131, 8 029 976 96 09.

❐ Канапа раскладная, б/к (Нясвіж).
Тэл. 8 01770 53 678.

❐ Эл. рухавік 11 кВт 1500 аб./хвіл., паліўная помпа УТН-5 да МТЗ-80, гідрапрывад Т-25.
Тэл. 8 01591 34 380.

❐ Парсючкі в'етнамскай віслапузай траваднай пароды (Віцебская вобл.).
Тэл. 8 029 249 39 01.

РОЗНАЕ

❐ Шукаю сяброў па перапісцы, якія цікавяцца хрысціянскімі каштоўнасцямі, хрысціянскім ладам сямейнага жыцця, гісторыяй Беларусі.
Пісаць: 210023, а/с 49, г. Віцебск.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 9 красавіка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрачайнікі, DVD-прайгравальнікі, тэлевізары, печ ЗВЧ і кухонны камбайн. Розыгрыш прызоў адбудзецца **13 красавіка 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 21 красавіка 2010 г.**

Дастаўку прызоў ажыццяўляе рэдакцыя. Атрымаць прыз можна самастойна ў рэдакцыі **па 30 чэрвеня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 30 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэрмін правядзення гульні — з 2.03.10 па 30.06.10.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1639 ад 26.02.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на II кв. або 1–е паўг. 2010 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____
(прозвішча, ініцыялы)

_____ _____
(паштовы індэкс) (адрас)
(горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧА

Перадсвяточны рэпартаж

ПАДАРЫЦЕ СВАІМ ЖАНЧЫНАМ КВЕТКІ

— Пад святлом такіх спецыяльных электралямпаў набіраюць прыгажосць гіяцынты, — знаёміць са сваімі гадаванцамі кветкавод Інга ЛАШЧ.

Што можа быць найлепшым падарункам для жанчыны на свята 8 Сакавіка?

Ну вядома ж, кветкі. «Падарыце сваім жанчынам кветкі, і яны аддзячаць вам з усёй шчырасцю свайго добрага жаночага сэрца», — заклікаюць у Мінскім камунальным унітарным прадпрыемстве «Кветкі сталіцы», у якім мы пабывалі напярэдадні гэтага свята.

На плошчы шэсць гектараў, у раёне ЦЭЦ-4, размясціліся цяпліцы прадпрыемства; тут кветкаводы выконвалі звычайную для сябе працу, у тым ліку рабілі чарговы так званы зрэз кветак, сартавалі гэтыя кветкі ў сваім складскім памяшканні. Разам з тым, безумоўна, ва ўсіх гэтых дзеяннях адчувалася асаблівая, перадсвяточная ўрачыстасць.

— Нашы кветкі лепшыя за гэткія хвалёныя галандскія, — расказвала кветкавод Інга Лашч. — Яны больш часу захоўваюцца, больш застаюцца свежымі. А паглядзіце на нашы маляўнічыя «плантацыі» — якія нашы кветкі прыгожыя, у іх усё багацце колераў... Усё, што ў нас цяпер квітнее, будзе прапанавана мінчанам і абавязкова будзе прададзена. Нашы кветкі проста нельга не заўважыць, нельга не купіць, да таго ж яны значна больш танныя за галандскія...

На прадпрыемстве вырошчваюць (дарэчы, па так званай галандскай тэхналогіі) розныя гатункі ружаў, а таксама цюльпаны, гіяцынты, пеларгоніі, фрэзіі і іншыя віды кветак. Да сёлетняга свята 8 Сакавіка ў гандаль Мінска будзе адпраўлена каля 160 тысяч розных кветак (ружы, цюльпаны і ліліі), якія пойдуць на афармленне букетаў, а яшчэ каля 15 тысяч кветак у гаршчочках. Вас запрашаюць кветкавыя крамы прадпрыемства, якія размешчаны ў Мінску па наступных адрасах:

вуліца Прытыцкага, 39 (непадалёк ад станцыі метро «Спартыўная»);

праспект Незалежнасці, 55;

праспект Машэрава, 25;

станцыя метро «Усход»;

вуліца Казлова, 14;

вуліца Чырвоная, 14;

вуліца Маскоўская, 20 (Дом быту);

вуліца Я. Коласа, 53.

А цяпер слова дырэктару прадпрыемства «Кветкі сталіцы» Сяргею Міргалоўскаму, які, у прыватнасці, вось што сказаў:

— Ад імя калектыву віншую ўсіх жанчын з надыходным святам, жадаю ім здароўя, любові, поспехаў, удачы, сямейнай трываласці. Каб яны заўсёды квітнелі і заўсёды былі гэткімі ж прыгожымі, як нашы ружы, каб нашы ружы прынеслі ім добры настрой.

І на заключэнне. Як сведчаць спецыялісты ў галіне кветкавага гандлю, самымі папулярнымі кветкамі ў мужчын, якія яны падносяць сваім жанчынам на 8 Сакавіка, з'яўляюцца цюльпаны і ружы. А як зазначаюць самі жанчыны, галоўнае нават не тое, што за кветкі гэта будуць, — галоўнае, каб яны менавіта былі, і былі паднесены з усёй шырынёй мужчынскай душы.

Галоўны агранom Зоя САДОЎСКАЯ (на здымку справа) і агранom Вольга АСМАЛОЎСКАЯ.

Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Кветкавод Таццяна ЛІСАВЕЦ паказала нам рэдкую кветку — стрэлецыю, падобную на галаву казачнага жорава.

Кветкаводы Ірына ТРУШ і Наталля ШЭМЕТ.

БЛАНДЗІНКА... У ПРАЛЬНЫМ ПАРАШКУ

Муз-news

Хто на што патраціў зароблены за навагоднія канцэрты грошы, а спявачка Улада ўклала ўсе зберажэнні і сілы ў стварэнне вобраза «Бландзінкі зімы». Менавіта так называецца новы — сёмы па ліку — кліп артысткі.

У працэсе здымак Уладу то пакрывалі з ног да галавы «снегам» (дзеля гэтага спатрэбілася больш як 10 кіло пральнага парашку і 2 вялізныя вентылятары), то засыпалі пялёсткамі ружаў. Ружам дзяўчына шчыра радавалася, а вось парашок выклікаў раздражненне і самыя сапраўдныя слёзы — аднак дзеля мастацтва давялося пацярпець. Над вобразам бліндзінкі-зімы працавала вядомая беларуская стыліст-візажыст Аксана Наско. «Ідэя мне спадабалася, а з вобразам бландзінкі-зімы — палкай, пяшчотнай, прыгожай і недаступнай — думаю, атрымалася справіцца на 100 працэнтаў. Бо гэта не роля, якую трэба было сыграць, а сапраўдная я», — без лішняй сціпласці адзначыла сама спявачка пасля здымак. Цяпер жа слова за гледачамі — з сярэдзіны лютага кліп трапіў у ратацыю беларускіх тэлеканалаў.

КУЛЬТУРНАЕ АСВЕТНІЦТВА АД «ЛЯПІСА ТРУБЯЦКОГА»

У сакавіку гурт «Ляпіс Трубяцкой» распачне сваю асветніцкую місію — дакладней, закамуфляваны пад такую гастрольны тур па Беларусі з праграмай «Культпрасвет». Акрамя ўласна 2-гадзіннага канцэрта, артысты абяцаюць таксама праводзіць літаратурныя чытанні і спалучыць забаўляльнае з карысным.

У Беларусі праграма будзе прадэманстравана ўжо ў добра абкатаным варыянце — да гэтага «Культпрасвет» пачула публіка ў Расіі, ва Украіне і ў Казахстане. «Гэта самая магутная і доўгая наша праграма, куды ўвайшлі песні з трох апошніх альбомаў, — расказвае пра будучыя гастролі Сяргей Міхалок. — Упершыню за гісторыю гурта мы іграем каля 30 песень — гэта паўнавартасны вялікі канцэрт». А да музыкі дабавіцца майстэрства дэкламацыі — на выступленнях «Ляпісаў» прагучаць вершы Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, а таксама Восіпа Мандэльштама, Аляксандра Блока, Уладзіміра Хлебнікава і... самога Сяргея Міхалка, які піша пад псеўданімам Юзіка Кілевіча. Таму асабліва актыўна музыканты запрашаюць на гэтыя канцэрты двоечнікаў, другагоднікаў і іншых непаспяваючых, каб абудзіць у іх цягу да ведаў. Распачнецца тур, як плануецца, 12 сакавіка выступленнем у Гомелі; далей у графіку Віцебск, Магілёў, Брэст, Гродна. Акрамя таго, 4 сакавіка гурт возьме ўдзел у чарговай «Рок-каранацыі», што адбудзецца сёлета ў адным са сталічных клубаў.

«EXPERTY.BY»: ШОК — ГЭТА ПА-НАШАМУ

Нядаўна ў Мінску адбылася другая па ліку штогадовая цырымонія ўручэння музычных узнагародаў «Experty.by». На ёй былі названыя лепшыя беларускія альбомы 2009 года па версіі як 4 пастаянных аўтараў аднайменнага партала, так і вядучых айчынных і замежных музычных крытыкаў, а таксама інтэрнэт-карыстальнікаў.

Штатныя і пазаштатныя эксперты сайта Experty.by цягам году праслухалі, разгледзелі і ацанілі — кожны па-свойму — 60 альбомаў, якія былі выдадзеныя летась беларускімі артыстамі розных жанраў. «Можа, было малавата альбомаў ад «старой гвардыі» беларускага рока, але ў цэлым год атрымаўся насычаным, асабліва ў сэнсе дэбютаў. Адразу некалькі дэбютных пласцінак увайшлі ў лік лепшых запісаў года», — адзначыў кіраўнік праекта Зміцер Безкаравайны. Яшчэ адной асаблівасцю года стала практычна адсутнасць фолк-запісаў — і, як вынік, знікненне аднайменнай намінацыі. Затое дабавіліся дзве новыя: «Лепшы беларускамоўны альбом» (трэба ўсё ж памятаць, у якой краіне жывём і якую асаблівую моўна-музычную сітуацыю маем) і «Прыз народных экспертаў» — наведнікаў сайта.

Прыз за лепшы поп-альбом быў прысуджаны гурту «Atlantica», які паабяцаў працягваць свае беларускамоўныя эксперыменты, за лепшы беларускамоўны альбом — ужо неіснуючаму магілёўскаму гурту «Глюкі» (у якога, зрэшты, ёсць спадчыннік «Акута»). Народныя эксперты адзначылі гурт «CherryVata», эксперты замежныя, у лік якіх уваходзіў, напрыклад, вядомы расійскі крытык Арцемій Троіцкі, лепшым альбомам назвалі інструментальны запіс «PortMone». А абсалютнымі лідарамі па колькасці сабраных узнагародаў сталі трое маладых хлапцоў з англамоўнага «The Toobes» — ім дасталіся прызы і за лепшы дэбют, і за лепшы рок-альбом, і за лепшы альбом увогуле. Праўда, тут арганізатараў чакала неспадзяванка — падчас цырымоніі, якая ішла на беларускай мове, высветлілася, што галоўныя дыпламанты беларускай... не разумеюць. Аднаму з крытыкаў давялося нават «перакладаць» іх думкі для прысутных. А што зробіш — такая яна ў нас, моўна-музычная сітуацыя...

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

НА БУДОЎЛІ ПАЦЯРПЕЎ РАБОЧЫ

На жаль, урачы бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, куды быў дастаўлены 22-гадовы рабочы, ужо нічым не змаглі дапамагчы пацярпеламу...

Паводле звестак старшага памочніка пракурора горада Мінска Сяргея Балашава, няшчасны выпадак здарыўся ў сталіцы каля 14.00 26 лютага на тэрыторыі будоўлі на праспекце Пушкіна. Металічная форма, якую падымаў будаўнічы кран, раптоўна пахіснулася. У выніку адбылося змяшчэнне грузу, які прыціснуў галаву пацярпелага да сценкі. Праверкай гэтага факта займаецца пракуратура Фрунзенскага раёна.

Ігар ГРЫШЫН.

КАРОЎ ДОЯЦЬ РОБАТЫ

На сёння ў вобласці дзве фермы абсталяваныя рабатызаванымі ўстаноўкамі і працуюць без удзелу даярак, паведамляе Камітэт па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага аблвыканкама. Яшчэ адна ферма на 100 кароў, дзе яны будуць даіцца робатамі, у найбліжэйшы час увойдзе ў строй у СВК «Прагрэс-Верцялішкі» Гродзенскага раёна.

Пераважная частка фермаў у Прынёманскім рэгіёне пабудаваныя 30—40 гадоў таму, большасць з іх фізічна і маральна састарэлыя. Больш за тое, каля 14 тысяч кароў сёння размешчаны ў аварыйных памяшканнях. Цяпер у вобласці 715 малочных фермаў (у сярэднім) на 240 кароў, якія размешчаны далёка ад цэнтральных сядзібаў гаспадарак. Гэты фактар, а таксама знос абсталявання, састарэлыя тэхналогіі прывялі да непрэстыжнасці працы на фермах і дэфіцыту работнікаў.

Па гэтай прычыне на Гродзеншчыне выбрана стратэгія будаўніцтва фермаў на 800—1000 кароў з даільнымі заламі і круглагадовым стойлавым утрыманнем, дзе ў чатыры-шэсць разоў узрастае прадукцыйнасць працы. Цяпер у вобласці працуюць 130 новых альбо рэканструяваных пад сучасныя тэхналогіі малочных фермаў. У найбліжэйшыя пяць гадоў, зазначае **в. а. старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван ЖУК**, плануецца штогод у кожным раёне ўводзіць па адной новай ферме. Гэта дазволіць да 2015 года павялічыць пагалоўе кароў на 20 тысяч, наблізіць вытворчасць да аграгарадкоў і зрабіць прэстыжнай прафесію работніка фермы.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (16 лютага). Па гарызанталі: Рэдзька. Морква. Бард. Барк. Лат. Сані. Рубка. Стол. Янка. Нут. Залік. Альпака. Вал. Бар. Граф. Куля. Бурак. Прынцып. Рэпа. Афера. Дака. Задор. Тарас. Грак. Ерэван. Кіпа. Метро. Дараванне. **Па вертыкалі:** Фрыстайл. Бэз. Кольт. Купа. Урад. Навала. Омметр. Апука. Якар. Амба. Таль. Грэк. «Арлі». Фетр. Від. Марка. Анапа. Тон. Паёк. Нар. Разбег. Ронда. Бульба. Цар. Афрыка. Мадагаскар. Пасланне.

Сканворд + лабірынт (17 лютага). Па гарызанталі: Люстра. Туман. Алжыр. Эфа. Одум. Трус. Ішак. Інія. Рана. Плуг. Яшчарка. Капа. Маяк. Азарт. Бітва. Торг. Аркан. Прапан. Старт. Пул. Абажур. **Па вертыкалі:** Поступ. Малпа. Атам. Сіг. Кроп. Сатрап. Аналогія. Гну. Яшма. Лямпа. Бас. Міра. Мірт. Марэ. Шаршатка. Франк. Явар. Нява. Каа. Кантралёр. **У лабірынце:** 1. Патэльня. 2. Люстэрка. 3. Фіранка. 4. Падкоўдранік. 5. Паліца. 6. Свярдзёлак. 7. Шклянка. 8. Куфэрак. 9. Скрынка. 10. Шрот. 11. рушляк. 12. Бляшанка. 13. Настольнік. 14. Начоўкі. 15. Цырата. 16. Кіт. 17. Прас.

Сканворд (23 лютага). Па гарызанталі: Берлін. Салдат. Грам. Карчак. Кулан. Ані. Чабор. Рунь. Разынка. Муж. Рында. Арча. Драп. Раб. Краска. Купала. Лак. Кіт. Сафіт. Пакос. Нос. Самба. Прылада. Мыш. Нача. Зрух. Дратва. Балгарыя. **Па вертыкалі:** Валгаград. Капаніца. Казка. Пракос. Лінь. Аліса. Люлька. Абат. Анчар. Брынза. Нагар. Шар. Чабан. Чуб. «Смага». Папаха. Карма. Сыр. Ярка. Іржа. Расліна. Ноч. Катод. Хатынь. Абак. Санкцыя.

Сканворд (27 лютага). Па гарызанталі: Фрыстайл. Язь. Занос. Сал. Осмій. Муар. Лато. Стан. Тычка. Чага. Абора. Абаза. Горн. Альянс. Пясняр. Кава. Іса. Удар. Паркет. Мутант. Час. Кап. Альт. Май. Акр. Варона. Алаў. Даяр. Бас. Аскепак. **Па вертыкалі:** Домрачава. Уфа. Агонь. Кут. Ягада. Раён. Ванкувер. Авёс. Спарта. Ата. Парада. Злоты. Колас. Сочы. Чорная. Ном. Аўра. Зло. Ісаак. Псі. Сайт. Пята. Ачаг. Рыа. Назоўнік. Гар. Ясень. Яга. Нерат. Тайнік.

ВНИМАНИЕ!
Срочно реализуем демонтированные части оконных заполнений (стеклопакеты алюминий + дуб) и дверные полотна.
контактные телефоны:
(017) 222-46-52,
(017) 222-46-49
ГУ РКПЦ УНП 190650172

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ПАДУМАЙ І РАШЫ

В. Таку



Белыя: Крh5, Ла3, п. g6 (3).
Чорныя: Крb5, Лf2, п. f3 (3).
Выйгрыш.

І. Маравец



Белыя: Крe6, п. f2, h2 (3).
Чорныя: Крh3, п. f3 (2).
Нічыя.

Чакаем вашых адказаў.

ПРАВЕРЦЕ АДКАЗЫ

Змяшчаем рашэнні задач, апублікаваных 17 лютага г.г.

В. Гебельт. 1. Kg3! — 2. Ke2x, 1... Л:g3 2. Фd4x, 1... Лe3 2. Лf5x, 1... Крg4 2. Kh5x, 1... Лf2 2. Ф:f2x

Л. Тамкоў. 1. d4! b5 2. Фg7+ (пагроза) Крg6 3. Фd7x, 2... Крe8 3. Cd7x, 1... Крf6 2. Фf8+ Крg6 3. Cf5x, 1... Крd6 2. Фd8+ Крc6 3. Фd7x

ПРАВІЛА СЯМІ

Гэты закон французскага майстра Шэрона заканчэнняў датычыць раз'яднаных пешак пры каралях. Прахадныя пешкі тым мацней, чым больш яны аддзелены адна ад другой. Такі закон Шэрона, калі дзве раз'яднаныя пешкі могуць прайсці ў ферзі без дапамогі караля, сума ліку клетак, якія раздзяляюць пешкі і лічбы раду (лічачы ад свайго лагера), на якім яны стаяць, роўная або больш сямі.

Прыводзім такі прыклад: белыя — Крf4, пп. a5, b4 (3); чорныя — Крb5, пп. d5, h5 (3). Адлегласць паміж чорнымі пешкамі 3, рад — 4. Таму чорныя выйграюць.

У заканчэнні партыі, згулянай паміж Штольцам: белыя — Крe1, Лd3, пп. a4, b5, g3 (5) і Німцовічам чорныя: Крe5, Лb2, пп. d4, f5, g4 (5). Ход белых. 1. Лd2? і белыя фарсіравана прайграюць: 1... Л:d2 2. Кр:d2 f4! 3. gf+ Крd6! Правіла «сямі» на баку чорных, бо іх пешкі прайшлі далей — 4. a5 g3 5. a6 Крc7 6. Крe2 d3+ 7. Кр:d3 g2 8. Крe4 g1Ф і белыя здаліся.

А калі нумар раду, у якім размешчана пешка, у суме з лікам вертыкаляў аддзеленых ад караля слабейшага боку не перавышаюць пяці, тады пазіцыя нічыйная, а калі перавышаюць, то пешка праходзіць у ферзі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.59	17.46	10.47
Віцебск —	6.48	17.36	10.48
Магілёў —	6.47	17.38	10.51
Гомель —	6.41	17.37	10.56
Гродна —	7.11	18.04	10.53
Брэст —	7.09	18.06	10.57

Месяц

Поўня 28 лютага.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Данілы, Ільі, Паўла, Самуіла.*
К. *Антаніны, Фелікса.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

2 сакавіка

1562 год — нарадзіўся Крыштаф Дарагастайскі, дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, кальвініст. Займаў пасады старасты ваўкавыскага, шарашэўскага, лепельскага. Удзельнічаў у Інфлянцкай (Лівонскай) вайне 1558—82 гадоў, у вайне Рэчы Паспалітай са Швецыяй (1600—1629). Аўтар кнігі «Гіпіка» — аднаго з першых у Еўропе дапаможнікаў па конегадоўлі (выдадзены ў 1603 годзе, пасля неаднаразова перавыдаваўся). У кнізе выкарыстаны звесткі старажытных вучоных — многа спасылак на Плінія, Арыстоцеля. У перакладзе самога Дарагастайскага дадзены ўрыўкі паэтычных твораў Вергілія, кніга ілюстравана гравюрамі Т. Макоўскага. У 1615 годзе ў маёнтку Ашмяна Мураванай (каля вёскі Мураванка, сёння Ашмянскі раён) на ўласныя сродкі заснаваў друкарню.

1869 год — рускі вучоны Дзмітрый Іванавіч Мендзялееў склаў табліцу вопытнай сістэмы элементаў, заснаванай на іх атамнай вазе і хімічным падабенстве. У 1871 годзе ён назваў яе перыядычнай.

Цытата дня:

«Чым больш маеш розуму, тым менш трэба грошай для шчасця».

Вадзім МАЗГАВОЙ.

Усміхнемся!

Пакупнік — прадаўцу:

— Раз вы ўжо ўзважылі разам з каўбасой палец, дык нарэжце мне і яго!...

☺

Сапраўдны студэнт — гэта не той, які задаецца пытаннем, які сёння экзамен, а той, які цікавіцца ў сяброў, што за экзамен ён сёння здаў.

☺

Мужык знайшоў на пляжы старадаўнюю цвілую бутэльку, адкаркоўвае — а там джын.

— Так, выратавальнік. Загадвай тры жаданні, — дастае нататнік. — Толькі не спяшайся, у мяне склероз, буду запісваць.

— Жадаю быць здаровым!

Джын піша:

1. Медыцынская страхоўка класа «эліт».

— Жадаю быць багатым!

Джын піша:

2. Адкрыць рахунак на сто мільёнаў еўра ў швейцарскім банку.

— Жадаю вялікага, сур'ёзнага, рамантычнага кахання на ўсё жыццё!

Джын піша:

3. Авіякатастрофа ў канцы мядовага месяца.

☺

З дзённіка: Зламаўся дрыль. Цяпер прыйдзецца на 8 Сакавіка купляць жонцы новы.

ДАГАНДЛЯВАЛІСЯ...

Гандляроў фальшывымі дыпломамі прыгаварылі да пазбаўлення волі

Адна з асуджаных — былая метадыст МІжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносінаў — на пару з былым студэнтам гэтай ВНУ, 29-гадовым жыхаром Жодзіна, займаліся падборам кліентаў. Яшчэ двое — былая метадыст Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта і выкладчыца фінансава-эканамічнага каледжа — арганізоўвалі выраб фіктыўных дыпломаў. Акрамя гэтага, злачынную група прапаноўвала паслугі па спрыяльным вырашэнні пытанняў аб здачы іспытаў і залікаў, пераводу студэнтаў з адной ВНУ ў іншую.

— Асуджаныя бралі ў пацярпелых грошы, быццам бы для перадачы іх службовым асобам ВНУ, — распавядае **старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна КАЛІНІНА**. — Насамрэч тут жа прысвойвалі іх сабе. У выніку тры жанчыны і адзін мужчына паспелі завалодаць грашыма сямі пацярпелых на суму каля 14 тысяч долараў ЗША і 100 еўра. «Бізнэсменам» прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінамі ад двух да трох гадоў. Грошы ж, якія яны атрымалі незаконным чынам, спагнаныя ў даход дзяржавы.

Надзея ДРЫЛА.

УКРАЎ ТРУБЫ

Побач з Ковельскай шашой пракладваюць газаправод. У ноч на 27 лютага з участка знікла амаль 50 метраў трубаў. Дырэктар ААТ звярнуўся ў Брэсцкі РАУС і злодзея знайшлі. Ім аказаўся 24-гадовы жыхар Брэста.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 1012. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12